Сіўко Франц

# Асіметрыя

KAMUNIKAT.org

2005

## БАЦЕЧКА ЗЭН

## АПОВЕД ІНСУРГЕНТА

Нібыта ўчора ўсё тое было, так выяўна бачыцца. Кляштар апусцелы на ўскрайку мястэчка, сцюжа ўначы – ногі ажно дранцвеюць пад пакуллем замест коўдры. Аднае ўцехі, што айцец Міхал упобачкі, сама дабрыня. Вось за клямку бярэцца, каб выпусціць мяне, вось адпускае яе, напужаны згукамі, што знадворку даносяцца.

– Стой, ці не пасы* зноў...

Гэтым разам, аднак, едуць не конна: да цокату капытоў прымешваецца тарахценне рэдаляў, дробнае, дрыготкае, перарывістае.

– Не, не яны. – Айцец Міхал пасоўваецца да вакна, шырэй адшморгвае фіранку. – Але пачакаем, пакуль праедуць.

Рэдалі з нябожчыкамі – каторыя за дзень – паволі набліжаюцца да кляштара. Мерцвякоў у амбулянсе, мяркуючы па нагах, што вытыркаюцца з-пад задняе пярэчыны, трое. Параўняўшыся з брамаю, вазніца, худы мужчына ў падзёртым жупанчыку, аддае лейцы маладзейшаму напарніку, што дагэтуль з абыякавым выглядам цягнуўся ззаду, ідзе да брамы.

Пухнатая, бы мядзведжая лапа, рука ў рудой іcподцы ўсоўваецца ў дзверы, страхавітаю кляшнёй застывае ў паветры.

– Для айца Міхала паперчына!

Айцец Міхал робіць крок да дзвярэй, бярэ падзіраўлены шылам (адзіны спосаб засцерагчыся ад халернае навалы) аркуш, вяртаецца да вакна, водзіць па цыдулцы вачмі. Мужчына за дзвярамі мармыча нешта няўцямнае, адыходзіць.

– Маршалак Мікуцкі дома, – кажа засяроджана, – так што можна выбірацца. Глядзі, асцярожна, казаччо ўсюды. Другі раз пападзешся – не ўцячэш ужо.

Ён кладзе ў торбу праснак і драбок солі, штурхае мяне да выхаду.

Дзверына натужліва рыпіць паржавелымі завесамі, два крокі – і я на волі. На дварэ ціха і бязлюдна, адно спустошаныя казакамі ды халерай камяніцы змрочна паблісваюць насустрач цьмяным святлом ацалелых шыбаў.

Да сядзібы Мікуцкіх вярсты дзве, ад сілы дзве з паловаю. Не так далёка, ды як абмінуць казацкую варту? Добра – удасца праслізнуць незаўважна. А калі не? Адзіная надзея тады – на рыззё. Дасць Бог, не заманецца ім спраўджваць асобу бадзяжкі.

Ногі пасля двухтыднёвага сядзення на адным месцы, у паўцёмнай келлі кляштара, – неслухмяныя, бы налітыя волавам. Не дадаюць шпаркасці хадзе і прэзентаваныя айцом Міхалам атопкі.

Усчынаецца вецер. І адначасова з ім з паўструхлелага мастка, што лучыць тутэйшую, жыдоўскую частку мястэчка з зарэчнай, з'язджае падвода. Стары жыд у дзіравым лапсердаку, штохвіліны тузаючы лейцы, выкіроўвае паперадзе мяне ў прысады, едзе да могілак. Раптам ён выпускае лейцы з далоняў, валіцца на дол, сутаргава выгнуўшыся раз і другі ўсім целам, нежывою грудай застывае збоч падводы.

І тае ж хвіліны трое казакаў пры шаблях вытыркаюцца з-за старадрэвінаў, прастуюць да яго. Пад'ехаць блізка, аднак, не асмельваюцца, перагікваючыся і памахваючы зброяй, колькі хвілін глядзяць зводдалеку на рэдалі.

– І там яшчэ вунь! – торкае ў мой бок адзін з тройцы.

Я ляжу нерухома, прынікнуўшы тварам да брукаванкі, стараюся як радзей дыхаць.

– Паехалі!

Цоканне капытоў слабее і нарэшце зусім аціхае.

Я падымаюся, атрасаю збольшага адзенне, хуценька, як толькі магу, перабягаю ў бярэзнік збоч брукаванкі.

І першае, пра што думаю, ачомаўшыся ад сполаху і разгубленасці, – як цяжка жывому ўдаваць мерцвяка.

На падворку Мікуцкіх гэтаксама пуста, як і ўсюды. З дзесятка некалі заўжды асветленых вокнаў зараз свецяцца толькі два – на доле, у куце ля ўвахода.

– Войтак? Адкуль? – Маршалак нерашуча топчацца пры парозе. Нарэшце, упэўніўшыся, што перад ім сапраўды не чужы, гукае ў цемру: – Ядзя, глядзі, хто прыйшоў!

Ядзя, маркотная, з запалымі вачніцамі і папяросінай у зубах, выходзіць на бацькаў голас, застывае воддаль.

– А, пан інсургент, – кажа прастуджаным голасам. – А што ў лахах? Цырк дый годзе.

– Сціхні ты! – асаджвае яе маршалак. – Самы час жартаваць! Надоўга да нас, Войтак?

– Да рання, уннанячкі… Калі дазволіце.

Маршалак колькі хвілін глядзіць спадылба то на мяне, то на Ядзю.

– Небяспечна, браце, – кажа застыглым, як нежывым, голасам. – Пасы скрозь, дакажа хто – гамон будзе нам усім, вісельня…

Страхавітая папярэчына на шастках выслізгвае з цемрадзі, пагражаючы пелькай, застывае ў падстоллі.

– Татусь, не пужай яго. – Ядзя бярэ мяне за руку, вядзе да стала. – Гэта сушарня для скур. Аканам забыўся зняць, во і вісіць. Зараз прынясу гарбаты.

Яна выходзіць і тут жа вяртаецца з кавалкам праснака і кубкам гарбаты.

– Прабач, беднавата. Усё, што засталося, пражылі, а тут неўраджай яшчэ… І эпідэмія гэтая, у краму боязна ісці. Пойдзеш і падхопіш няўрокам заразу.

Праснак каляны і шорсткі, ажно крышыцца між пальцаў. І яго так мала, што рука мая міжволі цягнецца да торбы са сваім.

– Не! – Маршалак перахоплівае пакунак, кладзе назад у торбу. – На дарогу хай застаецца. Вунь колькі ісці табе яшчэ…

Ядзя адчыняе шуфлядку стала, дастае акраец сушанага жытняга хлеба, кладзе перада мною.

Я ем, а яны, бацька і дачка, стоячы пры вакне, ціха перагаворваюцца. Я не чую слоў, але па паглядах, што то адзін, то другі раз-пораз кідаюць у мой бок, здагадваюся – гамоняць пра мяне.

Хлеб з'едзены, гарбата выпіта.

– Пасцялю табе ў калідоры, – кажа Ядзя. – Там канапка – адзінае, што засталося з мэблі пасля казакаў.

– Мне ўсё адно.

– Ну, добра… – На твары маршалка няпэўнасць і расчараванне.
– Я магу пайсці.
– Не. – Ён спыняе мяне, ветліва ўсміхаецца, зноў усаджвае на канапу. – Ты не зразумеў…
Лагодная ўсмешка на ягоным твары, аднак, у тым, што так яно і ёсць, як ён кажа, мяне не пераконвае. Яе я добра памятаю з тых часоў, калі ён, заражаны модным памкненнем далучыць мяне да больш годнага, чым наша сялянскае, жыцця, браў з сабой у горад! А потым, збянтэжаны якою-небудзь прылюднаю правінай неадукаванага вясковага дурня, хаваў за ёй няёмкасць і расчараванне.
Даўні гэты ўспамін канчаткова ўсё вырашае. Я кладуся на канапу, удаючы жаданне конча заснуць, нацягваю на голаў рэдзенькую, з тонкім пахам парфумы, коўдру. А як толькі гасне святло ў Ядзіным пакоі і першы прысвіст прытомленага трывогаю маршалка пачынае даносіцца з вітальні, падымаюся і ціха выслізгваю з дома.

Да вёскі яшчэ дзве вярсты, а сэрца маё ўжо гэтак такхае ад хвалявання, нібыта ступаю па панадворку.
Ісці нязручна: вецер дзьме ў твар, вочы слязяцца. Ільняныя нагавіцы понізу мокрыя, іх дотык да развярэджаных лытак аддаецца па скуры куслівым болем.
Ды не гэта найбольш мяне трывожыць.
Як то сустрэне бацечка? Адно хмыкне, як заўсёды, ды, не падаўшы рукі, знікне ў істопцы ці хляве? А можа, і бачыць не пажадае. У бацечкі нораў – самы ўпарты індык пазайдросціць, нездарма нават навакольныя фальваркоўцы яго пабойваюцца. «Бацечка Зэн, як скажаце». Зэн – скарочанае ад бацькавага імя, прыляпілася, так і валачэцца следам.
Як ён злаваўся, калі я падахвоціўся везці правіянт акружаным касінерам. А як, мабыць, заходзіўся абурэннем, убачыўшы па маім ад'ездзе апусцелыя бучы, нябеднае змесціва якіх мне даўмелася прыхапіць з сабою. Цікава, што ён адчуваў, калі мяне, няўдаліцу-перавозчыка, перахапіла пры ўездзе ў мястэчка мусовая жыдоўская дружына і перадала службістаму гміннаму старасту ды яго памагатым, а тыя, доўга не марудзячы, падвялі пад вязніцу. Не-не, не радаваўся – да гэтага, пэўна, не дайшло. Ды наўрад прамінуў, каб не панаракаць маці або Юльцы.
Юлька… Ці жывая яна? А калі жывая – ці не забылася?..
Вецер мяняецца, чхнуўшы ў і без таго закарэлы твар жменяю пылу і жухлага асотавага пухоўя, зноў б'е ў спіну.
Хвоя збоч каляіны, летась яшчэ, помніцца, бухматая, з буслянкай на вяршліне, а зараз нейкая скасабочаная, як нежывая, з панылым жалобным рыпеннем вымыкаецца мне насустрач. Адзін з сукоў, самы доўгі і тоўсты, ці не той якраз, на якім малымі ладзілі арэлі, зусім голы і нагадвае пярэчыну шыбеніцы, адыстар такую, як на пляцы пры вязніцы.
Склеп, у які мяне тады кінулі, выбіўшы перад тым два зубы, месціўся акурат побач з ёю. Уранні і прачынаўся ад яе стогнаў пад цяжарам чарговае ахвяры. І як ні стараўся засяродзіцца ў тыя хвіліны на чым іншым, як ні затыкаў вушы, так і не налаўчыся ўнікаць жудасных гукаў. Пэўна, і звар'яцеў бы, калі б не наляцелі неспадзявана касінеры ды не выбавілі з палону…
Чалавек прыпыняе каня, узіраецца паўз хмыз у незнаёмую постаць.

– Што тут робіш, хлопча? – пытаецца стомленым сіпатым голасам. – Хто будзеш?
– Вось, вандрую сабе, – не рызыкуючы сказаць праўду, адказваю і раблю крок да падводы.
– Не падыходзь, халерных вязу на могілкі. – Дзядзька ляскае пугай, паганяючы такога ж стомленага, як сам, канька, знікае за кустоўем.

Першаю выбягае з хаты маці.
– І не чакалі ўжо! Войтак, як жа так... – Яна абдымае мяне, затым хапае шасток з пукам конскага воласу, падымае над галавой. – З поўначы вецер, добра...
Бацечка выходзіць на нашы галасы, скоса зіркае на мяне.
– Явіўся, дзякаваць Богу. Што, няўежна ў чужых?
– Злыдух, як сына сустракаеш! – кажа роспачліва маці.
– А ты як хацела? – Бацька хмыкае, топчацца хвіліну побач. – Крапівы набраць к абеду... Дзе рэшата?
– На плоце. Маладзейшай бяры, а не такой іржавай, як учорака. І палыну яшчэ нарві – хату абкурыць...Чуеш, маладзейшай!
– Табе патрафіш! – Бацечка пляцецца па рэшата, а мы з маці ідзем у хату.
У кухні пад абразом гарыць свечка. Кволы агеньчык то мізарнее, то, падбадзёраны кропляю тлушчу, што сцякае да кнота, зноў успыхвае.
– Малілася, – быццам жадаючы апраўдаць гэткае марнатраўства, кажа маці і ідзе да печы.
Я тым часам уладкоўваюся на зэдлі ля вакна з надзеяй убачыць, нарэшце, Юльку. Чаму яна не выбегла? Вокны ж у вокны, можа, што здарылася?
– Сынок, не глядзі. – Маці ставіць на стол патэльню з яешняю, засланяючы сабою вакно, прысаджваецца побач. – Халера ў іх.
– Якая халера? – спанталычаны нечаканаю навіною, перапытваю, адчуваючы, як словы камяком засядаюць у роце.
Жудасныя падводы з мерцвякамі, што ўбачыў надоечы, усплываюць у памяці, муцяць свядомасць. Вось яны ўжо зусім блізка, так блізка, што я фізічна адчуваю іх, бачу іх колы, накрытыя дзяругамі целы. Праклятае трызненне!
Але то не трызненне. Дзядзька Язэп Кручонік, трымаючы на каленях лейцы і пагойдваючыся ў такт конскай хадзе, пазірае пустымі вачмі на вокны нашае хаты, праязджае міма.
– Унучку павёз, – уздыхае маці. – Заўчора матку пахаваў, учора брата, сягоння вось...
Дагаварыць яна не паспявае: у хату ўваходзіць бацечка з рэшатам крапівы і пукам палыну падпахай. Моўчкі ставіць на прыпек рэшата, сунецца ў запечак.
У хаце ўсталёўваецца гнятлівая цішыня.
– Сцяна ў Скасырскіх з таго боку, ад става, зусім гнілая, – першы парушае яе бацечка. – Ніжнія вянцы ледзьве ліпяць. Абрушацца, дык і хаце будзе гамон. Падперці б чым...
– Я пагляджу, што можна зрабіць, – кажу я, але мае словы выклікаюць у бацькі адно насмешлівае кхеканне.
– Сама цяпер пра гэта думаць! – успыхвае маці. – Хвароба ўсюды, а вам – сцяна. Адкуль вецер?

– З загумення, здаецца...
– Тады па ваду схаджу. – Маці падхоплівае вядро, ідзе на двор.
Мы з бацечкам колькі часу сядзім моўчкі. Я чую, як ён варушыцца ў запечку, але загаварыць не адважваюся.
– Ну, маршалка бачыў свайго? – пытаецца, нарэшце, ён.
– Бачыў.
– І што – не памог? Такія ж вы дружбакі, здаецца, былі: то ў горад, то яшчэ куды, усюды разам...
– У яго зараз свае клопаты.
– А, так заўжды. – Бацечка кашляе, выходзіць з запечка. – З імі так, з панамі... Як добра, то і падсобяць, а як блага, – сам давай сабе рады. Такая ў іх завядзёнка.
Тым часам вяртаецца маці.
Рабая курыца з вылінялымі ля хваста і крылляў пёрамі хуценька перасякае панадворак, выцягнуўшы шыю, рашуча сунецца да гародчыка Скасырскіх, дзе зелянее між градак з фасоляю лапік прыбітае да зямлі непрыбранае канаплі.
– Ці бачылі? – ахае маці! – Во, прынясе заразу... Ды што гэта? Хто яе выпусціў?
Скасырскіх кульгавенькая Маня, Юльчына цётка, выходзіць з хаты, злаўчыўшыся, пакуль курыца клюе канаплі, ускідвае на злодзейку дзяругу. Затым падхоплівае здабычу, зіркаючы раз-пораз на нашыя вокны, нясе ў хату. Курыца трапечацца пад накрыўкай, але вырвацца не можа – Маня моцна трымае няшчасную абедзвюма рукамі.
Дзявочы сілуэт мільгае па-за фіранкаю, і зноў усё супакойваецца.
– Мабыць, дзірка дзе ў загародцы, – пасля невялікае паўзы кажа бацечка.– А можа, звечара, калі запіралі, засталася на двары, во цяпер і выйшла...
– Я б не ўбачыла, каб засталася! – злуецца маці. – Пяць курыц усяго, дай рады!
– Ну, што зробіш. – Бацечка ўстае, уздыхае раз і другі, ідзе на двор.
І пакуль ён крочыць да парога, і потым, калі адчыняе, унурыўшы голаў у плечы, дзверы, мяне не пакідае адчуванне, што ўся гэтая панылась ды маркота па курыцы – не больш, як спектакль.
– Жалеззя кавалак, а не чалавек, – кажа маці, спахапіўшыся, таропка дадае: – Цяжка, канечне, Скасырскім, а каму цяпер лёгка? І хто нам паможа, як, крый Бог, укашацца хваробіна?

Маці шаркае нагамі па падлозе, уходжваецца ля печы. Ля стала бацечка засяроджана студзіць лыжкаю крапіву.
– Пракінуць бы чым, – кажа і падносіць лыжку да рота. – Хоць трохі.
– Збегла твая прокідзь, – адзываецца маці. – З'елі ўжо, пэўна, з пёрамі.
– Памрэ каторая, дык і пахаваць не будзе каму, – памаўчаўшы хвіліну, кажа бацечка. – Баб'ё адно ў хаце.
– Не квялі душу. – Маці запальвае ў вядры аброблены нечым смуродным палыновы пук, дакладае да яго пасвенчанай вербы, нясе на двор – абкурваць хату.
Я падхопліваюся з ложка, выходжу следам: а раптам удасца пабачыць Юльку?

Маці ходзіць з пукам палыну ў руцэ вакол хаты, несупынна молячыся, кадзіць дымам на сцены. Ля хаты Скасырскіх ціха, але ад сцежкі між хатай і клеццю даносяцца галасы. Аднак Юльчынага сярод іх не чуваць.

Я заходжу за вугал, спелячы кволую надзею ўбачыць, што там дзеецца, спыняюся ля плота.

Паўночная сцяна хаты суседзяў, сапраўды, як і казаў бацечка, ледзь-ледзь трымаецца на тонкіх падпорах. Ніжнія вянцы згнілі, і ўсё падваконне, ад падмурка да пятай бэлькі, зеўрае чорнаю дзіркай. Вакенца ў кухню пакасабочылася і нагадвае шчэлку.

Першае маё памкненне – бегчы падставіць што-небудзь. Але як на тое – нідзе не дашчэчкі, ні бэлькі, ні жардзіны.

На пожні збоч пуні бацечка (і калі паспеў выйсці з хаты) растрасае віламі з пярэплату зрудзелую, ажно чорную ад дажджоў канюшыну. Гэта дзіўна: неба хмарнае, вось-вось нахопіцца дождж – якая там сушка. Ды яшчэ на ноч гледзячы.

І што я тое бачу і разумею, яго, відаць, бянтэжыць. Ён раскідвае па краі пожні апошні пласт, падхоплівае пярэплаціну на плячо, моўчкі нясе да хлява. Я бяру другую, цягнучы нізам жэрдкі па зямлі, так што ззаду застаецца неглыбокая баразна, валаку следам.

– Дзякуй за помач, – кажа ён весела і шыбуе да хаты.

Усё гэта мне дзіўна. Бацечка наш – гаспадар і проста так, дзеля аднаго задавальнення, ніводную справу, тым больш пустую, рабіць не будзе.

Цямнее хутка, неяк раптоўна. Маці запальвае лямпу, садзіцца за цыраванне. Бацечкі няма: парадкуе на трасотніку дровы, адтуль даносяцца гукі сякеры.

У Скасырскіх, надзіва, – светла, доўгія цені, гайдаючыся, раз-пораз мільгацяць у вакне.

– Кліч бацьку, есці будзем. – Маці кідае недацыраваную шкарпэтку, ідзе да печы.

На двары ціха, як у яме, адно лісце дрэваў ледзь чутна перашэптваецца між сабою ў пасах святла, што няроўнымі пукамі падае на панадворак з вакна суседзяў.

На трасотніку пуста – ні бацечкі, ні ягонае сякеры.

Раптам тонкі, як піск мышы, гук пранізвае цішу, і незадаволены курыны хор агалошвае наваколле.

Бацечка сядзіць на кукішках ля дзвярэй загародкі, выставіўшы руку, падманьвае курэй да сябе. Затым увобміг хапае адну, выцягвае з загародкі.

Вочы нашы сустракаюцца, і хітраваты, збянтэжаны бацечкаў пагляд апякае мяне.

– Не кажы матцы, – чырванеючы, бы дзіця, кажа ён і вяртае курыцу ў загародку.

– Добра, – мармычу я і іду ў хату.

А як толькі ён уваходзіць у кухню неўзабаве пасля мяне, ускокваю з-за стала, саступаю лепшае – пры вакне – месца.

– Што гэта ты, Вайцех? – кажа ён сурова і падсоўвае да сябе місу з крапівой. – Нібы маршалка якога мяне ўшаноўваеш.

– Уставай, Войтак. – Маці падыходзіць да лежака, лагодна, як у дзяцінстве, кратае мяне за пяту. – Снег уначы выпаў.

Голас яе здаецца мне занадта сумным і нібыта адчужаным.

– Што здарылася?

– Нічога. – Яна паказвае на аб'інелае вакно. – Увосень – пагод восем. Працяры ісподкаю шыбіну, а то не відаць нічога.

Я бяру ісподку і, пакуль маці ладзіць сняданак, старанна, аж да анямення даланёў, тру забеленае імжой і марозам вакно і думаю пра тое, што маю сёння зрабіць.

Найперш, канечне, трэба конча даведацца, ці ўсё добра з Юлькай. Гэта не так складана, трэба толькі злавіць момант, калі вецер падзьме ад нашае хаты да іхняй. Другое – абгледзець сцяну, за ставам ляшчыніны даўгія і тоўстыя, нарэзаць з іх падпорак – на пяць хвілін працы.

Ля хаты суседзяў штосьці адбываецца, але што, – з вакна не бачна.

– Маня памерла, – апярэджвае маё пытанне маці. – Выйшла і гакнула, як падкошаная. Я на дварэ якраз была, бачыла. А потым... – Яна прынікае ілбом да печы, усхліпвае.

– Што?

– Бацька... Покі я была ў хляве, зайшоў да іх на панадворак... Выйшла я, глядзь: Маню валачэ ў хату. Там і застаўся, з імі...

– Дык вернецца.

– Не вернецца. Рыхтаваўся ён, каб застацца. Я ўчора яшчэ, калі сказаў, што пахаваць іх не будзе каму, падумала нядобрае. Курыцу выпусціў... Трэба было табе ў тую гаворку лезці пра сцяну...

– Даруй. Я не падумаў...

– Ай, не прымайся. І без цябе ён тое зрабіў бы.

– Я пайду. Можа, убачу яго. Пра Юльку папытаюся.

– Не марахонь жа доўга, – згаджаецца яна і з перасцярогай глядзіць мне ўслед.

Двор белы ад снегу. Ад нашага ганка да весніц Скасырскіх цягнецца рад няроўных, прыпарушаных беллю слядоў. Другі – туды і назад – вядзе да трасотніку.

Абедзьве пярэплаціны, прыкрываючы дзірку ў сцяне суседзяў, стаяць пры вакне, падпіраюць бэлькі верхніх вянцоў. Я падыходжу бліжэй да хаты і бачу бацечку. Ён стаіць, сагнуўшыся, ля самаробных палазкоў, прывязвае вяроўкаю да передка калматага і худога, як здань, Мікодама. Сабака круціцца на месцы, не разумеючы, што ад яго патрабуюць, няўцямна брэша. На палазках нерухома ляжыць Маня і глядзіць на снег незаплюшчанымі вачыма.

Ганка, Юльчына матка, і васьмігадовы брат Зыгмусь выходзяць з хаты, у скрушлівым маўчанні схіляюцца над нябожчыцай. Юлькі не бачна, але як толькі палазкі кранаюцца з месца, і яна выходзіць на панадворак, праводзіць працэсію тужлівым, поўным адчаю паглядам. Затым рэзка паварочваецца да мяне спінаю, прастуе назад у хату.

Я крычу, каб пачакала, кідаюся за ёй наўздагон, але нехта навальваецца ззаду, збівае мяне з ног, штурхае на снег.

– Куды ты!. – Матчыны рукі абвіваюцца вакол маёй шыі, прыціскаюць да зямлі. – Здурнеў!

З могілак яны вяртаюцца ўжо прыцемкам. З вакна ні бацечкі, ні цёткі Ганкі з Зыгмусем не відно, і каб не Мікодамаў брэх, мы, пэўна, так і правартавалі б іх з маці да рання.

Маці выходзіць на двор, і я чую, як яна, стоячы на ганку, гукае бацьку на панадворак. Затым бачу і яго. Ён выходзіць з хаты суседзяў, але далей весніц не ідзе, і толькі ўпэўніўшыся, што вецер не з ягонага боку, робіць крок-другі. Яны перагаворваюцца колькі хвілін, і маці вяртаецца. На твары яе – заклапочанасць і рашучасць. Яна рассцілае на падлозе старую хустку, кладзе на яе некалькі бульбін, гарнец рудое, з дамешкам мякіны, мукі, жменю панцаку, зноў ідзе на двор.

Убачыўшы яе, бацечка, які дагэтуль таптаўся ля весніц, знікае ў хаце Скасырскіх. А яна, трымаючы перад сабой хустку з жабрацкім правіянтам, хуценька перасякае двор, кладзе ўсё побач з тым месцам, дзе ён толькі што стаяў. Ледзь толькі яна адыходзіць, на двор выбягае Зыгмусь, хапае клунак, нясе дахаты.

– Каб жа Маняю і скончылася. – Маці запальвае свечку, цяжка ступаючы па няроўнай, у выбоіны, земляной падлозе, ідзе пад абраз маліцца. Я станаўлюся ўпобачкі, і мы, як двое сірот, што нечакана страцілі звыклую апору, адмаўляем па чарзе ружанец. І толькі апоўначы, калі гасне святло ў суседзяў і змаўкае растузаны нязвыклаю роляй цяглавіка Мікодам, куляемся на тапчан і засынаем трывожным, цяжкім сном.

Яшчэ вельмі рана, а маці ўжо на нагах. Я чую, як яна, штохвіліны ўздыхаючы, то перабірае ў істопцы посуд, то, цягнучы ногі, ходзіць з кута ў кут. Нарэшце, бярэ гарнец з рэштаю бульбы і яечным шкарлупіннем, ідзе на двор – карміць курэй.

На двары ветрана і мокра, церусіць дождж. У Скасырскіх, як і ўчора, адчуваецца нейкі рух. Бацечка з кавалкам аўчыны на плячах выходзіць з хаты, накіроўваецца да весніц.

Маці штосьці кажа яму, колькі хвілін яны ціха перагаворваюцца. Затым бацечка махае рукой, трымаючыся плота, сунецца гразкай вулкай у другі канец вёскі.

Маці ўваходзіць у хату, наўмысна абмінаючы мой запытальны позірк, моўчкі становіцца на калені.

– Ганка і Зыгмусь, – кажа, памаліўшыся, і з пакораю на твары дадае: – Мікодаму не сцягнуць дваіх па гразюцы, бацька па падводу пайшоў. Санітары дзяжураць ля ямы, можа, згодзяцца прыехаць.

Праз паўгадзіны бацечка вяртаецца. А яшчэ праз колькі часу да хаты пад’язджаюць рэдалі. Мужчына ў прадзёгценай вопратцы і гэткай жа масцы з дзіркамі для вачэй і бацечка выносяць целы на двор, кладуць на рэдалі. Вусцішны Юльчын енк вырываецца паўз расчыненыя насцеж дзверы, патанае ў пасах бясконцага, як сама бяда, дажджу.

Рэшта дня праходзіць у трывожнай варце. Мы з маці сядзім па чарзе ля вакна ў роспачлівым маўчанні, быццам баючыся напалохаць адно аднаго ці прыцягнуць неабачлівым словам нядобрае, чакаем хоць якой весткі ад суседзяў.

Бацечка два разы падыходзіць да вакна, паказвае жэстам, што нічога благога за гэты час не здарылася. Ужо надвячоркам, калі ён выходзіць з хаты па правіянт, я выскокваю на двор, прашу паклікаць Юльку.

– Не, – адказвае ён рашуча і зачыняе за сабою дзверы.

К ночы надвор'е зноў мяняецца. А пад раніцу двор, як і суткі таму, робіцца белым ад снегу.

– Як марозік, дык, можа, і абыдзецца. – Маці садзіцца побач са мною ля вакна, і пагляд яе весялее. – Хвароба чыстага баіцца.

– Авохці, дзень на дварэ! – Маці ўскоквае з тапчана, хуценька ідзе да вакна. – Не заўважылі, як паснулі, і во калі прачнуліся. – Голас яе слабее, пачынае дрыжэць. – Глянь, сляды…

Ад веснiц Скасырскіх, і праўда, цягнуцца дзве каляіны ад палазкоў з сабачымі слядамі пасярэдзіне і радам чалавечых крыху наўзбоч. Сабачых слядоў – два рады , туды ды назад, чалавечых – адзін.

Ні палазкоў, ні сабакі на дварэ не бачна. Не бачна нікога і ў хаце, адно кволы дымок па-над страхою сведчыць пра прысутнасць там чалавека.

Колькі хвілін мы маўчым, да рэзі ў вачах узіраемся ў вакно насупраць у надзеі што-небудзь убачыць. Але ўсё дарэмна. І мы, змучаныя невядомасцю, выходзім на двор.

На грукат дзвярэй Мікодам адзываецца кароткім гучным брэхам, і зноў усё заціхае.

«Бацечка, ці Юлька?»– круціцца ў мяне і галаве. Маці маўчыць, але я бачу, што і яна думае тое самае.

Юлька, ці бацечка?

Нарэшце маці не вытрымлівае, атульвае вусны далонямі, роспачліва крычыць:

– Ба-ацечка! Зэ-энусь!

– Ю-улька! – падхопліваю я.

Здушаны, бы хто сціснуў яму ляпу, брэх Мікодама адзываецца нам, але чалавека па-ранейшаму не чутно.

– Пайду да ямы, папытаюся ў санітараў, – кажа маці. – А ты чакай.

Яна вяртаецца ў хату па кажух, апрануўшы яго на хаду, шыбуе па слядах у накірунку могілак.

Я стаю на месцы, пакуль яна не знікае з вачэй, раблю крок наперад.

Думак ужо няма, адно жаданне – развязаць гэты жорсткі, як сцюжа, што да касцей прадзірае на скразняку, вузел. Зрэшты, сцюжы я таксама ўжо не адчуваю. Рукі, шыя, твар амярцвелі, у галаве туман. Усё наўкола змізарнела, зменшылася да памеру дзвюх пар слядоў і фіранкі, што няроўнаю анучаю звісае ў вакне па той бок панадворка.

Фіранка ціха калышацца, выдаючы прысутнасць чалавека, зноў застывае ў цьмяным, скаваным сцюжаю міжваконні. І я раблю апошні крок.

Мікодам кідаецца мне насустрач, але нягучны патрабавальны голас спыняе яго…

* * *

Здаецца, учора ўсё тое было, а во – сёмы дзесятак ужо мне. Час ляціць – азірнуцца не паспяваеш. Як састарэеш, адно і застаецца – чакаць яе, кіпцюрыстую.

Мая надта ж смерці баіцца. Як запытаюся «Дзе, Юлечка, хавацца будзем?», дык спахмурнее і дзень цэлы не адзываецца. А потым і адпусціццца спакваля : «Ля бацькоў, дзе яшчэ? Не да Мікуцкіх жа ў склеп прасіцца».

Бацечку і Юльчыных усіх тады, ў 31-м, у агульнай яме закапалі. Людзі мёрлі, бы мухі, во і клалі разам, каб зараза не пладзілася. Па эпідэміі ўжо лекары прыязджалі, засыпалі вапнай яміну. А потым, як калатнеча касінерская скончылася, курган усёю вёскай насыпалі на тым месцы, крыж паставілі.

Як я тады ў хату ўвайшоў да Скасырскіх, і не помню толкам. Адно, што засталося ў памяці, – як Юлька Мікодама за ашыйнік схапіла ды на двор апромеццю выскачыла. Паўдня шукалі з маткаю па наваколлі, з цёмным ужо ля свірна у саломе знайшлі. Маці нечым Юльку абліла, абкурыла, дык і абышлося, не зачапіла халера.

Добра, што тады так сталася. У маладосці ж як бывае? Выпусціш вартае з рук з надзеяй, што вернецца яно, а яно не вяртаецца, хоць плач, хоць крычы. І застаешся ні з чым на ўсё жыццё. А мы разам во з Юляй век звекавалі, дзяцей паднялі – чым не радасць?

Скора ўжо, скора мне збірацца... Як то бацечка Зэн спаткае? Тады, перад адыходам ягоным, і не пагаманілі як след. Дык, можа, зараз нагамонімся. Калі ў гуморы, канечне, будзе, хе-хе...

Жыццё пражывеш, а для для родных адным нечым застанешся ў памяці. Хто Хціўцам выясніцца ва ўспамінах, хто Хлусам, хто яшчэ кім... Найлепш – калі Братам, ці Сынам праўдзівымі, ці, як мае во – Маці і Бацечкам.

Гэтак для сыноў сваіх хацелася б застацца. Але ўжо як атрымаецца. Адзін, старэйшы, з казакамі, другі, наадварот, да паўстанцаў у Начу падаўся. Цяпер, як разбілі іх казакі, дзесьці ў лесе хаваецца. Хоць бы жывы застаўся. Разам гадаваліся, разам мужэлі, а як не аднаго бацькі дзеці. А сэрца і за аднаго, і за другога баліць. Во і дай рады. Ды што: жыццё ёсць жыццё, і яму не запярэчыш.

* **пасы – казакі**

## КРУЧОНІКІ І СЫН МОЙ

## АПОВЕД «ЗЯЗЮЛІ»

*…праз многія нэндзы дадзена нам увайсці*
*ў валадарства Божае.*
***Дзеі, 14, 21***

*Удзень яшчэ можна трываць, а ноч ледзь прыпусціцца – і абрынваецца навалачу збродна-няздумнае. Што хвіліна тады, што гадзіна – адна трасца. Бывае, да рання пракачаешся і не заснеш, хоць ты голкаю павекі сшывай. На золаку прахопішся ніякая і сноўдаеш зданню, каб думка якая ў галаве, каб жаданне. Вечара прычакаеш, і зноў тое самае: што было, што ёсць, што магло б быць. Варыяцыі-асацыяцыі, паўсон-паўява, адно і тое – кружэлка заезджаная.*

*Быццам гледзіны: я, Сын пры мне, немаўля, – плоць-няўдаліца. У зале белай – ці то трон на ўзвышэнні, ці то Галгофа, ад пустэльні, дзе вецер асцюкамі сцюжы шпурляецца, адгароджаная. Кручонікаў тройца ўпобачкі: руды, светлы, чорны звабны. А хто які насамрэч і каторы за сужэнца з траіх застанецца – няведама нічагуткі, і слота, і зімнеча ногі студзіць.*

*Трызненне гэткае – бязмоўнаму на спажыву. З языкатым размова – як у мячык гульня: адбіў і вось зноў спружынься трымаць удар. Бязмоўны ж, бы папера тая, усё – брыдкае то ці горняе – стрывае. Як фаліянт во гэты.… Кульнешся, стомлены, пагартаеш і пад бок несумысля, прыснуўшы… Добра, зачэпіць, дык вернешся назаўтра, агораеш сяк-так. Любошчы, ловы шчасця, пакуты – што ні абыходзіць людству…*

*Міла, сястра, шмат чытае. Кандыдатка. «Як чырвонага нап'юся, дык з Мілюсяй памілюся…». Палюблюся… Па…*

*Недалікатна, фуй!*

*І зімна ж але.*

*Дык вось пра іх, што меліся…*

*Першы мой, руды Кручонік, не чытаў амаль. Затое пісаў спраўна. Зранку падымецца і да кампутара. Пасядзіць-пасядзіць у одуме, пашчоўкае мышкай – і ў кухню, каву піць. Бляшанкі на тры дні ледзь хапала. Пап'е і зноў за манітор, і гуляе з тою мышкай, і патыліцу чухае… Потым у ложак, спіць гадзіны дзве. Злы – не зачапі. На пяты дзень па шлюбе за новае засеў і паўгода амаль крэмзаў. Да таго самага дня ў гатэлі…*

*Дзень той зімовы..*

*На перапіс з адною, падзарабіць каб, падрадзіўся ехаць. У мяне вольныя суткі былі, пацягнулася з імі. Вецер ірваў такі – сцены дрыжма ў гатэльчыку, у грубцы бы чарцей плойма скавыча. Дроў бярэма прынёс, кінуў на падлогу, дык і не чутно было, як падалі, за тым скавытаннем. Гатэль – хата вясковая, дарма што ў цэнтры гарпасёлка, абслугі два чалавекі, абодва п'яныя. Запаліў ён у грубцы, сядзім, грэемся. Жывата яшчэ не бачна ў мяне, але вось нібыта варухнулася, чую, жывое пад грудзьмі. Ён падлятае: «Ну, што, чуваць?» – «Чуваць.» – «Добра, – кажа і дастае з валізы мяшэчак, а ў ім –*

*колькі манет залатых. – Вось, са спадкаў бабуліных, знарок трымаў да гэтага дня». І сыпель мне на далонь тыя манеты. Толькі зноў іх ссыпала ў мяшэчак ды пад падушку прыхаваць паспела, як напарніца заяўляецца. Так і так, маўляў, рудому кажа, час працаваць, сорак падворкаў абысці, а сёмай аўтобус дахаты, дык паспець… Сабраўся ён, пайшлі перапісваць местачкоўцаў. Я – у ложак, спінаю да сцяны, ляжу сабе. Не заўважыла, як заснула. Не ведаю, колькі спала, гадзіну, можа, ці болей. Прачнулася ад стуку на ганку. Глядзь у вакно: яны, любы руды мой з напарніцай, шыбуюць. Прыкінулася, быццам сплю, ляжу, чакаю. Ён уваходзіць: «Спіш?» Круць-верць ды зноў у сені. І ціха стала, быццам віхром здзьмула абаіх. Я ў сені следам: нікога, толькі гукі нейкія з падпола, бы па дзераве хто шкрабецца, ледзь-ледзь чутныя. Падымаю вечка, а яны ўпокат на нейкай скрыні, і сцёгны-дупы голыя, і дзе чыя, не ўцяміш без свечкі.*

*Як выбегла з гатэля, як да прыпынку дамчалася паўз сумёты – нічога не памятаю. Дахаты прыехала, матка (яна за гаспадыню ў кватэры заставалася) ледзьве прытомнасць не страціла ад упуду, як убачыла. Праз дзве гадзіны і ён з'яўляецца. «Што ты надумалася?» – «А каб нагі тваёй больш тут не было, вось што!» – «Як гэта?» – «Так, як сказала». І майно ў калідор ягонае разам з манетамі…*

*Пайшоў, а мяне скруха такая апанавала – хоць у палонку. Куды ні пайду, куды ні кінуся, усё яны на скрыні той, друзам зацярушанай, трызняцца. Ці сплю, ці раблю што, – яны ў вачах. Адквяліла душу, слёз, бачных і нябачных, каб у адно сабраць, на добры ручай, пэўна, хапіла б. Якіх толькі караў на іхнія галовы не наклікала, якому гадаўю-звяр'ю ў помслівых мроях на расправу не аддавала. Праз тыя злосць ды помслівасць, можа, і ва ўлонні мне гэтак зрабілася. Але гэта зараз разумею, тады ж… Лёгка быць мудрым пасля, а паспрабуй утаймаваць сябе, калі кіпіць у грудзях.*

*Дайшла, адным словам. А як не стала моцы трываць, да Містрыні Добрай Рады, што за дзвюма рэкамі, балацінаю дрыготкай жыве, пра якую ад людзей была начутая, быццам такім, як я, ахвотна памагае, па параду вырашыла злётаць. Вось прылятаю. Хаціна на ўзмежку між ворывам і аблогай – глянуць няма на што, яміна пасярод панадворка, гаспадыня пры ёй – баба-нясклёпа мурзатая. Гэта мне паможа, думаю, мне, сучаснай ды з матрыкулам (акурат у інстытуце давучвалася) у кішэні?*

*Гаманілі доўга. Калі можна тое назваць гаманой. Я апавядала, яна ж слухала адно. І толькі ўжо як сонца скацілася за аблогу і змрок раскашаваць прыпусціўся, страпянулася ўрэшце, загаварыла: «Ох-це, хорт яго… Дурасць наша бабская: захочаш папомсціцца, а сабе толькі горш зробіш. Я сваім у маладосці, як даведалася, што здрадзіў з адною, паўструка адчахала. І што? Такі падструмэндзілі лекары (падшылі ці ўставілі там нешта) – яшчэ больш стаў блудзіць. У наваколлі спадніцы той, каб не задзёр, не засталося. А я ляжу, бывала, адна ў ложку, слязьмі ад самоты заліваюся. Маладая ж, хочацца. А мужыкі баяцца: раптам тое, што свайму, зраблю? Дык во і мяркуй. Не, злосць і помслівасць – кепскія дарадцы. І не заўважыш, як самой вантробы падточаць. Лепш ужо як ёсць усё пакінуць. Руды твой – тхло, мажджэр чарвівы. То ці варта праз такога сабе і таму, хто ў табе, кроў псаваць? Пакінь яго распусніцы, хай цешацца. Цяжка, канешне. А каму лёгка? Нам, жанчынам, заўжды непярэлійкі. Вунь з тройчы па чатырнаццаць каленаў колькі годных было кабецін – а названых на пальцах палічыш. Затое*

*апошняй імя як свеціць! Можа, і табе тое самае наканавана. Вяртайся дахаты, а як час прыспее вызваляцца ад плода, прылятай зноў, можа, чым-колечы дапамагу».*

*Сказала гэтак і знікла, як растала ў тумане. Я сюды-туды, клічу – не адзываецца. А ўжо ноч на дварэ і сцюдзёна. Пасунулася я ў хаціну, ногі прыкрыла нейкім рыззём ды і заснула. А ўранку, ледзь сонца вымкнулася з-за ворыва, паднялася і дахаты хутчэй – пяўз дзве ракі, балаціну дрыготкую – памчалася.*

*Як жа далей было, дай Бог памяці... Хімеры ўваччу, галава, бы стаўбун, пустая з бяссоння. Гэты вецер яшчэ – і сячэ, і сячэ па нагах. Ліха яго, прышчык разрасцецца...*

*Ага.*

*Чатыры месяцы мінулі, прыйшоў час мне раджаць. Жывот бы цеста ў дзяжы разроссяся, вось-вось вылузнецца з абалоння, твар пабіўся плямамі. Хаджу, словы Містрыні Добрай Рады, што тым разам мне сказала, згадваю. Сабралася ды пад ранне, пакуль раса не выпетрылася, выправілася ў дарогу. Дзве ракі, балаціну адолела і з першым сонцам да ўзмежжка таго між полем жытнёвым на месцы ворыва (лета было) ды аблогаю дапала.*

*Містрыня пры хляве са статкам уходжвалася. Ледзь гамонку пачалі, на парожку пасеўшы, як схваткі ў мяне пачаліся. Знянацку заспелі, спрыхаду хлява, побач з катухом, мусіла легчы. Так было кепска, што каб не гаспадыня, ці дала б рады разрадзіцца. Крык немаўляці пачула і страціла прытомнасць, бы абухам хто па галаве выцяў... Ачнулася з дзіцем на грудзях. Авечкі наўкруга стаяць, дзівяцца. Містрыня Добрай Рады ўпобачкі, хлопчыка майго за руку трымае. А пяўз кроквы ды салому – дай веры! – зорка ў святле сонечным кулогаецца.*

*«Вось, – кажа Містрыня, – Сынок табе. Ім на годнасць жаноцкую будзеш хрышчаная па дванаццатым ягоным годзе, і стане табе апораю замест Кручонікаў-адрачэнцаў».*

*Тут заснула я і колькі спала, – не ведаю. А калі прачнулася, зноў яе, Містрыню Добрай Рады, убачыла. Дзверы рыпнулі, мужчына з белымі валасамі ўвайшоў у хлеў. На авечак пугаю цыгнуў, дзверы шырэй расчыніў – дух быдлячы выпусціць. Спужалася я, дзіця да грудзей прытуліла, ляжу. Глянуў ён на мяне і кажа: «Не бойся. Не анёлак я, але і не злодзей. Так сабе чалавек, няпэўны». І распавёў сваю гісторыю:*

*«У краі ізумрудна-зялёным, дзе неба з зямлёй цалуюцца, бацькі, статкары патомныя, на свет мяне пусцілі. На семнаццатым годзе ўлетку, калі горы цвілі, з жанчынаю адной, з тых, што водамі ды паветрам раямі злятаюцца да нас ацаляцца, спазнаўся. У інстытуце рабіла, абяцала на вучобу ўладкаваць.Сабраўся ехаць з ёю. Бацька ў рожкі: куды? мала дома спраў, што за свет трэба мчацца? Не паслухаў яго, паехаў. Вось прыязджаем. Мужык яе сустракае. «Гэта сяброўкі маёй сынок, – кажа яму. – Да сваякоў прыехаў, а нічога тут не ведае, дык памагу знайсці». Саджае мяне ў аўто, едзем. У хаце, куды прыйшлі, – ажно цёмна ад гасцей, пагулянка вайсю шуміць. Селі і мы за стол, п’ем-ядзім. Тут падымаецца яна і ідзе ў другі пакой, гаспадыня за ёй. Праз хвіліну вяртаецца гаспадыня – і да мяне: «Алан, вас дама чакае!» Уваходжу я ў пакой, а яна голая на палігоне... прабачце, – на ложку, падзывае мяне... Не скажу, што дрэнна было, але ж няёмка ад людзей*

*па першасці. Ад сораму , да стала вярнуўшыся, як не згарэў. Так перажываў, што ажно пабялеў нават праз тое, валасы, як снег, зрабіліся, а чорны ж быў…*

*Праз дзень зноў туды сама мяне павезла, і зноў усё паўтарылася. Яшчэ потым, і яшчэ. Месяц, лічы, пакуль рыхтаваўся да іспытаў, гэтак чакаліся-аланіліся. Рэпетытараў мне на ўласныя грошы наняла, падкормлівала. Ды не даўся інстытут, заваліў я іспыты. Што рабіць? Дадому вяртацца – бацька пасля такога – у нас строга з гэтым – непаслушэнства, ды збялелага яшчэ, ці прыме? Вось, у Містрыні Добрай Рады, дзякуй ёй за ласку, атабарыўся за дазорцу пры яміне ды авечках».*

*Распавёў мне тое і пайшоў жарабка запрагаць.*

*«А гэта сужэнец табе, – Містрыня прамовіла, як выходзіў. – Дасць Бог, бацькам Сынку стане».*

*Запярэчыць хацела: як жа, маўляў, першы раз бачу чалавека, ды змоўчала, пашкадавала заўчасна ссівелага.*

*І павёз ён мяне дахаты – краем неба паўз дзве ракі, балаціну дрыготкую.*

*І вось дома я, цешуся дзіцем. Кручонік белы пры нас, завіхаецца. Працавіты, гляджу, чалавек, дбайны і не скупы да таго ж. Недаробкі, што ў кватэры па рудым засталіся, дарабіў, бурштыніну, срэбрам аздобленую, у дарунак мне паднёс. Не хацела браць, але настояў, узяла.*

*Вось другі дзень гэтак мінае, трэці. Ды заўважаю раптам: касавурыцца Алан на майго Сынка. «Што?» – пытаюся. – «А ты на ногі глянь», – адказвае. Зірнула я на ножкі немаўляці і здранцвела: бы кавёлка правая і без ямак абедзве унізу ступакоў.*

*Лекара паклікалі, абгледзеў ён малога. А як сказаў прысуд – дзіцячы паляруш, – рукі-ногі ў мяне самой адняліся. Два дні пластам ляжала ад тае навіны-неспадзянкі.*

*Ды не выпадала ляжаць. Узяла Сына і па іншых лекарах пайшла. І срозь кепскае адно чула, ніводзін з эскулапаў не даў надзеі. Аднэндзілася, як у магілу з роспачы не сышла.*

*Тут раптоўна бацькі белага Кручоніка паўміралі, пачаў ён мяне да пераезду ў край свой ізумрудна-зялёны, гняздо радзіннае, схіляць. Міла яго падтрымала: маўляў, паветра там чысцейшае, садавіна-гародніна, глядзіш, і Паўлік – так Сына назвала – акрыяе на паўднёвых дабротах. Падумала я, памеркавала і згадзілася ехаць.*

*Два месяцы ў закутку між небам і зямлёй як дзень праляцелі. Горы, сінеча, спакой… Бараны тлустыя, як цяляты ў нас, паўсюль ходзяць без нагляду, людзі, хоць і чорныя, – спагадлівыя, зычлівыя. Ды скончылася добрае, бойка вялікая ўсчалася ў горным краі: гвалт, кроў, вэрхал… Трэба ўцякаць! Пахапалі, што маглі, з статкарскага майна, беламу Кручоніку дарагога, паляцелі. Ратаваў Бог, выбраліся неяк, без адзінае драпіны ўсе трое дахаты вярнуліся.*

*Колькі часу мінула, падрос Паўлік – і новая бяда: маўчыць мой Сынок, гуку не мовіць. Зноў я па лекарах – і зноў сабе на расчараванне. Кручонік пахмуры ходзіць, вусны крывіць. Тое яму не так, гэта не гэтак. І вось аднаго разу сабраў апранахі і, бачу, адыходзіць збіраецца. «Куды ты?» – «А абы-куды. Прыкра на калечку глядзець. Такой пашукаю, што і здаровага мне яшчэ сына нарадзіць. Вярні дарунак».*

*Аддала яму бурштыніну, і пайшоў.*

*Не бегла наўздагон, не прасіла літасці. Але ж цяжка было – не выказаць. Жанчыне адной застацца ў гэткую хвіліну ды з гэткім дзіцем – што мажа быць горай? Мала таго, што зачарвіўленай пачуваешся праз прыродаю дадзеную пакуту, дык яшчэ людзі памогуць тое адчуванне ўзмацніць. Міжволі сама сабе збрыдзіш. Цела свайго, выгляду, голаса пачнеш стыдацца, у тарахумару[1] вайкаватую ператворышся. «За што?» – пыталася тысячу разоў і не знаходзіла адказу. Але адшукала ў сабе сілы перетрываць нягоду, ачуняла пакрысе, ацалілася ад нуды-роспачы. З Сынам сэрцам гаварыць навучылася і праз тое шчасце ад блізкасці крэўнага зведала. І словам дабраслівым «мама», вачмі, а не вуснамі вымайленым, да прычасця на годнасць жаноцкую (спадзяюся, што так) – не, не дайшла – наблізілася.*

*Нялёгка, канечне, далося. Боль, крыўду, непамысноту – усё можна перэтрываць. Найгоршае ж – калі, адолены імі, шатанскаму змыслу няўрокам паддасіся. Чатыры гады споўнілася Паўліку, як на запаленне захварэў. І без таго кволы, а тут трасца гэткая: учарнеў увесь, дыхае ледзь-ледзь. Лекара трэба клікаць, а мяне нібыта за руку хто трымае: навошта? Маўляў, сканае, дык і сам пакутаваць не будзе, і твая пакута скончыцца. Паўсутак гэтак мучылася ў няпэўнасці. Да стала сябе вяроўчынаю прывязвала, твар кіпцямі да крыві, каб старонняга стыдацца, раздзірала, ключ ад кватэры ў вакно выкідвала – нішто не памагло, перасіліла шатана мацярынскае. Тут сон яшчэ ў руку: Містрыня Добрай Рады сасніласся. Быццам прыляцела да яе, а яна пры яміне, дзе белы адрачэнец за дазорцу калісь стаяў, туман разганяе. Падвяла мяне да прадоння. Глядзь я, а там косці светлякамі пайсюль, і енкі-стогны дзяцінныя, і варушыцца ўсё. «Вось, мільёны там, – кажа, – і маё ёсць. Не сказала табе раней, а зараз будзеш ведаць. Як здрадзіў мне мой, пазбавілася ад дзіцяці і праз тое пакуту – туман адганяць, бель нявінную дзеля навукі іншым ад цвілі тартарскай ратуючы, – прыняла. Кожны сам сабе чыніць, дык глядзі». Сказала так і паляцела над ямінай. Прачнулася я – і да тэлефона хутчэй. Выклікала лекара, і праз тыдзень і следу не засталося ад Сынавай хваробіны. А мне шнар на сэрцы дагэтуль пякоткаю, як згадаю пра тую спакусу шатанскую і слабасць сваю, у грудзях адзываецца.*

*Дзесяць год прамінула. Клопатамі занятая, не заўважыла іх, бытта не было. І агледзелася аднойчы наўкола сябе і ўбачыла, як свет праз тыя клопаты – гатаванне, пялюшкі, падай колькі разоў на дзень калеку, а пасля аднясі-прыбяры (усё ж пад сябе) – неймаверна звузіўся. Агледзелася і жахнулася: рэзкая, няўклюдная, апранутая абы-як, – ці я гэта? І надумалася тады памяняць сёе-тое ў жыцці. Маці да сябе, прыглядаць за Паўлікам, узяла, строяў нашыла, на працу ў лякарню-інтэрнат (прыдалася адукацыя) для такіх, як Сын, уладкавалася. І, веры дай, нанова быццам нарадзілася, адчула сябе чалавекам. А як звольнілася дырэктарка і на замену ёй, хоць і не надта, папраўдзе, тым трызніла, прызначылі, наогул усё змянілася. Столькі ўсяго – будоўля, гаспадарка, побыт – звалілася на голаў, што пра сваё думаць не засталося часу. Без малога восемдзесят хворых – ці ж жартачкі? І што ні чалавек, то гісторыя. Аднаго пры нараджэнні пакрыўдзіла прырода, сяго-таго недадаўшы, другому праз злосць людскую сталася, трэці сам для сябе парупіўся… І ўсё жывыя істоты, кожны есці-піці хоча, кожны ўвагі ды*

*клопату патрабуе. І добра, як ціхмяны яшчэ, а то , бывае, і не сунешся без доўбні. А з абслугаю колькі мітрэнгі, пакуль прасееш, здатных рабіць за жабрацкі дзяржаўны заробак адбіраючы. Во і высільвайся дырэктарка, дарма што жанчына...*

*З мужчынамі, праўда, няшмат, але мела стасункі: як жа без гэтага. Бы вершнікі па полі, прамчаліся перад вачмі, ніводзін за жывое не зачапіў. Тыдзень-два – і бывай-выбачай, разляцеліся. З адным толькі амаль паўгода сустракалася. Намітрэнжылася – да скону хопіць успаміну. Бывала, хвіліна такая... інтымная, а ён пра каханак былых апавядаць пачынае. Маўляў, узбуджае яго гэта... Потым да мяне з роспытамі, што і як было да яго. Не тое каб апрыкраў (мужчынка выглёдны быў), а надакучыў неймаверна. Развіталіся... Другі засынаць, ледзь справу скончыўшы, меў звычку. Засне, а ты круцішся побач усю ноч...Трэці асцярожлівасцю да шаленства даводзіў. Па тры разы на тыдні час спатканняў, каб не трапіць на вочы каму са знаёмых, мяняў. То на аўторак, бывала, прызначыць, то на чацвер, то – праз паўгадзіны – «у раёне серады» (улюбёны выраз ягоны быў) ужо засвярбіць сустрэцца... Пра іншых і згадваць не выпадае. Што казаць?! Бывае, выскачыш дзе на прыпынку з тралейбуса, азірнешся: гэтулькі нас, кабет, наўкола, і ўсе не раўнуючы каралеўны, што з твару, што з паставы, што са строю. І мужыкі ўпобачкі – няголеныя, чорныя, бы тыя мурыны, з тэчкамі нейкімі, скруткамі за плячыма...*

*Што ж далей?*

*Да Бога тады пахінулася. Праз сястру адну, манашку, яна і не ведае пра тое, сталася маё навяртанне, мой дэўтаракатахуменат*[2] *. Дзень той летні ў кляштары з гідам увішным як зараз памятаю. Спёка паўсюль, задуха, і яна перад кратамі, чыстая, ясная, рыхтык сцябліна зялёная пасярод запыленага ходніка, пра побыт у сваім кармелі, да жорсткасці аскецкім, апавядае. Пра брак дабротаў звыклых, пра немажлівасць і з самым блізкім чалавекам у астатнюю яго зямную хвіліну пабачыцца – усё тое, што самахоць, а не волю нечую выконваючы, абрала сабе за жыццёвую сцяжыну. «Вось яно», – я тады падумала... і пахінулася. Аднавіла, што змалку ведала, у памяці з катахізмаў, тройчы пешкі да цудадзейнага абраза звандравала, да месца аб'яўленняў у белай, выпаленай сонцам Фаціме нават дапала. Спатоліла душу, хоць, папраўдзе, што ўжо фарысейнічаць, цела дарэшты не ўтаймавала. Вечнае вечным, а і тут хочацца пажыць. Нэндзаю спавітаму рай нябесны, хоць і адмысловы самы, – слабое суцяшэнне.*

*Цела нашае...*

*Кручонікаў абаіх, рудога ды белага, з тае пары, як адышлі, па адным разе толькі бачыла. Рудога – нежывога ўжо, у трупярні, падчас апазнання. Змогшыся жыць з пісання, падаўся ў заробкі ў мора, там нешта сталася, вылавілі нератам у чужынскіх водах пачварамі аб'едзенага, з жорнамі на шыі. Ледзьве прымусіла сябе зірнуць. Белага жывога заспела ў лякарні. Другі язык, фальшывы, вырас небараку ў роце, неўзабаве і задыхнуўся, не даўшы рады двума распараджацца. Увайшла ў палату, глядзь – а ён чорны, валасы – бы зерне струхлелае ў коласе па залеве. Як такое можа стацца? Пазнаў мяне, ратунку прасіў. Бурштыніну, срэбрам аздобленую, тую самую, што адабраў некалі, дастаў з-пад падушкі, у руку мне памкнуўся сунуць, але не ўзяла я. А праз дзень памёр. Шкада чалавека, ды так яно ў жыцці : развітаемся з цяперашнім з надзеяй на вяртанне да яго ў прышласці, а яно і не думае*

*вяртацца.І, вымкнуўшыся на новыя прасцягі, адно і маем шчасця – узгадваць яго ды шкадаваць, што гэтак неабачліва пазбыліся.*

*Зафіласофнічалася я, аднак, здаецца…*

*Па дванаццатым годзе Сынавым новая бяда на мяне абрынулася: маці цяжка занемагла, прыступ сардэчны зваліў. Сястра на той час была ў ад’ездзе, дык мусіла я, каб не кідаць працу, узяць Сына часова да сябе ў лякарню. Так «зязюляю» зрабілася неспадзеўна. Тады і чорнага, трэцяга свайго Кручоніка, спаткала.*

*У раздзявальні, у чарзе па вопратку пасля аднае нарады сутыкнуліся. Я паперадзе яго стаяла, ён у патыліцу дыхаў. Апрануцца памог, прашпацыраваць запрасіў. Абыходлівы, бачу, і валоссе з носа ды вушэй не тырчыць – згадзілася. Шпацыр у кватэры ягонай скончыўся. У калідоры людзі нейкія, мабыць, суседзі, сварыліся, вецер гуляў панадваконню, а мы гаманілі, гаманілі. Першы раз было гэтак добра з мужчынам. Пасля зноў гаманілі, дадому праводзіў уранку. Тры месяцы сустракаліся, і вось – прапанаваў пабрацца.*

*Тут маці акрэйбала, стала на ногі. Вальней мне цяпер, добра ўсё нібыта. А сумней – застаўся. Паўліку дванаццаць з паловаю – што рабіць з хлопцам? Як ні добра ў лякарні, а не дома. Пры матцы жывой. Жанчыне сваё, хоць і свету нялюбае, цяжка адпрэчыць – такая наша прырода. Нібыта часцінкі сябе самой нестае. Бывае, увайду да Сына ў пакой, і так захочацца вярнуць яго дахаты – хоць крычма крычы.*

*Словы Містрыні Добрай Рады, апошнім разам моўленыя, згадваюцца. Пра які хрост яна казала? Злётаць запытацца?*

*Вось што заўважыла: як шчаслівы – свет увесь у табе. А ледзь здрадзіць шацунак, і мяняецца ўсё, быццам збоку глядзіш на сябе, іншых вачыма. Вось легла, вось устала, вось пайшла… І дзе ява тая, дзе мроя, – не даўмецца.*

*Ногі ж стынуць але, зімна…*

Зімна было і ў ногі, і ў спіну, і ўсё цела пацепвалася ад холаду. Зноў ці не забылася зачыніць звечара фортку, падумала яна і вызваліла з-пад бока амярцвелую – усю ноч на мулкай вокладцы – руку. Фортка была зачыненая. Значыць, балкон. Уставала апоўначы папаліць ды, растузаная одумам, забылася зачыніць дзверыну. Добра, зашклёны балкон, а то б зусім скалела. Колькі там? Без чвэрці шэсць. Падымацца…

– Эля-а! – Маці ўціснулася ў пакой, топчучыся на адным месцы, стала наўзбоч вакна. Пук святла прабег па сцяне, пагуляў з гардзінай, аляпістаю плямай застыў на столі. – Шэсць.

– Яшчэ без дзесяці, мама…

– Не вялікая розніца. – Маці дацягнулася рукамі да ходзікаў, націснула на кнопку звона. – Міла тэлефанавала ўчора, дрэнна сябе адчувае. Ты б наведала яе.

– Сёння наведаю, – сказала яна і адхінула коўдру. – Прышчык выскачыў на ілбе… Зірні, ці бачны.

Маці з выглядам спрактыкаванага фізіянаміста ўтаропілася ў яе твар.

– Нічога не бачу. Дзе ?

– Вось тут..

– Не, няма. Можа, крыху… чырвона нібыта…

– Значыць, прайшоў, – сказала яна і зноў дакранулася далонню да ілба.

Навобмацак прышчык не толькі не паменшаў, а наадварот, здалося ёй, пашырэў, зрабіўся больш каляны. Яна падхапілася з ложка, хіснулася ў ванны пакой, не зважаючы на холад у нагах, зірнула на сябе ў люстэрка.

Прышчыка, сапраўды, як сказала маці, амаль не было бачна. Яна прыкрыла надброўе, дзе ён ледзь-ледзь чырванеўся, пасмаю валасоў, узялася чысціць зубы. Забеленая пастаю вада павіравала вакол адтуліны, з глухім булькатам абрынулася ў трубу.

– Эля-а! Есці!

– Іду-у!

– Каву табе ці гарбату?

– Каву.

Маці наліла ў кубак каву, дастала з лядоўні талерку з канапкамі.

– Жанчына ёсць жанчына, – сказала і шматзначна – знаёмая шторанная катрынка – усміхнулася.

– Мама!

– Ды я не пра прышчык, супакойся. Міла... Замуж бы ёй. А то – моцная, здаецца, а ледзь што, і раскісае адразу. Што жанчына адна? Нішто. Вось і ты...

– Што я ?

– Што! Сама ведаеш... Знайшоўся добры чалавек, дык і трымайся яго. А то як мокрае гарыць у вас... Век не будзеш маладая. Запрасі свайго Яўгена, я вячэру прышыкую. Во сёння хаця б...

– Сёння не магу. Вельмі цяжкі дзень: гуманітарка, абход, можа, пахаванне яшчэ... А мала што яшчэ прыключыцца за дзень. Нараду якую ў аддзеле прыдумаюць... – Яна паднялася з-за стала, пайшла ў калідор апранацца. – Усё, адыходжу. Калі хто патэлефануе, пераадрасуй на мабільнік. Вярнуся позна.

– Дык тады...

– Што, мама?

– Нічога. Можа... – прышчэмленая дзверыною рэшта мацерынай фразы патанула ў грукаце ліфта, кабіна зрушылася з месца, парыпваючы тросам, пасунулася долу.

На дварэ было суха, марозна. Сярдзіты сіверны вецер, дарэмна намагаючыся пасвавоціць з прыбітым нядаўняю аблівахай снегам абапал пляцоўкі, гойсаў па двары, з настойлівым віскатам грукаўся ў аб'імжэлыя сцены дамоў. Кіроўца Антон збіваў ботам з колаў аўтобуса ўчарашнюю наледзь. Борзда ўскочыў у кабіну, завёў матор. Аўтобус чхнуў, паволі, як нехаця, папоўз паўз гурбы ссунутых на ўзбочыну зрудзелых – снег напалову з гразёй – глыжоў да паста ДАІ і праз чвэрць гадзіны выруліў да лякарні.

Антон вылез з кабіны, падаў ёй руку. Тае ж хвіліны фортка на другім паверсе рыпнула, звяглівы жаночы голас працяў настылае паветра:

– Віталеўна, зараза, здрастуйце!

– Во я зараз табе як дам заразу, Шура! – робячы страшную міну, замахнўся ключом на вакно Антон. – Пасадзіць цябе ў ізалятар, гэткую віп-персону...

Шура ўсхліпнула, пакрыўджаная грубасцю вадзіцеля, а яшчэ больш напалоханая перспектывай апынуцца ў ненавісным ізалятары, зачыніла фортку.

– Занадта вы добрая з ёю. – Антон склаў у кулак прыкрытыя да паловы даўгаватымі рукавамі плямістага вайсковага ватніка далоні, гучна свіснуў. На свіст выбег Казімір, блытаючыся ў полах абшмулянага, з пазамінулагодняе яшчэ гуманітаркі, паліто, схапіў два матрацы, што ляжалі спрыхаду аўтобуса, павалок да дзвярэй.

– Супер, Віталеўна! – сказаў і задаволена пасміхнуўся шчарбатым, са зрудзелаю фіксаю пасярэдзіне, ротам. – Міністры на такіх ці спяць.

– Пэўна ж не, – падтакнула яна, патрымаўшы, пакуль Казімір уціснецца з ношкаю ў калідор, цяжкія жалезныя дзверы, пакрочыла да свайго кабінета.

У пакоі было цёпла і ўтульна. Мэбля, старая, але яшчэ прыстойная і – дзякуй прыбіральшчыцам! – заўсёды чыстая, вымкнулася з сутоння насустрач святлу, застыла ў паслужліва-пачцівым маўчанні. Яна зняла паліто, згадаўшы наўсцям, што так ані разу і не наважылася за ўсю зіму апрануць на працу новае футра, павесіла ў шафу. Затым разгарнула нататнік.

Першае, што трэба было зрабіць, што яна рабіла вось ужо другі год, з таго часу, як згадзілася на дырэктарства, – абысці пакоі. Іх дванаццаць, і калі на кожны ахвяраваць па пяць хвілін, змарнуецца гадзіна. Затым – міні-нарада з персаналам паводле вынікаў праверкі санстанцыі. Пасля... Толькі запланаванага напярэдадні хопіць на паўдня. Калі не спахопяцца, што мала турбуюць, у аддзеле і не паблытаюць усе планы якой-небудзь чарговай сходкай.

Дзінькнуў тэлефон, памаўчаў хвіліну і зайшоўся працяглым, патрабавальным звонам. Напэўна, Жэня, падумала яна, зняла слухаўку.

Званілі з трупярні. Мужчына, начальнік ці то ягоны намеснік, – пачатак фразы з'ела піпіканне – малінавым голасам паведаміў, што сваякі памерлай заўчора Антаніны не аб'явіліся і ўжо наўрад аб'явяцца, таму... Канца фразы яна таксама не чула, бо зноў перашкодзілі нейкія старонныя гукі, але і так усё зразумела. Сваякі адмаўляюцца ад нябожчыка – звычайная гісторыя, такія здараюцца штомесяц. І шукаць тых сваякоў – што голку ў стозе. А адшукаеш – сабе лішняя непрыемнасць з-за ўмоваў, якімі абстаўяць пахаванне замест элементарнай падзякі за ўсе клопаты.

Яна паклікала Андрэевіча, гаспадарніка, загадала ехаць з Антонам па труну і крыж, затым – з гатоваю труною – у трупярню па нябожчыцу. Хацела папрасіць, каб купілі яшчэ вянок, але ўспомніла, што дзесьці засталіся ад навагодніх святаў два рулоны каляровае паперы, вырашыла абысціся самаробным.

Ледзь аўтобусік параўняўся з буданом на выездзе з тэрыторыі, як прыйшла доктарка.

– Шура цяжарная, – сказала з парога і вінавата, быццам сама была прычынаю той цяжарнасці, змоўкла.

– Даўно?

– Чацвёрты месяц.

– Ад каго?

– Не прызнаецца. Можа, ад Фандо, можа, ад Гарушкі, хто іх разбярэ. Адно дакладна: не ад Любачкі.

– Ад якой Любачкі? Што вы кажаце!

– Што на мінулым тыдні паступіў. Хлопец, Любачка, памятаеце?

– А-а... Але ж прозвішча – Любачка. Я думала, гэта мянушка.

– Гэта што! І дзіўнейшыя бываюць… Што будзем рабіць, Віталеўна, з Шурай?
– Трымаць, пакуль можна, што яшчэ. Адною прыкрасцю больш, адною менш… Будзем разам трымаць адказ за недагляд. Дзе Казімір?
– У сталоўцы, плача. Хацеў ехаць з Андрэевічам і Антонам, а яны не ўзялі яго…
– Скажыце, хай падвострыць рыдлёўкі і ідзе з хлопцамі капаць магілу.
– Добра, скажу.
Доктарка пайшла. Не паспелі сціхнуць у калідоры яе крокі, як азваўся мабільнік. Тэлефанавала Міла.
– Трэція суткі ляжу пластам, і каб хто наведаў. Усе думаюць толькі пра сябе. Я прасіла маму табе перадаць – яна што, нічога не сказала? Хоць памірай…
Усхліп. Уздых. Маўчанне.
– Прыйду сёння. Не ведаю дакладна, калі, у нас пахаванне… Але прыйду абавязкова, як толькі вызвалюся.
– Ну, дзякуй.
Казімір з Гарушкам і Фандо, усё ў аднолькавых, іржавага колеру, ватніках, прайшлі паўз вакно, пакіравалі да могілак. «Добра, даўмелася свае адчыніць, а то ці даў бы рады вазіць хаваць на гарадскія», – падумала яна і ўключыла электрагарбатнік. Але дачакацца, пакуль вада закіпіць, не паспела: зноў нехта пастукаўся ў дзверы. Жанчына-швачка, што прыходзіла тры дні таму з заявай на ўладкаванне ў лякарню дзіцяці-цэрэбральніка, увайшла ў кабінет, пазіраючы на яе з-пад калматай лісяй шапкі, застыла ў дзвярах.
– Мы канчаткова вырашылі аддаць… Мы з мужам…
– Дзе дзіця?
– У машыне. – Жанчына падышла да вакна, махнула рукой. Мужчына кінуў пад ногі недакурак, панёс ухутанае ў коўдру дзіця да дзвярэй.
– Можна, я не пайду з вамі? – адступіўшы ў глыб калідора, спытала жанчына. – Я не магу…
– Дык заставайцеся тут.
Мужчына ўнёс дзіця ў калідор, паслухмяна пасунуўся следам за ёю на другі паверх.
– Сюды. Дакументы пры вас?
– У жонкі. – Ён паклаў коўдру з дзіцем на прадэзінфікаваны звечара ложак памерлай Антаніны, быццам баючыся, што яна раптам перадумае, хуценька выйшаў з пакоя.
Дзіця дрыгнула ножкай, павярнулася на спіну і тут жа, стомленае, відаць, дарогаю, соладка заснула.

Калі яны з мужчынам сышлі на дол, жанчына стаяла на тым самым месцы, папраўляла перад люстэркам валасы. Без шапкі яна выглядала крыху старэй, чым здалося ёй, Элі.
– Дакументы… вось яны.
– У вас ёсць яшчэ дзеці?
– Ёсць, дачка. Добра вучыцца, ходзіць у музычную школу. Дзеля яе мы на ўсё гэта і рашыліся… Уяўляеце, вяртаецца неяк са школы і кажа: «Я ніколі, ніколі не выйду замуж, усе хлопцы будуць мяне пазбягаць». Як цяжка… Вы, пэўна, асуджаеце нас?
– Я не суддзя.

– Хто сам такое не пераЖЫЎ, ніколі не зразумее. Дзякуй вам… Можа, трэба што для ўстановы? Скажыце.
– Пральныя парашкі і вопратка – гэтага заўсёды не хапае. І яшчэ прасціны.
– Мы прывязем, абавязкова… Я доўга думала, чаму так…
– Што?
– Чаму менавіта мне гэта выпала. Нарадзіць такое дзіця – вы разумееце, што гэта значыць для жанчыны? І ўсё жыццё пасля без супынку думаць пра ягоную, а праз яго і сваю непаўнавартасць. Напачатку я нават з мужам не магла легчы, сама сябе брыдзілася. Усё выдавала, што зноў паўторыцца… Хто можа такое зразумець…
– Вы не адна такая. Прырода нярэдка дае збоі.
– Лёгка вам казаць. – Жанчына сціхла, зазбіралася адыходзіць.
Мужчына на двары зачыніў капот аўто, сеў за руль. Трайны сігнал, наўздзіў тонкі і рэзкі, агаласіў двор.
Крокі.
Цішыня.
Яна зірнула на гадзіннік: палова дванаццатай. «Час Херувіма», – падумала і пайшла на другі паверх.

У аддзяленні для лежакоў было ціха, нават прыбіральшчыцы не ляскалі, як заўжды ў гэты час, ручкамі вёдраў.
– Паўлік!
Хлопчык перастаў хістацца, штомоцы гайдануў даланёй прычэпленую да рабрыны ложка бразготку. Цацка зайшлася звонам, і ён засмяяўся, выштурхваючы языком уперамешку з слінай няхітрыя гукі, азваўся на звон заўсёдным гартанным «га-га-га». І зноў захістаўся – энергічна, так што зарыпела і ўгнулася пад цяжарам цела драцяная сетка ложка.
Яна адхінула коўдру, легла побач з ім. У млявай стоме раскінула рукі, адчуваючы побач сынава цяпло, прыхінулася плячом да кволага, азызленага хваробаю торса.
Паўлік суцішыўся, абыякава ўтаропіўся вачмі ў бразготку. Затым перавёў пагляд на яе, закінуў галаў, гучна засмяяўся.
– Смешна табе? – сказала яна і казытнула сына за калена.
Ён злёгку тарганУўся ўсім целам, прымаючы гульню, квэцнуў рукою ёй па твары. Яна абшчапіла руку далонямі, падняла ўгору, да ўзроўню бразготкі. Паўлік ухапіўся за бразготку, штомоцы пацягнуў на сябе. Цацка незадаволена ікнула, пераадольваючы супраціў струны, хіснулася пад столь.
«Паляжаць крыху», – падумала яна і зможыла павекі.
Ляжаць, аднак, не выпадала. Яна сашмаргнула ўбок коўдру, прывычным жэстам прасунула руку пад ваглаватыя Паўлікавы клубы. Прасціна была сухая – гэта дадало ёй гумору. Яна зноў казытнула хлапчука за нагу, пазяхаючы – вось бы зараз тут, побач з ім, заснуць – падышла да вакна.
Шэрыя постаці капачоў на могільніку ледзь-ледзь выдзяляліся на тле свежага грунту. Двое расчышчалі снег вакол магілы, трэці, мабыць, быў у яме: рыдлёўка раз-пораз вынырвала з-за даволі высокай ужо гурбы гліны, выдаўшы чарговую яе порцыю, знікала ў доле.
Сонца бліснула ў вакне, асвяціла пакой. Паўлік незадаволена хэкнуў, ратуючыся ад нязвыклай ясноты, пасунуўся на край ложка. Яна зашмаргнула гардзіну, выйшла ў калідор.

Жанчыны пад наглядам прыбіральшчыцы засцілалі ў холе прасцінамі нешырокі, на даўжыню труны, стол. Ва ўзгалоўі яго ўжо чырванелі самаробнымі блякла-чырвонымі гваздзікамі тры высокія, з парэпанымі бакамі, вазы – ахвяраванне лякарні сваякоў аднаго з нядаўна памерлых старых.

– Прывязуць нябожчыцу – паводзьце сябе як след, – сказала яна і пайшла на двор – паглядзець, што там на могілках.

Магілка была амаль гатовая, заставался толькі адкапаць падалей, каб не кідаць потым першымі на труну і не нарабляць грукату, абледзянелыя, з пукамі прыхопленага марозам карэння, глыжы.

Казімір спрытна падцягнуўся на руках угору, выкуліўся з ямы, узяўся раскрышваць глыжы рыдлёўкай.

– Ну, як, Віталеўна? – спытаў і хукнуў на пачырванелыя, са шнарамі ад даўніх парэзаў пальцы. – Добра мы зрабілі?

– Добра. І сцежку трэба расчысціць, а то не дамо рады пранесці труну.

У прасвеце між кустоўем мільгануў аўтобус, скупа, бы стомлены агніска, чхнуў гарам на нерухомы заснежаны альхоўнік, пасунуўся да лякарні.

Мужчыны выцягнулі труну з аўтобуса, панеслі ў будынак. Калі яна ўвайшла ў хол, дамавіна ўжо стаяла на стале, наўкола яе тоўпіліся, хто пасміхаючыся, хто плачучы, чалавек дваццаць хворых.

– Вынесем а трэцяй, – сказала яна і пайшла да сябе ў кабінет.

Гарбатнік, надзіва, быў яшчэ цёплы, і вада закіпела хутка. Вар пыхнуў парай, зрабіў у кубку колькі кругоў, зайшоўся рудзізною.

– Віталеўна, абед! – паварыха Ада ўсунула галаў у пакой, прытрымліваючы нагою дзверыну, унесла разнос з ежаю. – Я падумала, што сёння лепш вам тут паесці.

– Добра падумала.

– Тады смачненька вам!

У калідоры загаманілі, затупалі нагамі: хворыя пацягнуліся да сталоўкі.

Есці не хацелася. Яна прымусіла сябе праглынуць колькі лыжак пухкай, як снег за вакном, кашы, прынялася за гарбату. Але і піць таксама ўжо не было ахвоты. Напэўна, нервы, падумала яна і падалася назад у хол.

Пахаванне доўжылася хвілін сорак. Брудняваты, бы марылкаю пацягнуты крыж порстка ўвайшоў завостраным канцом у зямлю, немаю зданню застыў побач з пашэрхлымі суседнімі.

– Рахунак за дамавіну і крыж падшыйце ў папку, – сказала яна Андрэевічу. – На вячэру выдзеліце чаго-небудзь салодкага, як-ніяк паховіны. – Стала, азірнулася: магілка калыхнулася, самотна азвалася наўздагон шалясценнем штучных кветак.

Антон чакаў ля аўтобуса:

– Едзем? – спытаў, беручыся за ручку дзверыны..

– Паеду маршруткай, – адказала яна і пайшла ў пакой апранацца. І праз хвіліну была на двары. Не паспела, аднак, і дзесятка крокаў зрабіць, як адчынілася наверсе фортка і Шура, давячыся смехам, высунула на холад круглую сваю, коратка абстрыжаную галаву.

– Віталеўна, зараза, заўтра ж не забудзьцеся прыйсці!

– Перастань, Шура, – стомлена сказала яна і пайшла да прыпынку.

Міла сядзела на канапе, раз-пораз выціраючы расквеленыя прастудай, пачырванелыя вочы, глядзела нейкую перадачу пра гаротны лёс жанчын-мусульманак.

– Звяр'ё! Я б на месцы тых кабет нашыла з паранджы трусоў і выйшла ў іх на шпацыр! – зайшлася ў прыступе свабодалюбнае салідарнасці і націснула на кнопку пульта. Экран, працівячыся гвалту, бліснуў чырвона-блакітнаю плямай, стаіўся ў куце. – Вось, цэлы дзень адна, як зачумленая... Хоць жывая ў труну кладзіся. Як ты? Вырашыла што з Паўлікам?

– Вырашыла. Забяру дахаты.

– То аддаеш, то забіраеш! Дзе логіка?

– Я не вінаватая, што мама тады захварэла, а цябе не дазвацца было з таго замежжа. Што мне заставалася рабіць?

– Я не на шпацыр паехала ў Нарвегію, сама ведаеш. Такая стажыроўка рады ў гады надараецца. І цябе я зусім не асуджаю.

– Я цябе таксама.

– Дзякуй. А што з мамаю будзе? Я з ёй не ўжывуся, нізашто. Падай цыгарэціну. – Міла памяняла позу, вызваліла руку з-пад пледа, чыркнула запальніцай. Клуб дыму гайдануўся, паспешліва змяшаўся з фонам шэрае, у дробныя геаметрычныя фігуры, гардзіны. – Ну, дык што з мамай?

– Прапануем перайсці ў Жэневу аднапакаёўку.

– А ён згодзіцца, ты ўпэўнена ? А з такім дзіцем, як Паўлік... захоча жыць у адной кватэры? Ты пыталася ў яго?

– Пра Паўліка ён ведае толькі тое, што ён ёсць.

– Вось! І атрымаецца, як з Аланам. Паглядзіць мужык і пойдзе, і лаві тады ветру ў полі. Ну, сястрыца! Азірніся ты наўкола! Усе ўладкоўваюцца як лацвей ды ўежней... Іншая матка здасць калеку, і хоць бы што ёй, жыве прыпяваючы. Ужо не кажу пра тых, што пры нараджэнні пазбаўляюцца... А ты... Дзіця дагледжанае, у чыстым-цёплым – што яшчэ трэба? Подзвігу захацела? Каму ён, твой подзвіг, патрэбны?

– Мне.

– Табе! Напляце тая старая, і робіш па-ейнаму... Больш слухай яе! Застанешся без апоры – што тады будзеш рабіць?

– Адна буду жыць. Ты ж жывеш.

– Я – іншая справа. Я адна, бо гэта мой прынцып, разумееш? Абходжваць іх, мыць порткі, гатаваць – дзякуй... Калі ўжо сыходзіцца з кім, дык з жанчынай. Хоць турботаў менш.

– Што ?

– З жанчынай. – Міла зацягнулася цыгарэтай, даючы знаць, што размова скончана, схавалася за старонкамі нейкай кніжкі. – Толькі з жанчынай.

На двары было ціха і бязлюдна. Падсвечаны блакітнавата-белаю лямпачкай гадзіннік на ратушы паказваў палову сёмай. Маршруткі раз-пораз падрульвалі да прыпынку, расчараваныя адсутнасцю пасажыраў, порстка зрываліся з месца, несліся далей з надзеяй на выпадковых кліентаў.

Вецер аціх, пайшоў снег. Жанчына ў палітоне з норкавым каўняром спынілася пад аркаю суседняга дома, падзівіўшыся хвіліну на выведзены вялізнымі літарамі на тарцы надпіс «Харе-Кришна – пища жизни», са словамі «Чёрт-те что, по-украински уже пишут!» пасунулася ў накірунку начной

крамы, што зазыўна бліскала вітрынай у прасвеце між рэстаранам і нейкаю канторай.

Яна схамянулася, аддаючыся жаданню хоць у кім, хоць у гэтай вось незнаёмай жанчыне знайсці хоць якую, хоць часовую і зусім хісткую, апору, пакрочыла следам.

У краме, вельмі вялікай і светлай, было гэтак жа нешматлюдна, як і на дварэ. Штосьці абмяркоўвалі ля касы прадавачкі, у прасветах між стэлажамі некалькі пакупнікоў сноўдалі ў пошуках няведама чаго. Жанчына ў палітоне нерухома застыла перад вітрынаю з мясам, пыталася чаго-небудзь смачнейшага і таннейшага. Са стэлажоў з цацкамі ў куце залы весела шчэрылася гумавымі зяпамі рознакаляровае лясное, марское, пустэльнае ды іншае стацтва. Маладзенькая прадавачка ў фірмовай апратцы падскочыла да яе, расплылася ў ветлівай усмешцы.

– Вазьміце вось гэтага льва, – сказала і тыцнула пальцам у штосьці камлюкавата-грывастае. – Дзецям падабаецца. Колькі вашаму?

– Дванаццаць, – адказала яна. – Бразготкі ў вас ёсць? Я б купіла…

Дзяўчына неўразуменна ўсміхнулася, дастала з-за нейкіх скрыняў пук званочкаў.

– Вось.

– Тое, што трэба, – сказала яна і пайшла да касы.

На дварэ па-ранейшаму было ціха, ішоў снег. Бухматыя сняжынкі кружыліся ў паветры, пакорліва клаліся на ходнік і праезную частку вуліцы. Два аўто, узняўшы воблака пухкага, як вата, не прыбітага яшчэ коламі снегу, сарваліся з месца, пранесліся паўз краму ў завулак. З трэцяга, што стаяла амаль ля ўвахода збоч газетнага шапіка, вызірнуў хлопец гадоў дваццаці, пайшоў ёй наперарэз.

– Падвезці? – дыхнуў водарам жуйкі і паспрабаваў узяць пад руку. – Не пашкадуеце.

Яна вывернулася, дастала з кішэні мабільнік. Паліраваны бок апарата цьмяна бліснуў у паўзмроку – гэтага аказалася дастаткова, каб хлопец расшчапіў пальцы.

– Дурніца… Гібей сабе! – хіснуўся назад да аўто, бразнуў дзверыной.

Машына тарганулася, набіраючы хуткасць, знікла ў завулку.

– Эля? – Жэнеў голас вывеў яе са здранцвення. – Дзе ты?

– Тут… ля крамы. Побач з ратушай. – Гаварыць было цяжка, скаваны толькі што перажытым сполахам язык не жадаў слухацца. – Снег ідзе.

– Дык ты на дварэ ? Хочаш, прыеду?

– Не, – адмовілася яна. – Зімна, прастудзішся. Я сама прыеду, маршрутак поўна.

– Ну, дык чакаю.

– Чакай.

– Як найхутчэй… – Ён яшчэ нешта сказаў, але яна не пачула, што: і без таго далёкі, з характэрным грубаватым тэмбрам голас дарэшты заглушыў матор маршруткі.

Ліфт клацнуў тросам, спыніўся. Дзверы ў кватэру былі адчыненыя, пах гарэлага поўніў пляцоўку, падхоплены скразняком, шугаў угору, расплываўся па пад’ездзе.

Жэня выйшаў на звон, размахваючы газецінай, хіснуўся да яе.
– Прабач, недагледзеў пліту... Такою вось смірнаю сустракаю. Хадзем.
Шпалерына над уваходам гайданулася, шорхнула іспадам па тынкоўцы ў настойлівым памкненні абрушыцца долу.
– Рамонту просіць... Зробім к вясне. Ты галодная?
– Не надта. Лепш памыцца...
– Я толькі што напусціў у балею вады.
– Для мяне?
– А то для каго! Крыху вывучыў твае звычкі...
– Дзякуй!
Яна разулася, не здымаючы шапкі – чортведама што там на галаве! – прайшла ў ванны пакой. Падпусціла ў балею гарачай вады, з асалодаю ступіла ў шызавата-блакітную пену. Падводараная гелем вада гайданулася над целам, застыла на ўзроўні грудзей.
– Што-небудзь трэба? – Жэня прыадчыніў дзверы, не наважваючыся ўвайсці, стаў перад парожкам.
– Не, – адказала яна і інстынктыўна прыкрыла далонямі грудзі. Згадка пра тое – чытала дзесьці, – як мужчына топіць жонку ў балеі, таргаючы на сябе за ногі, вымкнулася з падсвядомасці, завісла на кончыку языка. – Ты... мог бы мяне ўтапіць?
– Дурноцце!
Яна зноў падпусціла ў балею гарачае вады, няспешна ўтаропілася вачмі ў бруднаватую, з пісягамі па краях, кафлю. Затым паднялася, зняла з вешака рушнік, пачала выціраццa.
– Ты згодзішся жыць у мяне? – спытала, выходзячы ў вітальню. – А сюды мы маглі б перавезці маму.
– Чаму б і не? Калі так зручней...
– Канечне, зручней, нас жа трое будзе.
– Калі ты пазнаёміш мяне з Паўлікам?
– Заўтра. – Яна адарвалася ад люстэрка. – Заўтра ўвечары, а сёмай, у лякарні.
– У лякарні? Чаму?
– Заўтра... Заўтра ўсё зразумееш. Пажадаеш – забярэш нас, не пажадаеш...
– Дзіўная ты. Што значыць – не пажадаеш?
– Усяляк бывае. – Яна распусціла валасы, падалася ў кухню, дзе свістаў, пыхкаючы парай, няновы і не надта чысты – во ўжо гэтыя бабылі – гарбатнік.
– Ты не давяраеш мне? – Жэня абхапіў яе за плечы, прытуліўся вуснамі да шчакі. – Чаму?
– Гэта занадта цяжка... Занадта. Не пытайся больш нічога. – Яна выключыла газ, пайшла ў пакой.
Дзверы рыпнулі, спяваючы петлямі, зайгралі плямамі зайчыкаў з вакна насупраць.
– Зашмаргні гардзіну, – ціха сказала яна, любуючыся згібамі крыху сутулага, з варсінкамі валасоў на плячах Жэневага торса, кульнулася на ложак.
Ён лёг ніцма побач, памкнуўся абняць яе, але яна тут жа падхапілася, пачала мітуслва, блытаючыся ў рукавах кофты, апранацца.
– Куды ты? Застанься!
– Не, мушу ісці.
– Так несумленна.

– Даруй! – Яна вярнулася да ложка, просячы прабачэння, сціснула ягоную цёплую, мокрую ад яе валасоў далонь.

– Дык хоць праводжу…

Да калідора, – сказала яна і ўпотай зірнула на сябе ў люстэрка.

Маршрутка спынілася, ратуючыся ад снежнае навалы, шыбчэй заміргала ачысткікамі.

– Гэтак позна і адна, – спачувальна сказаў кіроўца і адчыніў дзверы. – Глядзіце, асцярожна.

Яна паднялася з месца, чапляючыся поламі паліто за выступы пярэдніх сядзенняў, вылезла з салона, пайшла цалкам да інтэрната.

Запарушаны снегам будынак галоўнага корпуса вымкнуўся з белі, гайдануўся насустрач сілуэтамі комінаў.

Андрэевіч выйшаў на стук, пачціва замёр ля праёма.

– Пераблыталі дні?– сказаў здзіўлена. – Сёння маё дзяжурства… Забыліся, Віталеўна?

– Сёе-тое трэба дарабіць. А вы можаце ехаць дахаты, як пакрутаеце, дык якраз паспееце на апошнюю маршрутку, – сказала яна, шоргаючы нагамі па сухіх папяровых пялёстках, што зваліліся, мабыць, з труны, калі выносілі Антаніну, паплялася да свайго кабінета. Села на канапу, пачала паволі, эпізод за эпізодам згадваць падзеі дня. Густая, быераспелае варэнне, размова з маці… Паховіны… Шура… Жанчына з дзіцем… Апошнім, неяк неспадзявана, усплыў у памяці голы, з кропелькамі поту Жэнеў торс. І адразу ж следам – ценкі, пагбаны нямогласцю суставаў, – Паўлікаў.

На душы, надзіва, было нязвыкла, аж да вусцішнасці, спакойна.

Яна зняла паліто, пакінуўшы яго на спінцы канапы, выйшла ў хол. Праводзіла паглядам самотную постаць Андрэевіча, што хуткім крокам шыбаваў па двары ў накірунку маршруткі, спахапіўшыся, што не папярэдзіла, каб не заставаўся ўнаначкі і заўтра, ды не жадаючы ўжо даганяць, пайшла калідорам у прапахлае – як ні хларыруй, што ні рабі – хваробаю аддзяленне для лежакоў.

Паўлік спаў. Але як толькі наблізілася да ложка, каб лепчы побач, тут жа прачнуўся, роспачна заплакаў. Яна села на матрац, звыклым рухам падсунула руку пад разгарачанае сном цела. Прасціна была мокрая, трэба было яе памяняць.

Яна ўключыла святло, прыўзняўшы сына за плечы, выцягнула мокрую прасціну, кінула на падлогу. Верхні матрац таксама быў мокры, яго яна таксама зняла, панесла разам з прасцінаю ў сушылку. Дзяжурная, пажылая кабета, былая настаўніца, рэзка, ажно бомкнулі спружыны, падхапілася з канапы, вінавата ўсміхнулася.

– Прыснула, Віталеўна, даруйце…

– Дайце чыстую прасціну, – сказала яна і адчыніла шафу з бялізнай.

Дзяжурная падскочыла да шафы, пакорпалася ў стосе прасцінаў, дастала адну з-пад споду.

– Вось, самая чыстая. З тых, што вы прынеслі, хаваю…

– Добра. – Яна ўзяла прасціну, пайшла назад у пакой.

Паўлік, гуляючы бразготкаю, хістаўся на матрацы. Увайшла дзяжурная, паклала на ложак новы матрац, спытала:

– Памагчы?
– Памажыце.
– Чаму яны ўвесь час хістаюцца?
– Энергіі шмат, а дзець няма куды, вось і кампенсуюць… Жывое патрабуе выхаду.
Яна падняла Паўліка, дзяжурная, хутка і зусім нячутна рухаючыся ўпобачкі, разаслала матрац і прасціну паверх старога.
– Застанецеся начаваць, Віталеўна?
– Застануся.
Дзверы ціха рыпнулі, зачыніліся.
Яна выключыла святло, зняла адзенне, легла. Паўлік перастаў хістацца, кульнуўся ніцма побач і тае ж хвіліны засоп. Яна падумала, што няблага было б, як абяцала, патэлефанаваць Жэню, але ўспомніла, што пакінула ўнізе, у кабінеце, мабільнік, і засталася ляжаць. І ўсё-ткі праз хвіліну ўстала, ціхутка, каб не разбудзіць сына, выйшла ў калідор, спусцілася на першы паверх.
Кароткая, як паўдзённы цень, постаць аддзялілася ад сцяны ў калідоры жаночага аддзялення, хіснулася спачатку ў нішу, затым – бясшумна амаль – далей, у тупічок. Яна прыспешыла хаду, сочачы за кожным рухам чалавека, наблізілася да тупічка.
– Хто тут?
Чалавек у тупічку высунуў з-за выступа нагу, потым другую, быццам упэўніўшыся гэткім чынам, што небяспекі няма, – усё тулава.
– Гарушка? Што ты тут робіш паначы?
– У прыбіральню хадзіў.
– У жаночую?
– Каторая бліжэй, у тую і пайшоў. – Гарушка гыгыкнуў, выйшаў з-за выступа. – Усё адно ж нікога нідзе…
– Больш так не рабі.
На жаночым баку нехта быццам хіхікнуў, рыпнулі маснічыны падлогі. Яна абярнулася: нікога. Падышла бліжэй, слухаючы, як аддаляюцца, паўнячы калідор ледзь чутным шорганнем, Гарушкавы крокі, адчыніла першыя ад хола, Шурыны, дзверы.
Нямко Алеся і глухая і напаўсляпая Ірка спалі, параскідаўшы рукі, на ложках ля вакна, на трэцім, спрыхаду, сапла ў абдымку з лялькаю Шура. Яна ступіла да ложка, асцярожна – не напалохаць спрасонку – стала ва ўзгалоўі.
– Шура, спіш?
Шура мармытнула, цяжка, як праз сілу, дыхаючы, перавярнулася тварам да сцяны.
– Ну, спі, – сказала яна і злёгку датыкнулася да Шурынага пляча. Тая рэзка ўсхапілася, учапілася абедзвюма рукамі ў далонь.
– Віталеўна, ратуйце!
– Што такое? Каго ратаваць?
– Мяне … і яе…
– Каго яе?
Дачушку маю. – Шура падцягнула далонь вышэй, паклала сабе на жывот. – Во, кажуць: пазбаўся, а мне шкада…
– Хто так кажа?
– Дзеўкі ўсе. А я не хачу!
– Не слухай іх.

– Кажуць, усё адно адбяруць, як народзіцца, дык лепш, моў, выкінь... Паскачы, і яна згіне. А мне шкада!

Алеся прачнулася, праціраючы кулакамі вочы, неўразумела ўтаропілася ў паўночніц.

– Ай, шкада, Віталеўна! – зноў заенчыла Шура.

– Не слухай нікога.

– А што сказаць ім, як прычэпяцца зноў? Што?

– Скажы, каб пасікалі. Так і скажы: па-сі-кай-це!

– Во так і скажу. – Шура супакоілася, адпусціла далонь, адхінулася на падушку. – І скажу.

– І скажы, – падтакнула яна наастатак, задаволеная, што ўдалося ўрэшце супакоіць няшчасную, пакрочыла на званок, што вось ужо колькі хвілін, пакуль тут бавілася з Шураю, даносіўся з кабінета... Жэня, напэўна, падумала яна, уваходзячы ў кабінет.

Тэлефанаваў, сапраўды, Жэня.

*Дзень, як месяц, доўгі такі быў, ледзь-ледзь прыцемкаў дачакалася. Вось сяджу прымарафеціўшыся і не ведаю, чым адгукнецца спатканне. Паўлік пры мне, языком прыцмоквае – спіць. Глянула на гадзіннік: сем амаль, вось-вось заявіцца мой чорны. А сэрца бы матор той – валюх ды валюх – няспраўны.*

*Слізка было і ветрана, ды ці мала гэткіх дзён у такую пару – нічога мне сэрцайка не падказала. Помню толькі, што загуло-засірэніла раптам з вуліцы, у вакно глядзь: мітусня на дарозе, чалавек бервяном – рукі-ногі куды каторая – у атачэнні двух аўто даішных і жыгулёнка, знаёмага нібыта, пасярод шашы ляжыць. Паўлік прачнуўся, нядобрае спавяшчаючы, заенчыў. Бразготку я гайданула, думала, супакоіцца – аж не, гучней яшчэ заплакаў. Толькі як Казімір з Фандом выскачылі на двор, забегалі наўкола нерухомага, дайшло да мяне... Гарушка! Ірванулася да дзвярэй, каб ляцець да іх, але не паспела. Дзверы ўнізе бразнулі, тупат страхавіты будынак агаласіў.*

*І вось... Чорны мой на парозе, і двое даішнікаў за спінаю, во-во дагоняць. Дзверы я на зашчапку знутры, каб не схапілі яго, зачыніла, стаю ні жывая ні мёртвая. Спытаць хачу, што здарылася, а язык адняўся, і спазмы горла перахапілі, і ногі падкошваюцца. Да Паўліка ён падышоў, загаварыў нешта, і той сціх адразу, быццам вызнаў за роднага. Тады да мяне хіснуўся. У лоб, у прышчык акурат, пацалаваў, не бойся нічога, сказаў, і дзверы расчыніў, і пайшоў паперадзе тых двух. Паўлік бразготкаю загуляў – звон увушшу мне аддаўся ўперамешку з крокамі, і цёмна стала, як у склепе.*

*Следства нядоўга цягнулася. Шура, усіх пачарзе абзаразіўшы, прызналася: па спатканні ў закінутым гаражы вярталіся з Гарушкам у інтэрнат, задурэлі на дарозе і не заўважылі Жэневага аўто.*

*Два гады прызначылі чорнаму Кру...Жэню (нападпітку быў, прызнаўся), мне за халатнасць вымову ўляпілі. Прыняла як належнае вырак, а назаўтра Паўліка дахаты перавезла.*

*Во так перавярнулася. Пра што марыла, чаго чакала, чым жыла – усё, казаў той, за адзін вечар на зглум. Ледзьве ачуняла, ачуняўшы ж, на пасяленне тое, наведаць свайго чорнага, вырашыла злётаць.*

*У бараку адміністрацыйным пасля змены пабачыліся. У пакой увайшоў, дык і не пазнала адразу: пастава ягоная, галава ж – светлая зусім, святлейшая за сынаву. Як Алан калісь на чорнага перарабіўся, так ён на*

*светлага цяпер. Размаўлялі нядоўга, але і таго дастаткова было мне, каб даўмецца: схлусіў падчас следства, не быў нападпітку, узяў маё на сябе. Сказаць хацела пра тую здагадку – не даў. Палец прыклаў да вуснаў і пайшоў з прысвістам, галавою белаю цемру разганяючы.*

*Вярнулася я дадому і да Містрыні Добрай Рады, параіцца, што далей рабіць, хоць і так усё збольшага ясна было, за дзве ракі, балаціну дрыготкую паляцела. Прылятаю, а на месцы хаціны – каб гук табе, каб дух жывы, – пустка адна, зайцы ды авечкі здзічэлыя паўсюль, як вокам кінуць, ходзяць. Падумала ўжо, ці не памылілася месцам, як раптам бачу: жанчына нейкая паўз аблогу пляцецца. Прыгледзелася: яна, Містрыня Добрай Рады.*

*«Састарэла я, – кажа, падышоўшы, – праз грахі свае і ўсяго свету, вось і сталася. Кажы, што баліць».*

*Распавяла ёй, як на споведзі. І кажа яна:*

*«Вучыць цябе не выпадае, бо сама ты ўжо іншым можаш радзіць. Казала раней, але зноў скажу. Кожны з нас вольным нараджацца, і як зробім сабе праз іншага, так і маем. Сын дзеля хросту табе дадзены, самавіты светлы – на спатолю, вось і думай. Але ведай: як ён цябе з усім тваім прыме, так і ты павінна. Скруха і гора твае вялікія, але жыццё большае».*

*Сказала гэтак, і павалілася на зямлю ніцма, і на тло ператварылася. Спужалася я і таксама павалілася. Ляжу ледзь жывая і бачу раптам: гурт жанчын вымкнуўся з-за аблогі, закружыўся над ёю. І бралі па жмені з тла, і, спяваючы, разляталіся ва ўсе бакі. І я хацела ўзяць, каб узмацніцца ім, але ажыла яна на хвіліну і не дазволіла: «Не след табе, бо маеш з мяне даволі, як і я з цябе – на выбаўленне.»*

*З тым і паляцела я за дзве ракі, за балаціну – да жытла свайго, напалову шчаснага, напалову асірацелага.*

*Разбэрсалася ўсё, распалавінілася. Ды неяк будзе. Два гады – ці такі вялікі тэрмін, каб не вытрываць. Лёс жа на тое і лёс, каб іспыты нам падкідваць. Першы – каб схамянуліся. Другі – каб не засумавалі. Трэці – каб пра наступныя мелі магчымасць папрасіць. Колькі іх яшчэ будзе, Богу толькі ведама, – а згадваць сяды-тады пра папярэднія ані не зашкодзіць.*

*Свет – як кашуля без гузікаў, наросхрыст. У адным месцы захінеш, каб надтачыць куртатае, – у іншым, глядзь, вытыркнулася. Рук жа толькі дзве ў чалавека, і дай рады. Ды калі яшчэ вогнішчы паўсюль, і оябунаў[3] пры іх нямерана, і кожнаму пагрэць далоньку за іншага кошт карціць. Дзе ўжо тут духам апекавацца, ўратаваць бы цела. Як ёсць што ратаваць...*

*З ветразем, ды без стырна.*

*Зала белая, трон пасярэдзіне. Горача: дзверыну расчыніць...*

1 **Індзейскае племя з устойлівым комплексам самотніцтва**

2 **Паўторная катэхізацыя ўжо ахрышчаных людзей**

3 **начальнікаў** (японск.)

## КЛЁНІК

## АПОВЕД ЭГАІСТА

Мабыць, першым назваў яго гэтак я, а можа хто іншы – дакладна ўжо не памятаю. Хутчэй за ўсё, насамрэч, я: д'ябал-цвялюка і тады, у дзяцінстве, і пасля ахвотна мне прыязніў. Наогул, мянушкі, якімі мы, малеча, адно аднаго шчодра надзялялі, не вызначаліся выкшталцонасцю. Наша запрыгоненая суворым вясковым побытам фантазія далей назоваў тубыльнае флоры ды фаўны не сягала, а хвіліны вольніцы надараліся так рэдка, што іх і грэх было марнаваць на гэткую дробязную, нявартую справу. Тым больш што ўсе мы, маючы за ўзор паводзіны старэйшых, змалку прывучаліся выказваць думкі гранічна ясна і даходліва. З братавым жа імем было і зусім лёгка: прыставіў адзін гук, адну літарыну папэрадзе, і вось табе новае – КЛёнік. Менавіта так: К – асобна, Лёнік – асобна, разам жа, у сугуччы, – далікатна, а галоўнае – проста, як само сялянскае існаванне. Напэўна, якраз з тае пары ў глуздах маіх засела і суправаджае праз усё жыццё якаясь хваравітая, амаль фетышызаваная прыхільнасць да імёнаў немудрагелістых. Ганна, Эдзік, Воля, Зося, Ірка – мае ўлюбёныя. Гэтаксама як нялюбыя – Анжэла, Сняжана ці Руслан, ад якіх, незалежна ад арэалу бытавання, так і патыхае мне чамусьці нясветнаю азіятчынай.

Мая тадышняя ўласная мянушка, а іх усіх у мяне каля паўдзесятка было, канечне ж, – Француз. Ад імя, якое грамацейка-сельсаветчыца запісала ў метрыках на нямецкі кшталт. У хаце мяне звалі Франакам, але ўсё памянялася з пачаткам вучобы ў школе, дзе ад першае хвіліны я зрабіўся Францам. Пошасць школьная неўпрыкмет дапяла і да нашае хаты. Далей за ўсіх пратрымалася маці, але і яна ўрэшце здалася. Памятаю, нібы ўчора тое было, адчуванне прыкрае няўцямнасці, калі класе ў сёмым пачуў упершыню і ад яе калянае і шорсткае, бы перасушаны сыр на прыпеку, – Франц. «Франц, есці!» – гэтак трыццаціпяцігадовая, не змардаваная яшчэ дарэшты калгасным ярмом сялянка далучылася да цывілізаванага іменаслову. Адзіным, хто так і не паддаўся чужынскім павевам, заставаўся ён, КЛёнік, малодшы брат мой і галоўная персона гэтага аповеду.

Розніца між мною і братам у чатыры гады сцерлася неяк неўпрыкмет, калі мне споўнілася пятнаццаць. Быў сонечны перадвелікодны дзень, вясна грукалася ўва ўсе дзверы і шчэлкі, і КЛёнік выправіўся ўпотайкі ад бацькоў на сваю небяспечную (я гэткіх стараўся ўнікаць) забаву – гойсаць па крыгах. Маці спатрэбілася нашая помач, і яна загадала мне адшукаць брата. Я пайшоў па яго і ўбачыў КЛёніка акурат пасярод ракі. Ён стаяў на крызе, задраўшы галаў, сузіраў нябеснае прадонне. Наўкола бурапенілася шалёная веснавая вада, а ён стаяў пасярод яе ў твані з сапрэлага снегу і глядзеў на неба. Страх, што брат сарвецца з крыгі і зваліцца пад лёд, літаральна скаваў мяне, я гукнуў КЛёніка. Ён азірнуўся. Затым крутнуўся на адной назе, з месца, як стаяў, пераскочыў на другую крыгу. Тая пачала крышыцца пад цяжарам ягонага цела. Тады ён пераскочыў на трэцюю. І тут страх мой знік. Дзіўнае адчуванне, што нічога благога, прынамсі, гэтым разам з КЛёнікам не здарыцца, ахапіла мяне, і я, заварожаны ягонаю гульнёй з раз'ятранай стыхіяй, стаяў і глядзеў, як немаўля

на бразготку, на братавы выкрунтасы. А ён, задаволены, што, нарэшце, я, старэйшы, ці не прызнаў яго за роўню, усё скакаў ды скакаў з крыгі на крыгу, пакуль яны не скончыліся і апошняя не выслізнула з-пад ягоных ног у метры ад берага і не знікла следам за астатнімі ў пройме між шатамі вербалозін.

Мусібыць, у нейкай ступені і з маёй ласкі, бо я распавёў пра ўбачанае на рацэ бацькам, з таго самага дня ў нашай сям'і і замацавалася перакананне, што з варванцам КЛёнікам аніколі нічога благога здарыцца не можа. Доўгі час так яно і было. Тым болей, што сам ён як мог падтрымліваў рэнамэ шацунчыка.

Адною з найбольш выяўных рысаў характару брата была амаль што паталагічная прага чысціні. Уявіць яго ў брудным адзенні ці з нямытымі рукамі было гэтак жа немагчыма, як маці ці бацьку без штохвіліннага клопату па гаспадарцы. Гэта дзіўна, калі ўзяць пад увагу, што фізічнае працы ў нас і блізка не бракавала, ды тое, што, якою б бруднай яна ні была, ні ў школьныя гады, ні пазней наш КЛёнік-чысцёха, у адрозненне ад мяне, лайдака, ніколі яе не пазбягаў.

Калі я скончыў школу, КЛёніку было трынаццаць. Я з'ехаў вучыцца ў горад, і спатканні нашы рабіліся ўсё больш рэдкімі. Паштоўкі і лісты, якімі я на пачатку вучобы даволі рэгулярна адорваў крэўных, візуальных стасункаў не замянялі, ды з часам і ахвота да іх напісання, папраўдзе, змізарнела пад ціскам вясёлага студэнцкага жыцця. КЛёнік двойчы прыязджаў да мяне ў інтэрнат, і кожнага разу я ледзьве яго пазнаваў. Брат рос, мяняўся і... неўпрыкмет аддаляўся. Калі ён скончыў школу, я быў на апошнім курсе інстытута. Мне вельмі хацелася, каб КЛёнік атабарыўся дзе-небудзь паблізу, але яму такая перспектыва чамусьці не легла на сэрца. І ён, як і шмат хто з нашых маладых аднавяскоўцаў у той бязмежава-бязвізавы час, падаўся вучыцца на будаўніка ў суседнюю Латвію. Там ён закахаўся ў аднакурсніцу, але пачуццё тое не сталася ўзаемным. Гэта была першая КЛёнікава няўдача, якая, думаю, у немалой ступені з'явілася прычынаю наступных, больш сур'ёзных паразаў. Мне б падтрымаць яго тады, але як я мог тое зрабіць на адлегласці ў тры сотні вёрстаў... Ды, папраўдзе, і не да таго было мне – усё больш пачынаў завалодваць сверб літаратурных практыкаванняў.

Праз год, ачомаўшыся ад няўдалага кахання, брат папрасіўся ў войска. Яго ўзялі ў памежнікі, і праслужыў ён амаль тры гады. Як там ды што было ў той Архары, невядома, але вярнуўся КЛёнік з войска панурым і дзёрзкім, схільным да выпіткі. Маці, бачачы гэта, завяла гаворку пра тое, каб уладкаваць яго на працу дзе-небудзь паблізу ад мяне, але ён адмовіўся. Я ж, заняты на той час уласнымі праблемамі (аніяк не клеілася сямейнае жыццё), угаворваць яго не палічыў патрэбным. Неўзабаве і КЛёнік ажаніўся, і гэта даволі доўга было адзінае мне пра яго вядомае, бо звыклы свет перавярнуўся з распадам СССР, і мы дарэшты страцілі сувязь. Так што нават бацьку, калі ён раптоўна сканаў ад сардэчнага прыступу на пожні падчас касавіцы, мы з маці ды іншымі сваякамі хавалі без КЛёніка. Маці, якая памерла неўзабаве пасля бацькі, мне давялося хаваць аднаму.

Узнавіць стасункі – ажно праз чатыры гады – дапамог выпадак. Памёр мужык цёткі Данусі, матчынай сястры, якая тады жыла і цяпер жыве на латышскім баку, і яна дамаглася дазволу пахаваць яго на радзіме. Тады, падчас паховінаў, я і даведаўся нумар братавага тэлефона і, вярнуўшыся дахаты, адразу яму патэлефанаваў. Слухаўку зняла братавая, стомленым голасам паведаміла, што яны разам не жывуць, вось ужо год мінуўся, як разышліся і

размянялі кватэру. Што КЛёнікава аднапакаёўка нібыта згарэла і дзе ён сам зараз, яна не ведае. І мне нічога не заставалася, як паехаць яго шукаць. Адным з прэзентаў, які я паклаў у валізу і якім больш за ўсё спадзяваўся здзівіць брата, была першая мая, толькі што выдадзеная кніжка прозы, навеяная гісторыямі з маленства.

З падказкі колішняга аднавяскоўца, які жыў, як і наша цётка, на памежжы, я знайшоў КЛёніка на хутары паблізу Рэзэкне, дзе ён у хаўрусе з яшчэ двума мужыкамі займаўся нарыхтоўкаю веццяя для статку. Адзіным, што нагадвала ў нецвярозым дзецюку ранейшага КЛёніка і што адразу ж кінулася мне ў вочы, была, як ні дзіўна, усё тая ж, што і ў дзяцінстве, схільнасць да чысціні: чыстая, без адзінае плямы, кашуля, чыстыя, хоць месцамі і залапленыя, нагавіцы. Першае, што ён зрабіў, убачыўшы мяне, – папрасіў грошай на «чарніла». Я, не маючы наогул звычкі ахвяраваць хоць што на гэткія рэчы, выдзеліў некалькі манет. Гэтага было даволі, каб хлопцы загулі на цэлыя суткі. Гулі былі такія гучныя і непасрэдныя, што я вельмі хутка пашкадаваў аб сваім прыездзе. На другі дзень да мужчын далучылася неахайная маладзіца, ці не каторага з іх каханка, і п’яная вакханалія, цяпер ужо з дамешкам цынічнага, з грукаценнем ды оханнем па той бок танюткай і крохкай, бы яечная шкарлупіна, перабойкі сексу, разгарэлася з новаю сілай. Бачыць тое ўсё было невыносна, і я вырашыў з’ехаць. На шчасце, жанчына неўзабаве сышла, і я, каб не крыўдзіць КЛёніка, вырашыў застацца яшчэ на дзень.

Звечарэла. У хаце было горача, да таго ж і цесна, і мы з КЛёнікам выправіліся спаць у пуню на кладню. Я адразу лёг, а ён пайшоў да ракі мыцца і вярнуўся дзесьці праз паўгадзіны. Я паспрабаваў загаварыць з ім, але ён не адгукаўся. А калі я паўтарыў спробу яго раскатурхаць, раптам падхапіўся з падсцілкі, адкінуўшы пад падстрэшак дарунак мой – кнігу, абдаў мяне непрыязна-саркастычным: «Але ж смярдзіць ад цябе, Франук!» – «Смярдзіць? Ад мяне?» – «Ад цябе, ад каго ж! Я толькі што памыўся.» Я ўзгадаў, як трэсся ў перапоўненым вагоне, а затым у гэткім жа тлумным аўтобусе, як дапаў, нарэшце, да хутара ды, ашаломлены ўбачаным тут, забыўся не тое што памыцца, а нават пачысціць зубы, і мне зрабілася прыкра. Так прыкра, што я перастаў казытаць КЛёніка роспытамі. У душы было пагана, але я, аптыміст па характары, тут жа паманіўся адшукаць у тым паганым штосьці добрае. І адшукаў, уявіўшы ў КЛёнікавай фобіі ў дачыненні да бруду надзею, што не ўсё для яго страчана ў жыцці. З надзеяю я і заснуў, паспеўшы падумаць напрыканцы, што ўранку конча трэба адсюль з’язджаць.

Мне вельмі хацелася трапіць у родную вёску і на магілкі да бацькоў, але ажыццявіць жаданне замінalі памежныя пасты. КЛёнік параіў падацца ў абыход іх да цёткі Данусі і папрасіць каго-небудзь з яе суседзяў «ператарыць», як некалі казалі ў нашай з КЛёнікам вёсцы, на той бок на лодцы. Парада падалася мне слушнай, і я так і зрабіў.

Чалавек, які падахвоціўся памагчы мне, займаўся таемным перавозам не ўпершыню, і авантура наша прайшла без агрэхаў. Праз дзве гадзіны па развітанні з цёткай я быў у сваёй вёсцы. Парослая альхоўем і дзядоўнікам, што дружнымі купкамі паселі на месцы колішніх котлішчаў, яна спаткала мяне размаітым спевам птушак і гурбамі павуціння. З двух дзесяткаў хат, што калісь служылі надзейным прыстанкам сотні знябожаных пякельнаю працаю людзей, сяк-так ліпела адна – нашая. Пабітая вятрамі і шукальнікамі лёгкае спажывы, яна маркотна тулілася да пасаджаных бацькам паўстагоддзя таму дрэваў і

нагадвала дзіравы кубел: ні вокнаў, ні дзвярэй, ні страхі. Мне нават не заманулася ўвайсці ў яе, калі я ўсё тое пабачыў, тым больш што і ганак густа зарос крапівою, а бэлькі сцяны, ледзь я датыкнуўся да яе, пагрозліва захісталіся. Настрой мой, узняты ўдалаю, наўзбоч мытні, пераправаю, імгненна сапсаваўся, я падаўся прэч.

Я ўжо амаль мінуў мяжу, ад якой пачыналіся суседскія соткі, як убачыў раптам… клёнік. Гонкі дубчык гадоў двух-трох, выпрастаўшыся ўздоўж паўстлелага слупа з драцінаю, ціхамірна падрэмваў сярод пагодкаў-альшын. Быў ён такі самотны сярод іншародных парасткаў, што нагадваў асірацелае дзіця. І я падумаў, што няблага было б скарыстаць, як часцяком гэта робіць у пагоні за афарыстычнасцю наш брат літаратар, ягоны вобраз у якім-небудзь меладраматычна-жыццесцвярджальным аповедзе. А ўжо ў аўтобусе на шляху да могілак і сюжэт аповеду няўзнак акрэсліўся: канечне ж, будзе ён пра КЛёніка. Пра тое, як жыццё ламае датклівую, уражлівую душу, а яна, гэтая душа, працівіцца гвалту і ў крытычны момант застаецца-такі на вышыні свайго боскага прызначэння.

Вярнуўшыся дахаты, я дні з тры біўся над тым сюжэтам, але ён не «ішоў». Напэўна, таму, што сама гісторыя братавага лёсу не была да канца яснаю і мне зусім не хацелася яе прыспешваць.

Я напісаў КЛёніку ліст, але ён нічога не адказаў на яго, і стасункі нашы зноў перарваліся. Апошнюю звестку пра яго я даведаўся ад цёткі Данусі ажно наступнаю восенню.

КЛёнік забіўся ўсмерць, зваліўшыся з дрэва падчас нарыхтоўкі вецця. Я спытаў, калі тое здарылася, цётка адказала, што тыдзень таму, што яны з дочкамі пахавалі КЛёніка на могілках паблізу хутара. Я спытаў, як усё здарылася. «Франак, ты калі-небудзь бачыў, як дае нырца качка? – сказала старая і ўсхліпнула ў слухаўку. – Растапырвае крылы, падскоквае і, склаўшы іх зноў, куляецца ў ваду пад сабою… Мужыкі кажуць, што Лёнік так скокнуў… Дай ты веры – з чаго б гэта яму такое рабіць? Памыўся перад тым, як узлезці на тое дзерава, у чыстае апрануўся, і – на табе! Во як, Франц…»

Апісваць пачуцці, што заўладалі мною ў той дзень і дагэтуль валодаюць, – усё адно што распавядаць іншым пра змест фільма, якога яны не бачылі. Аднаго разу я паспрабаваў выказаць тыя пачуцці на паперы – атрымалася занадта слязліва і ненатуральна. Зусім не так, як у сне, што паўтараецца амаль з ночы ў ноч: рака, крыгалом, КЛёнікава расхрыстаная постаць у шалаватым памкненні вырвацца ў адчайнасць свету з абмежаванае прасторы сялянскага побыту.

Зараз мне пяцьдзесят пяць, я жыву адзін: жанчына, з якою лёс звёў мяне неўзабаве па КЛёнікавай смерці, сышла, не вытрымаўшы майго эгаізму. Як, зрэшты, калісьці і жонка, якая, праўда, зрэдку мне тэлефануе, каб паведаміць пра народзіны чарговага ўнука ды выдаткі, што такім падзеям спадарожнічаюць.

Часта, растузаны абрыдлым артрытным болем у нагах, я прачынаюся сярэдначы і доўга, доўга думаю. Пра тое, як добра было б вось зараз патэлефанаваць брату, каб панаракаць на хваробіну, ці проста паразмаўляць з ім, ці хоць бы пачуць у пасталелым голасе водгулле таго далёкага-паўзабытага, дзе ўсё гэтак гожа, хоць і цяжка, пачыналася. А калі бессань, злітасцівіўшыся, урэшце, адыходзіць, я зноў засынаю і сплю так доўга, колькі дазваляе прытупленая болем і адчуваннем нязбытнае віны памяць.

## МАРЫ З БУЛЬВАРА ДАВУ

## АПОВЕД ГІПАТОНІКА

У каханні, у тым, ці зрэалізуецца яно дарэшты, не толькі ад узаемнай прыхільнасці ды моцы пачуцця ўсё залежыць. Часам гэта толькі выдае, што каханне досвед папярэдні (не мае нават значэння – удалы ён ці не) можа адолець. Насамрэч досвед часта мацнейшы за пачуццё, ён зазвычай і перамагае. Асабліва, калі ўеўся ў цябе і ні сілы не маеш, ні жадання працівіцца ягонаму дыктату. Вось, здаецца, нешта новае на даляглядзе, свет у вакне, а як распарадзіцца ім, – не дасі рады. Бы з памідорынаю той падчас абеду, што і вабіць пакласці на талерку, і боязна: пачнеш рэзаць, а яна возьме ды пырсне з-пад ножыка на каторага з суседзяў, як некалі было ўжо – памятаеш – аднойчы. Зрэшты, у кожнага свой досвед, і колькі доседаў, гэтулькі і гісторый.

Мая гісторыя два гады таму пачалася. Час быў каламутны: вэрхал усюды, мітусня перабудовачная. Сваякі з-за мяжы пачалі адгукацца. Матчын дзядзька, бабін малодшы брат, Юльян, той самы, з-за якога мяне па сканчэнні школы ў лётную вучэльню не залічылі, ліст даслаў з Парыжа. Маўляў, старэю, восемдзесят неўзабаве, дык ці не мог бы каторы з вас, крэўных, прыехаць. Выдаткі сплачу дарожныя, адно клопату вам будзе – пацешыць дзеда прысутнасцю тыдзень-другі.

Я тады толькі-толькі з банка, дзе інжынерам па аўтаматызацыі рабіў, звольніўся. Кампутарныя праграмы, наладка-рамонт – самі разумееце. Ну, і начальніцы па сумяшчальніцтве, так бы мовіць, з удзячнасці за ўладкаванне на ўежнае месцейка адзіноты на лецішчы зрэдзьчасу памагаў пазбывацца. Нібыта і не сур'ёзна тое было па першасці, а і не заўважыў, як прыкіпеў душой да каханкі. Яна за мяне на дванаццаць гадоў старэйшая, дык вучыла сяму-таму… Аказалася – не аднаго мяне. Прыязджаю неяк увечары на лецішча, а яны ўдваіх з напарнікам маім, Артурам, на канапе…

Развіталіся з ёю, пайшоў я з працы. Ды так цяжка далося расстанне, што ажно хваробіну праз яго зарабіў: сэрца ные, ціск то высокі, то, наадварот, нізкі, галава трашчыць, як з бадуна, млявасць. А галоўнае – страх нейкі незразумелы, бы птушаня тое, дачасна з гнязда выпхнутае, скоўвае. Да лекара пайшоў, а ён кажа: «Неўроз у вас, трэба варункі жыццёвыя часова змяніць. З'ездзіце куды, праветрыцеся, і ўсе наладзіцца». Тут акурат ліст той самы ад дзеда паштарка прыносіць. Падумаў я, памеркаваў і вырашыў ехаць. З паперамі, праўда, намітрэнжыўся, пакуль пашпарт ды візу афармляў, але яно і добра, можа: нішто ж так ад болькі не адцягвае ўвагу, як неспадзяваная турбота.

Прыязджаю, значыцца, у Парыж. Сваяк як роднага спаткаў на станцыі, прывёз на таксі дадому. Дзядку пад восемдзесят, сапраўды, але рухавы яшчэ, бачу, бадзёры. Жытло ж так сабе: два пакойчыкі ў аддаленай акрузе, дом стары. За дарогу мне сплаціў, павёз на падземцы горад глядзець. Пашвэндаліся пару гадзін, вярнуліся дахаты, спаць леглі. А назаўтра, гляджу: – валізу стары пакуе. Ад'ехаць, кажа, мушу на некалькі дзён, дык за гаспадара пабудзеш. Паказаў, што і як рабіць, дзвесце франкаў пакінуў на кішэнныя выдаткі і паехаў.

Вось сяджу я ў самоце ў пустой кватэры, гляджу, як народ за вакном сюды-туды сноўдае. На дварэ – бы ў Афрыцы, мурынаў ды метысаў паўнютка, рухлівыя ўсе, гаманкія. Справа ад вакна ўваход у падземку зялёнаю пашчаю зеўрае. Не надта весела, адно добра: крамка побач, па правіянт далёка цягацца не трэба. Пасядзеў я гэтак гадзіны з тры ў кватэры, схадзіў у краму ды вырашыў у цэнтр горада па слядах, з дзедам Жульенам – тут так яго завуць – напярэдадні пракладзеных, прашпацыраваць. Дзверыну прымкнуў – і на двор, у падземку затым.

Еду сабе. У падземцы іхняй дзверы не механічна, як у нас, а ўручную адчыняюцца. Завалаводзіўся я на выхадзе з ручкай і праехаў станцыю перасадкі. Мусіў з наступнай на тую Насьён вяртацца. Па перасадцы сяджу ў вагоне, прыпынкі чытаю на табло. Да вежы пад'ехалі, народ паваліў з вагона, і я за ўсімі.

Ля вежы гамэрня, тлум. Азіяты з маляваннем чапляюцца, тут жа, збоч набярэжнай, накіды партрэтаў за дзесятак франкаў робяць. Пацёрся я з паўгадзіны ў натоўпе ды дай, думаю, яшчэ куды хіснуся. Мапу ліній падземкі разгортваю, каб паглядзець маршруты, па кішэнях мац – няма акуляраў, забыўся ў дзедавай кватэры. Надпісы ж на мапе драбнюткія, хоць трэсні ад напругі, – не прачытаеш. Сяк і так круціў яе, і пад ліхтар падыходзіў, і з адлегласці (дальназоркасць у мяне) зырыў – не даў рады прачытаць. Тут чую раптам: па-польску нехта побач размаўляе. Азіраюся: маладзіца цыбатая цётцы нейкай штосьці тлумачыць Я да маладзіцы. Так і так, маўляў, ці не падкажаце, як да Сюртэ – першае, што ў галаў узбілася, жэкнуў – трапіць.

– Да Сюртэ? – дзівіцца яна. – Няйначай вы дэтэктываў старых начыталіся. Усе на Рывалі ці яшчэ куды плішчацца, а вам Сюртэ давай... З Усходу будзеце?

– Праўда ваша, – кажу. – А як вы здагадаліся?

– Па вымаўленню, – адказвае. – Я з Польшчы на дваццатым годзе з'ехала, дык нюансы гаворкі няблага ўлоўліваю. Да Сюртэ, кажаце? Мне да Нотр-Дама, а гэта тамсама, дык магу прыхапіць вас з сабою. Але толькі пешкі пойдзем. Згодныя?

– Канешне. З такой прыгожай дзяўчынай...

– Жанчынай, паночку, я ўжо двойчы была замужам.

– А я – нежанаты.

– Значыць, пашэнціла... Не бойцеся, я горад няблага ведаю, трэці год тут жыву. Пойдзем уздоўж Сены.

Вось ідзем. На набярэжнай ціха, адно лісце (сярэдзіна кастрычніка) шорхае пад нагамі ды вада, чутно, б'ецца ў рацэ аб бетон.

– Вунь ваша Сюртэ. Хочаце – збочым, тут побач вельмі прыгожы раён.

– Праўда, золатам нібыта аддае.

– Не золатам, а цытрынаю. Так Джойс пісаў. Вы чыталі Джойса?

– Не.

– І добра, што не чыталі. Бзікі генія. Усе кажуць, бытта цікава, а самі адно і чытаюць апошнюю частку – як яна ў ложку з мужам... Дарэчы, мяне Мары зваць. А вы што – ні зюк па-французску?

– Ні зюк.

– Кепска. Давядзецца мне паапекавацца вамі. Ці, можа, маеце ўжо апякунку?

– Апекуна. У сваяка гасцюю, дык апякуецца.

– Што ж, таксама няблага.

Дзесяць хвілін гэтак шпацыруем, гамонячы, паўгадзіны і вось на вуліцу шырокую, самалётамі з абодвух бакоў, як на аэрадроме, застаўленую ўзбіваемся.

– Выстава. – Мары моршчыцца, глядзіць пад ногі. – Абутак зблоціла новы. Француззё гэтыя. Не каб траву якую пасеяць – жвірам пасыпаюць усюды. Добра, прыцемкі, ніхто не бачыць. Колькі часу?

– Без чвэрці шэсць.

– Мне дахаты трэба.

– Вы ж да Нотр-Дама збіраліся, – нагадваю.

– Перадумала, не выпадае сёння. А вы можаце са мною ехаць і на наступным прыпынку выйдзеце...

– Я таксама перадумаў. Паеду дахаты.

– Гэта куды?

– На вуліцу Аўрон.

– Дык мы суседзі! Я на бульвары Даву, ці не ў двух кварталах ад вас, жыву. Добра, едзем разам, весялей будзе. – Мары выцірае сурвэткай туфлі, крочыць да ўвахода ў падземку.

У падземцы тлумна і даволі сцюдзёна і ўсё ж утульней, як на дварэ. Бруднаватага колеру састаў вымыкаецца з тунеля, і мы апынаемся ў вагоне. І праз чвэрць гадзіны, не прамовіўшы за ўвесь гэты час адно да аднаго ні слова, пад'язджаем да патрэбнай станцыі. Выходзіць нам таксама разам, і я падаю Мары руку.

– Можна вас праводзіць?

– Можна, – згаджаецца яна і ідзе да сходаў. – Толькі ж глядзіце не заблудзіцеся. Пешкі прыцемкам у гэтым раёне швэндацца не раю. Арабы і чорныя вас не любяць.

– Чаму?

– Мабыць, адчуваюць канкурэнцыю, ці яшчэ што... Вас жа ого колькі зараз з Усходу. А вунь мая кавярня. Там я працую.

– І што робіце?

– Я ж кажу: працую. Афіцыянткай і крыху прыбіральшчыцай.

– Вы – прыбіральшчыцай?

– А што? Я не такая багатая, каб грэбаваць хоць якім заробкам. Хоць, паверце, і лепшыя часы зведала. Бацька на радзіме ў ПАРП рабіў, штогод да знаёмых у Саюз ездзіў. Па пятнаццаць-дваццаць найменняў залатых вырабаў за адзін вояж прывозіў употайкі на продаж. На мяжы пасведчанне партыйнае торкне мытніку, той і прапусціць без догляду. Таму на час, калі ўсё кулдыхнулася, мы пры грашах былі. А потым... – Мары змаўкае, хмурнее. – Словам, няшчасце... Бацька ў аварыю трапіў, павезлі на лячэнне ў Жэневу да знаёмага лекара-паляка. Ды не ўдалося ўратаваць, памёр бацька. Неўзабаве і матка следам пайшла. А тым часам грошыкі скончыліся, вось я і пераехала сюды да цёткі. Нумар тэлефона вам даць?

– Буду вельмі ўдзячны.

– Які вы цырымонны! Наце. Можаце патэлефанаваць заўтра, а захочаце... Ат, як хочаце, самі глядзіце.

Яна паварочваецца да мяне спінаю, шчоўкаючы абцасікамі па засмечаным ходніку, знікае ў праёме між будынкамі. Цытрынава-залаты горад, не зважаючы на страту, што заспела мяне толькі што пасярод вуліцы, адзываецца насустрач абыякавым гулам падземкі.

Самотны вечар пры экране тэлека – не самы лепшы занятак для бязмоўнага чужынца ў такім месцы, як Парыж. За вакном віруе разнаколернае вечаровае жыццё, а ты адно і маеш радасці, што сузіраць яго аскепкі на экране, і добра, калі то яшчэ не якая-небудзь палітычная дыскусія з удзелам субтыльнай, як во гэтая, мадам, што так і сыпе фразу за фразай, імпэтна памагаючы сабе жэстамі, раз-пораз кідаецца ў слоўную бойку з гэткім жа апантаным, як сама, апанентам.

Імя мадам – Мары. Такое ж – адно з падвойнага – у дыктаркі. Усе яны тут Мары, ці што?

Ма-ры.

Рука мая міжволі цягнецца да слухаўкі тэлефона.

– Гэта Мары?

– Так. А, вы... Добра, што патэлефанавалі. Я якраз пра вас згадвала.

– Што-небудзь благое?

– Не. Думала, чым вы займаецеся. Ну, там, дома ў сябе...

– Кампутарамі.

– Гэта добра.

– Чаму?

– Гуманітарыі зашмат гамоняць і мала робяць. Прабачце, атрымалася неяк двухсэнсоўна. – Паўза, смех. – Дык калі мы зноў сустрэнемся?

– Заўтра можна?

– Можна. У мяне першая змена, пасля чатырнаццаці я вольная. Можам спаткацца там, дзе сёння развіталіся. Вам зручна будзе?

– Зручна.

– Тады да сустрэчы.

– Да сустрэчы.

Пі-пі...

Галава... Ціск, напэўна...

Субтыльная мадам, відаць, ніколі не сыдзе з экрана.

Вечар цягнецца марудна, ды гэта ўжо зусім не тое, што пяць хвілін таму, зусім не тое.

У кавярні цёпла, але занадта тлумна: пайшоў дождж, і ўсе рынуліся сюды ратавацца ад яго.

– Не люблю гамэрні, – кажа Мары і абводзіць вачыма цеснае, запоўненае людам памяшканне. Затым рэзка падхопліваецца з-за століка, ідзе да выхаду. Мне нічога не застаецца, як ісці следам.

Вулка, на якую трапляем ледзь не з дзвярэй кавярні, занадта стромая, і Мары, каб не спатыкнуцца на абцасах, бярэ мяне пад руку.

– Як вам Сакрэ-Кёр?

– Нішто. Шкада, мала тут пабылі.

– У Бога дзён многа. Хочаце, пакажу Пігаль. Чулі пра яе?

– Крыху.

Плошча, шэрая і зусім, у адрозненне ад усяго тут, не цытрынавая, мяне не ўражвае, і я кажу пра гэта Мары.

– Таму што светлавата і ніводнае дзеўкі наўкола, – жартуе яна і дадае: – А можа, таму, што я побач...

Яна смяецца. І смех яе, абрывісты, крыху нервовы, гучыць як абяцанне. Я схіляю голаў да яе твару, лёгка, бы незнарок, дакранаюся даланёй да пляча.

– А вы чуллівы, – кажа яна і запальвае чарговую, можа, ці не трэцюю за паўгадзіны, цыгарэту. – Куды зараз? Шкада, надвор'е сапсавалася.

– Можна паехаць да мяне, – не надта спадзеючыся на згоду, кажу я.

– Можна, – нечакана згаджаецца Мары і накіроўваецца да ўваходу ў падземку.

Амаль ля самага дзедавага дома нас зноў заспявае дождж. Мары прыхінаецца да мяне, і я выразна адчуваю праз тонкую кофту дотык яе грудзей. Двое арабаў, што сядзяць нерухома ля ўваходу ў гатэльчык побач з маім пад'ездам, зачуўшы чужынскую гаману, падымаюцца, праводзяць нас няўхвальнымі паглядамі.

– Які паверх?

– Другі.

Понізу дзвярэй з кватэры ў калідор прабіваецца пасак святла. Гэта дзіўна: адыходзячы ўранку, я, добра памятаю, святло скрозь павыключаў.

– Ты? Прывітанне! – Дзед Жульен муляецца, адступае ў глыб калідора. – Даруй, такая неспадзяванка, сябар з сынам прыехаў з вёскі, напрасіўся ўнаначкі. Мы на Монтэ-Касіна разам ваявалі. Дык не мог жа я адмовіць. Так што завяду цябе ў гатэль, да Ахмеда. Ён мне вінен сёе-тое, без платы пусціць. Уранні сябрук мой з'езде, і ты вернешся. Толькі адну ноч... Прабач. Ты не адзін?

– Гэта Мары, – кажу я і, быццам імкнучыся загладзіць немаведама якую правіну, дадаю: – Яна полька.

– Амаль землякі, вось і добра...

Дзед выводзіць нас з Мары на двор, загадвае чакаць яго, а сам тэпае ў гатэль. Праз вакно бачна, як ён, пакашліваючы ў кулак, даводзіць штосьці ў рэцэпцыі сярэдніх гадоў арабу. Той згодна хітае галавою, з цікавасцю зіркае раз-пораз на мяне і Мары. Дзед дае нам знак, каб уваходзілі, і вось мы ў фае. Мужчына здымае з дошчачкі ключ на агромністай, морквінаю, бірульцы, падае мне.

– Merci!

– Пожалюста, – адказвае ён і, пацешыўшыся хвіліну з майго здзіўлення, гучна зазначае: Россия – хорошо... Я учился в России. Доброй ночи!

– Я з Беларусі, – удакладняю я, і ён здзіўлена міргае вачыма. Затым мы па чарзе развітваемся з дзедам Жульенам, ідзем да ліфта.

Цесная кабінка з дыванком на падлозе паволі сунецца ўгору, спыняецца акурат насупраць дзвярэй.

Нумар, як і кабіна ліфта, вельмі цесны: дваім між сцяною і ложкам не размінуцца. Да таго ж з вакна даносіцца несупынны гул. Мары зачыняе вакно, кладзецца дагары на адзін з хісткіх, накрытых прапаленаю капай ложкаў.

– Здымі мне туфлі, – кажа і падымае ногі на канапу.

Пацалунак доўгі і жарстлівы, як доўгачаканы сонечны прамень сярод дажджлівых дзён.

– Пачакай, я памыюся.

Яна ідзе ў ванны пакой, не зачыніўшы за сабой дзвярэй, адкручвае кран. Рэдзенькая пара, перакотваючыся хвалямі, паволі выплывае ў калідор. Яе покліч уладны і патрабавальны. Я зрываю з сябе адзенне, не бачачы нічога перад сабою, кідаюся ў яго салодкія, як водар парыжскіх бульвараў, абдымкі.

Мы моўчкі ляжым на ложку, думаем кожны пра сваё. Нарэшце Мары падымаецца.

– Куды ты? – Я абхопліваю яе за стан, прыціскаю да сябе.

– Пусці! – Яна шнарыць рукою у сумачцы, дастае футарал з танометрам. – Ціск трэба змерыць… Раптам падскочыў з такое валтузні…

Зашчапка змыкаецца на запясці, апарат, памаўчаўшы хвіліну, выдае танюткі піск.

– Кепска: сто сорак на дзевяноста. Хочаш, табе змерым.

– У мяне будзе нізкі, я ведаю.

Яна прышпільвае апарат мне да рукі, засяроджана глядзіць на лічыльнік.

– Сапраўды: сто дзесяць на семдзесят.

– Я ж казаў… Ты што, заўсёды носіш танометр з сабой?

– А што тут дрэннага? Мала што можа здарыцца ў любую хвіліну, і думай тады, куды кінуцца.

– Дзіўная ты…

– Дзіўная? Яшчэ скажы – дзівакаватая! Усё. Я пайшла! Пашукай сабе іншую… нармальную.

– Мары, ты што? – Я хапаю яе за руку, каб утрымаць, але дарэмна.

Яна апранаецца, ідзе да дзвярэй.

– Мары!

Я выскокваю следам за ёю ў калідор, але ў ліфт уціснуцца не паспяваю. А калі збягаю на дол, каб хоць па-чалавечы развітацца, яе ўжо там няма.

– Была и нет, – саркастычна ўсміхаючыся, кажа Ахмед. – У этих комюнистов та-кие красивые дочки!

А дзесятай раніцы дзедавы госці адыходзяць, і я зноў вяртаюся ў кватэру. Дзед стаіць ля пліты, смажыць яешню.

– Ну, як было ў гатэлі? Добра спалася?

– Добра.

– Чаму такі сумны? Не паладзіў з дзеўкай? Нічога, здараецца. Схадзі куды-небудзь. У Луўры па абедзе квіткі напалову таннейшыя, як зранку.

– Лепш проста пагуляю на вуліцы.

– Як хочаш. Толькі не бадзяйся доўга.

На двары смужна, але цёпла, ад раўчукоў збоч вулкі падымаюцца ўгору і тут жа рассейваюцца, падхопленыя вятрыскам, клубы пары. Ля дзвярэй кавярні, дзе працуе Мары, малады араб у бэжавай камізэльцы чытае газету. За вакном – Мары, яна стаіць спінаю да ўваходу, разлівае па кубках пітво. Хлопец-араб адрываецца ад чытання, лёгкая ўсмешка крывіць яго і без таго крываватыя, са шнарам ад носа да падбароддзя вусны. Ён колькі хвілін пранікліва глядзіць на мяне, затым кідае газету ў сметніцу, знікае за домам.

– Ты? – Мары выпростваецца, прыкрывае далонню гузак на левай скроні.

– Хто гэта зрабіў?

– Муж, хто яшчэ. Гаспадар гатэля перадаў яму, што бачыў мяне з табою. – Яна з трывогаю зіркае ў вакно, закрывае гузак пасмаю валасоў. – Чаго ты прыйшоў?

– Пабачыць цябе. Учора гэтак не па-чалавечы разбегліся.

– Вось зараз прыляціць мой, будзе табе – па-чалавечы!

– Ты не сказала, што замужам…

– Як гэта не сказала? Чым ты слухаў? Сказала: была двойчы. Наогул, мы з Люка даўно разышліся, але ён працягвае лічыць мяне сваёй уласнасцю. Слухай, прашу цябе: ідзі адсюль і больш не вяртайся, не то будзе блага. У Люка ўсюды сябры, ад іх не схаваешся. Я не хачу, каб у цябе праз мяне былі непрыемнасці. Ідзі!

– Мы маглі б паспрабаваць...

– Што паспрабаваць? Сустракацца далей? Які ў гэтым сэнс? Да таго ж мы зусім розныя. У мяне сто сорак ціск, у цябе – сто дзесяць... – Яна схіляецца да майго пляча, падштурхоўваючы да выхаду, дакранаецца далонёю да шыі. Лёгкі, бы дотык крыла анёла, пацалунак апякае маю шчаку: – Бывай!

– Бывай! – кажу я паўжартам: мне ўсё яшчэ здаецца, што развітальная гэтая сцэна – проста гульня.

– Шкада, што так... – Дзед Жульен запавольвае крок, глядзіць з-пад рукі на вежу. – Спадзяюся, табе падабаецца Парыж?

– Падабаецца. Рай цытрынавага колеру.

– Што-што?

– Вельмі прыгожы горад.

– А-а...

– Ну, добра.

Стары ідзе назад, я, счакаўшы хвіліну-другую, зварочваю ў двор Мары...

Дзверы адчыняе высокая худая жанчына са стомленым, крыху пагардлівым позіркам.

– Я хачу пабачыць Мары, мадам, – апярэджваючы запытанне па-французску, кажу я па-польску. – Яна дома?

– Мары ўжо два дні як у Польшчы. – Жанчына недаверліва глядзіць на мяне. – А вы хто будзеце?

– Яе прыяцель.

– Вы спазніліся. – Вусны жанчыны кранае ўсмешка. – Вось так.

– Прабачце.

– Нічога. – Яна адступае ад дзвярэй, пасоўваецца да самага парога, моцна трымаецца за зашчапку, нібыта баіцца, каб я сіллю не ўварваўся ў кватэру, дадае: – Калі вы ад Люка, перадайце яму, што Марыся больш ні ў Парыж, ні тым больш да яго не вернецца.

Так усё і скончылася. Я з'ехаў з Парыжа на наступны дзень пасля размовы з кабетаю і больш пра Мары нічога не чуў. Неяк напісаў дзеду Жульену, прасіў, каб даведаўся пра яе, але было запозна: ліст вярнуўся з пазнакаю «адрасат памёр».

Цяпер я працую ў тым самым банку, што і раней. У вольны час памагаю ўсё той жа начальніцы ўходжвацца на лецішчы. А калі яе патрабавальнасць робіцца невыноснай, дастаю тонометр і меру сабе ціск. І яна просіць змерыць і ёй. Я раблю гэта ахвотна, бо кожнага разу, седзячы насупраць яе і ціскаючы грушу тонометра, бачу перад сабой Мары. І згадваю словы яе пра тое, якія мы розныя. Бачу яе, але з кожным днём – усё менш і менш выразна. Магчыма, настане дзень, калі ўвогуле перастану бачыць. І тады, верагодна, горкі досвед, нарэшце, перастане мець нада мною такую ўладу, як зараз. Верагодна...

# ТРЫ МАЕ МАГДАЛЕНЫ

## АПОВЕД ФАРЫСЕЯ

Спакуса дзе заўгодна напаткае, гэта праўда. Як ні ўнікай яе, як ні хавайся, – дагоніць. Канешне, у сталым узросце яшчэ можна сяк-так працівіцца. А калі малады ды кроў ажно пырскае са шчок? Тут ужо як наканавана, так і будзе. Вось першую маю любошчную, з Магдаю, гісторыю ўзяць... Веры ці дасцё – у храме, дзе яна ў чарзе па адпушчэнне грахоў стаяла, спаткаліся. Я тлумачом тады ў адной турыстычнай фірме рабіў, вазіў групы ў блізкае замежжа. У адным гарадку заштатным і здарылася тое...

У храме ў той дзень набажэнства вялікае было. Люду скрозь – бы селядцоў у дзяжы, а вока маё яе, Магду, чамусьці з усіх выхапіла. Выпадкова, скажаце? Глянулі адзін на аднаго – і быццам токам працяло абаіх.

Па аглядзе храма група наўкола муроў пасунулася, а я тым часам на вежу, наваколле паглядзець, вырашыў падняцца. Ускараскаўся хуценька, стаю сабе, цешуся краявідам. Тады глядзь на дол: яна, да брамкі выходнай шыбуе. Як варам мяне хто абдаў... Зляцеў па сходах – і наўздагон за ёю. Дагнаў у завулку, крокаў за дзвесце ад брамы.

– Вы што, абрабаваць мяне надумаліся? – пытаецца яна і лып вейкамі, быццам ад сполаху. – Што вам трэба?

– Пазнаёміцца з вамі, – кажу.

– Я ведаю, – кажа, – хто вы. Чула, як аповед гіда сваімператлумачвалі. Мяне Магдаю зваць, калі вам так знаёмства абыходзіць.

– Біблейскае штосьці, – мармычу, не ведаючы, як паводзіць сябе далей.

– Скажаце! – бровы яна ўскідвае і слізгае паглядам па постаці маладога манаха паперадзе нас. – Цікава...

– Што цікава?

– Ці носяць яны што ў гэткую спёку пад хабітам, вось што, – адказвае і дастае з сумачкі ключ. – Я дома ўжо... Вось... А вам – нельга сюды. Так што дарэмна клапаціліся знаёміцца.

Запал мой – увесь на пацяруху.

– Нельга? Але чаму? Чаму?

– Таму! – злуецца і паказвае вачыма на вакно над ганкам.

Глядзь я ўгору: галава жаночая. Кабета гадоў пад семдзесят па пояс амаль высунулася з вакна і на нас глядзіць.

– Шмат было людзей на набажэнстве, Магда? – пытаецца.

– Як заўсёды, мама, – тая адказвае і прыадчыняе дзверыну. – Да мяне ніхто не прыходзіў з брацтва?

– Не.

Вакно зачыняецца, на шчасце, – і зноў я ў наступ:

– Дык, можа, пусціце мяне ўсе-ткі? Хоць ненадоўга, на колькі хвілінак.

– Гэта свякрова мая, – кажа яна безуважна нібыта, але тут жа спахопліваецца: – Ідзіце за вугал дома і чакайце, пакуль выйду... Я хутка.

І знікае за дзвярыма. Праўда, хутка, хутчэй нават, чым чакаў, вяртаецца – з валізаю ў руцэ.

– Вось, – кажа млява, прытомленым голасам. – Прыйдзеце пазней.

– З гэтым? – пытаюся ды тыцкаю пальцам у валізу. – Што тут?

– Вопратка, – шэпча ў адказ. – Апранеце яе перад тым, як сюды ісці. Толькі ўмова такая: на голае цела трэба апранаць, а не на споднае, абавязкова. І каптурык не забудзьцеся на галаў накінуць.

– Які каптурык?

– Перастаньце даймаць мяне пытаннямі! – злуецца зноў. – Адчыніце валізу і ўсё ўбачыце.

Мкнуся пальцамі да шоргаўкі, але расшмаргнуць не паспяваю: Магда хапае за руку, штурхае да ходніка:

– Не хапала, каб убачыў хто! Ідзіце!

– Што рабіць? Шыбую назад да храма. Групы там ужо, вядома, няма, хоцькі-няхоцькі плятуся з неспадзяванаю ношкаю ў гатэль.

Кіраўнічка групы – кацёл пякельны, адно варам не пырскае за раптоўнае маё знікненне.

Па абедзе – вольны час, кабеты разбрыдаюцца па крамах, а я, момантам карыстаючыся, пакуль няма нікога, – да валізы хутчэй. Здзіўленне – занадта слабое слова дзеля апісання пачуцця, што мяне апаноўвае пры выглядзе яе змесціва, – апраткі, акурат такой, як на манаху, за якім ішлі з Магдаю па завулку.

Тым часам шарэць пачынае, трэба даваць усяму гэтаму нейкую раду. Распранаюся дагала, усцягваю хабіт на сябе. У люстэрка глянуў: адыстар манах, адно што валасы караткаватыя. На ногі туфлі ўсторкаю – і ў калідор. Каптур на галаў па самыя вочы, каб дзяжурная не пазнала, – і вось на дварэ ўжо.

Да дома Магдзінага з паўвярсты ад гатэля, не больш, але, каб няўрокам не спаткацца з кім з групы, прастую наўкруга, паўз сквер. Людзей шмат усюды, ды на мяне, дзякуй Богу, ніхто не зважае. Вось і дворык знаёмы. І тут – неспадзянка: кодавы замок на дзвярах, а я пры развітанні нумара кватэры ў Магды не папытаўся.

Раптам самі дзверы адчыняюцца, Магда, ні слова не мовячы, хапае мяне за руку, уцягвае ў калідор, вядзе некуды.

Пакойчык невялічкі, па ложку двухспальным мяркуючы, – спальня. Магда на пасцель мяне ўсаджвае, прымасціўшыся па другі бок адгароджанай паўпразрыстаю тканінай рабрыны, камянее ў журботнай позе.

– Паспавядацца б мне, – кажа з уздыхам і дакранаецца незнарок да майго калена нагою ў маркотнага колеру панчосе. – Награшыла шмат, не магу больш трываць, сама сабе праціўная.

– Што вы! – смехам дурным даўлюся. – Я ж не святар, каб спавядаць! І наогул, не вернік нават.

– Не святар? – дзівіцца не жартам. – Чаму ж тады вы ў хабіце?

– Таму што манах, – адказваю, прымаючы гульню. – У хабіце манахі ходзяць.

– Манахі! – не здаецца. – А калі святар – манах адначасова? Вунь колькі ордэнаў розных...

Што тут скажаш! Нехаця пачынаю «спавядаць».

Уся споведзь – набор з дробязных грашкоў, што, маю падазрэнне, вандруюць у яе з разу ў раз, – доўжыцца хвілін дзесяць. Пакаяўшыся, грэшніца мая адкідвае галаў да сцяны ў чаканні выраку.

– Прызначайце ж пакуту!

– Тры разы... – кажу першае, што памятаю з нейкага фільма, – ... тры разы змові...

– Ажно тры! – не даўшы дагаварыць, крычыць Магда роспачліва. Затым бухаецца мне на калені, запускае руку пад хабіт. – Вось такая мусіць мне быць пакута, не меншая!

Такая дык такая! Абхопліваю яе за шыю, не помнячы сябе ад пажады, валю на ложак. Тут як узбрыкне яна!

– Не!

– Чаму? Што здарылася? – пытаюся.

– Для гэткай грэшніцы, як я, тут... чыста занадта, – адказвае і цягне мяне назад у калідор.

Ля дзвярэй збоч прыбіральні друзу нейкага, стружак гара – на іх і кладзецца.

– Вось тут будзе якраз, – шэпча, як непрытомная, і цягне да мяне рукі.

– «Пакута» з паўгадзіны доўжыцца. Магдзінаму памкненню да святасці, мяркуючы па яе стогнах, яна адпавядае ўпаўне. Ва ўсялякім разе, адбыўшы яе, грэшніца хвілін пяць ляжыць сярод стружак у стане прастрацыі і, магчыма, ляжала б і больш, калі б у дзверы не пастукалі і знаёмы жаночы голас не абвесціў, што дровы ў каміне згарэлі і попел ужо гатовы.

Тут ворах дурны як шыбане мяне!

– Які попел? – пытаюся і цікую да дзвярэй.

– Цябе не тычыцца, – Магда мая рогатам заходзіцца. – Спужаўся?

Насмяяўшыся ўволю, хапае мяне за нагу ніжэй калена, зноў цягне да сябе. Спрабую вызваліцца, але дарэмна.

– Сам жа сказаў – тры разы, – шэпча з такім дакорам у голасе, што мне робіцца сорамна.

– Ну, далей, разумееце самі, што... Як было, не буду апавядаць, вушэй вашых пашкадую, адно зазначу – гэтым разам «пакута» куды даўжэйшая была. І зноў Магда як нежывая, нарэшце, падымаецца, абвейваючы далонямі грудзі (у пакоі горача – не дыхнуць), падыходзіць да дзвярэй, грукае кулаком па аўшаку. Дзверы расчыняюцца, старэчая рука ўсоўваецца ў шчэлку, падае нейкі пудэлак. Магда перахоплівае яго, разбэрсаўшы абы-як кароткія валасы, перакульвае сабе на галаў.

– Што ты робіш? – пытаюся.

– А ты не бачыш? – адказвае з усмехам. – Пасыпаю галаву попелам. Я ж грэшніца як-ніяк... Гэткае – пры жывым мужыку...

– І дзе ж ён, мужык?

– На заробках і вернецца не раней, як праз паўгода. Не пасціць жа мне гэтульki часу!..

– А калі даведаецца?

– Наўрад. Ведае ўсё толькі свякрова, але яна будзе маўчаць.

– А калі не?

– Будзе... Яна ж і прыдумала ўсё гэта з хабітам, дзеля маскіроўкі. Яна вельмі даражыць рэпутацыяй сям'і, вось, разумеючы, як цяжка жанчыне ў маім веку вытрымаць адзіноту, і параіла зрабіць такім чынам... Разумна, праўда?

– Напэўна, – кажу з цвёрдым намерам пайсці і шыбую да дзвярэй.

– Куды ты? – спыняе.

– У гатэль. Заўтра экскурсія пачынаецца вельмі рана, дык трэба адаспацца.

– Адаспацца! Мы ж дамаўляліся – тры разы, – нагадвае злосна. – Было не прызначаць!

Словы яе мяне бянтэжаць. Што рабіць? І заставацца не надта хочацца, і пайсці, дзвярыма ляпнуўшы, неяк няёмка.

– Цяпер выпусціць цябе не магу, – быццам адчуваючы мой сумнеў, кажа. – Пойдзеш – і суседзі, крый Бог, убачаць. Во, скажуць, мужчына ад яе… у цывільным. Ты ж не пацягнешся ў гатэль пры хабіце!

– Магу ў скверы дзе пераапрануцца…

– Ага, а я па вопратку, бы дзяўчо, за табой пабягу? Дзякуй! – успыхвае. – Кавы хочаш?

– Гэта можна, – пагаджаюся. – Я б і з'еў што-небудзь.

– Селядзец ёсць, – кажа і запальвае цыгарэту. – Будзеш?

Селядца мне якраз і не хочацца, але я такі галодны пасля ўсіх гэтых «пакутаў», што пагаджаюся на яго.

Пад'еўшы, запіваю пачастунак каваю, таксама запальваю.

– Можа, памыемся? – тут Магда прапаноўвае. – Ідзі ў ванну.

– Ды ў гатэлі памыюся, – спрабую адбівацца.

– У гатэлі! Быццам тут вада горшая! Ідзі распранайся. Хутчэй, свякрова цікуе…

У калідоры, сапраўды, шалаценне нейкае, бы хто ступае.

– Хутчэй жа ты!

Гашу цыгарэціну, сунуся да ваннага пакоя. Распранаюся похапкам, улажу ў балею. Толькі паспяваю намыліцца, як і яна, Магда, уваходзіць.

– Вось добра, памыемся, разам і апошнюю пакуту адбудзем.

І гоп на мяне.

Ну, разумееце самі, што за мыццё было, хе-хе… Праўдзівая пакута, а не мыццё. Не ведаю, як на каго, а на мяне вада, асабліва цёплая, бы валяр'яна дзейнічае. Вокамгненна млявы раблюся… А ёй жа «пакутаваць» карціць! І так, і сяк яна ля мяне, а ўсё дарэмна. Дрэмле конік, хоць ты падсмаж яго… Ды раскатурхала, ды так, што замест аднаго заходу два запар атрымаліся. Словам, скончылася ўсё чын чынам. І памыліся, і пакуту апошнюю, ды не адну, а з дублем, адбылі.

Развіталіся амаль апоўначы. Я пераапрануўся ў скверы. Яна бэбахі з каптуром падпахі – і хто куды. Ад стомы і не памятаю, як да гатэля дабраўся. Пракраўся ціхенька да свайго пакоя і тут жа заснуў як забіты.

Назаўтра група наша ў іншы горад на экскурсію выправілася. Прыцемкам ужо вярнуліся ў гатэль, і вырашыў я Магду наведаць. Прыходжу да брамкі знаёмай, стаю, чакаю. Хвіліну гэтак чакаю, другую, раптам – што за праява? Расчыняецца брамка, і бэйбус нейкі з яе выходзіць. У хабіце да пят, каптур, непапушчы як у мяне ўчора, на галаве. Памкнуўся загаварыць з ім, ды не паспеў: вакно ўгары рыпнула зашчапкай, баба тая самая, свякрова, значыць, галаву высоўвае.

– А вы што тут робіце? – пытаецца ў мяне . – Хто не з брацтва, тым нельга сюды. Не хапала, каб людзі пра нас благое думалі! Ідзіце прэч!

Так і пайшоў я ні з чым. Па дарозе да гатэля ў скверыку вырашыў колькі хвілінак пасядзець, салодкае ўчарашняе ды куртатае сённяшняе ў адзіноце пераварыць. Толькі прымасціўся на лаве сярод хмызу – ён, манах той у хабіце, шыбуе. Валізу кідзель пад куст ды пераапранацца хуценька. А тут і Магда з-за кустоўя выходзіць. Падхапіла валізу – і ходу, адно пяты бліснулі.

На наступны дзень група наша з'ехала з горада. І больш я Магды не бачыў. Дахаты вярнуўшыся, пабойваўся трохі: раптам якая хваробіна, усяляк бывае… Ды нічога, абышлося. Але з тае пары асцерагаюся во гэтак, абы з кім…

Ды ўсё адно, як ні асцерагайся, спакусы не ўнікнеш. Дзе заўгодна дагоніць яна, і тады ўжо толькі паспявай адбівацца ад амуравых стрэлаў. Вось другую маю гісторыю, да прыкладу, узяць... Здаецца, несамавіценькая зусім, а колькі нерваў выцягнула! Як было? А во як.

Неяк залетась па вясне на зборы мяне заграблі. У войску не служыў я, але званне маю пасля інстытуцкай кафедры. Вось і даводзіцца пацвярджаць яго час ад часу. У мішэнь там стрэльнуць, прашпацыраваць па пляцы дзеля прыліку – самі разумееце... карысці з таго аніякай, але што зробіш – завядзёнка.

Тым разам на будоўлю выправілі. І трэба ж было гэтак здарыцца: у першы дзень паслізнуўся я кірзачамі на воглых рыштаваннях ды і пляснуўся вобзем з амаль трохметровай вышыні. Хлопцы лекара паклікалі, паглядзеў ён мяне ды загадаў у лякарню везці. Прывозяць, значыць, у лякарню, кладуць у палату. Палата як палата: сцены белыя, чатыры ложкі. Ну, і гамэрня, вядома. І ўсе, чую, пагатоў мужыкі пра маладзіцу нейкую, Алену, гамоняць. Маўляў, такая распусніца яна: пальцам паваб, тут жа прымчыць. І так мяне іхняя гамонка распажадзіла – месца сябе не знаходжу, дарма, што ў галаве мутна ды рабрына баліць.

– Калі ж змена ейная? – пытаюся.

– А праз два дні, – адказваюць.

Праўда, з'яўляецца яна праз два дні. Прыгожая, халера, вачэй не адвесці. А з паводзінаў – гулёма гулёмаю... Валасы абы-як на галаве, грудзі – бы гары дзве, а мова... На кожнае твaё слова – дзесяць у адказ. І ўсё з жартачкамі, з рогатам.

Праз пару гадзін па яе прыходзе па малой патрэбе мне закарцела. Павярнуўся, каб судна дастаць з-пад ложка, – куды там, так зыгнула ў баку, што прытомнасць ледзь не страціў. Гукнуў мужыкоў, каб памаглі, а яны пахаваліся пад коўдрамі ды і храпуць, быццам сонныя. Давялося кнопку ціснуць, выклікаць Алену.

Прыбягае яна:

– Што трэба?

– Вось, – кажу, – судна не дастану.

Дык што яна робіць? Тыц адну руку пад ложак, дзе судна, а другую – пад коўдру мне, кятурку нібыта памагчы расшпіліць. У мяне ад нечаканасці ажно дыханне перахапіла.

– Сам, – кажу, – дам рады, не клапаціцеся.

– Сам дык сам, – смяецца. Пачакала, пакуль спраўлю патрэбу, пайшла.

А мужыкі як зарагочуць пад коўдрамі.

– Ну, ці не праўду табе казалі? А ты не верыў!

І тут самы старэйшы, гадоў пад трыццаць пяць, дзяцюк і мовіць:

– Лохам буду, калі не завалю Аленку на гэтым ложку. Яе шмат хто тут мацаў, а я чым горшы? У панядзелак лятучка ў іх, і вы павыходзіце з палаты, а я зраблю выгляд, быццам блага мне, і выклічу яе. І завалю...

– Не заваліш – хлопцы перастарэкваюць. – Дзе табе?

– А вось паглядзіце – завалю.

У панядзелак з раніцы дактары ўсе, сёстры да галоўнага ў кабінет шыбуюць, а мы – у калідор па адным з палаты, як дамаўляліся. Схаваліся ў засценні, чакаем, што будзе.

Праз якую хвіліну – крокі ад прыбіральні, бяжыць Алена. У палату – шась... Ну, думаем, усё, гамон красуні. Хвілін пяць ціха было. А потым як гахне нешта, ажно

сцены дрыжма. І крык, але не ейны – ягоны. Мы ў палату ўсе. І што бачым? Ляжыць наш спакуснік на ложку і курчыцца не раўнуючы той вуж на патэльні.

– Што тут? – пытаемся. – Што здарылася?

– А вось, – яна кажа, – надумаўся сёй-той салодкага паспытаць, а моцы не разлічыў.

І сіг у дзверы.

Суцешылі мы прыяцеля, сядзім, абмяркоўваем здарэнне.

А пад вечар – тэмпература ў яго. Сорак з гакам, дрыжыць, ажно ложак угінаецца. Пабеглі па доктара, а той, як на злосць, на выездзе недзе і калі вернецца – невядома. Паклікалі Алену.

Прыйшла яна, агледзела ўсяго.

– Святло гасіце, – раптам кажа. – Я распранацца буду. Зазімненне ў яго моцнае, целам трэба лячыць. Я ў кніжцы адной чытала, што калі прытуліцца голым да голага, – за ноч можна выгнаць прастуду. Вось і паспрабую...

Выключылі мы святло, легла яна. Можаце ўявіць, што то за ноч была для нас.

А пад раніцу, дайце веры, адчуняў наш хворы!

Вядома ж, дзе мужыкі згаладнелыя, – там і кепікі. Маўляў, як гэта: спалі на адным ложку і не было нічога?

Слухала яна, слухала ўсё тое наша ды як зарагоча:

– Ага, спала з мужчынам! Дык што – галаву попелам пасыпаць?

І пайшла прэч з пакоя.

Неўзабаве жартаўніка нашага выпісалі з лякарні. А ў мяне – як у галаве ўсё адно нешта перавярнулася. Што ні раблю, куды ні кінуся , – усё пра яе, Алену, думкі. Спаць лягу – да раніцы перад вачыма стаіць. Толькі саскочу з ложка, каб пайсці сказаць ёй пра тое, як тут другое ў галаў: што, як праўда яна гулёма? Так змучыўся за два тыдні, уваччу было зялёна ад перажыванняў. Пакута! Ледзь дабыў у той лякарні. Выпісваючыся, адрас у Алены папрасіў: маўляў, ці мала што... Развіталіся. А праз два месяцы, адчуняўшы, вырашыў з'ездзіць у госці да яе.

Прыязджаю: нікога ў кватэры, хоць зазваніся. Раптам дзверына насупраць адчыняецца, баба высоўваецца на пляцоўку.

– Да Аленкі? – пытаецца з'едліва. – Нябось палюбоўнік?

– Знаёмы, – кажу, уражаны. – А вы хто будзеце?

– Свякрова яе былая, – адказвае. – Сын па маладосці ўляпаўся, дык ледзьве выкараскаўся пасля. І вам тое самае будзе, як не адумаецеся.

Тут мне і ясна ўсё стала. Сеў на цягнік ды дадому хутчэй, каб няўрокам не спаткацца.

А днямі – смеху варта – выйшаў у сквер на шпацыр, глядзь: знаёмы твар. Ажно яна, Алена! І мужык той, з палаты, пры ёй. Аказваецца, пабраліся нядаўна і ў наш горад, да бацькоў ягоных, пераехалі жыць. Так дружненька шыбуюць, сэрца ў мяне тахнула ад рэўнасці.

Ды што раўнаваць! Раўнуй не раўнуй, а нічога ўжо не пераробіш. Тым больш – і новы клопат маю. Нядаўна з дзяўчынаю ў адной кампаніі пазнаёміўся. Дай ты рады – Магдаленаю зваць. Гэта ж як скласці тыя першыя два імі, Магда ды Алена, якраз ейнае атрымліваецца... Вось і думаю – ці не знак які? Дзяўчына неблагая, здаецца, адно – жывая занадта. От і ўгадай... Ажэнішся, і во такою, як Магда акажацца... І так падумаю, і гэтак. Кінуў бы, ды надта падабаецца. Спакуса ж такая рэч, халера: укашацца – ні на якім аўто не абмінеш.

## КУФАР АЙЦА ТАМАША

## АПОВЕД ВІЖАВАТАГА

Новы жыхар з'явіўся ў доме надвячоркам, у суправаджэнні двух мужчын, што, не зважаючы на цікаўных усцяж балконаў, адразу ж узяліся насіць у пад'езд майно. Майна было гэтак мала, што ўсё яго перацягнулі з кузава машыны дзвюма ходкамі. Мех гаспадарчых прычындалаў, тэлевізар-перастарак з ручным рэгуляваннем, чатыры пакункі з кніжкамі, стос бялізны, сціпленькі набор сезоннага адзення ды абутку, сякі-такі посуд. Самую грувасткую і цяжкую рэч, абабіты бляхаю зялёны куфар з іржавым ісподам і інкруставанаю выяваю слана на вечку, упхнулі ў ліфт на падсцілцы. Але ў кватэру не павалаклі, а пакінулі, як загадаў гаспадар, пры сцяне наўзбоч дзвярэй. «Во яшчэ – не хапала нам тут скрыняў», – сказала незадаволена старшынька кватэрнага каапэратыву, і ўсе, хто браў перад тым удзел у спрэчцы наконт трохдзённае даўніны «аранжавай» рэвалюцыі ў Кіеве, моўчкі пагадзіліся з ёю.

Індыец Лакі, кватарант з сорак восьмай, студэнт медвучэльні, спусціўся на пляцовачны майданчык (слова толькі-толькі прыйшло да нас з тэлеэкранаў у сувязі з усё тымі ж кіеўскімі падзеямі) са свайго паверха з Камасутраю падпахай ды, уражаны выяваю слана, і забавіўся няўзнак пры тым куфры. А калі сабраўся адыходзіць, адбылася прыкрасць: дзверы ў Аляўціціну кватэру, дзе ён наймаў пакой, падхапіла скразняком, і замок зашчоўкнуўся. Чуллівая старшынька, якая даўно ўжо мроіла спасцігнуць сутнасць любошчнага трактату не з чужых словаў, тае ж хвіліны скарысталася сітуацыяй, завабіла чарнявага маладзёна да сябе. Да роспачы развядзёнкі Аляўціны, што, вярнуўшыся неўзабаве з працы, кінулася расшукваць кватаранта па ўсім пад'ездзе.

Гаспадар куфра, вастраносенькі дзяцюк у шырокім чорным палітоне, ціхамірна прайшоў у жытло, зачыніў за сабою дзверы. Але як толькі ўсе разышліся па кватэрах, ён зноў выйшаў на пляцоўку. Азірнуўся раз і другі на шыхт абабітых танным дэрмацінам дзвярэй, хуценька ўставіў ключ у замок куфра. Маснічына пад маімі нагамі рыпнула, я стаіўся ля шчэлкі пры дзвярах. Мужчына скасіў пагляд у мой бок, у нерашучасці застыў над куфрам. Затым, прыпісаўшы, мусіць, падазроныя гукі ў маёй кватэры гульні ветру, рашуча адчыніў вечка, вывудзіў на святло нейкую драбязу, панёс яе ў кватэру.

Тым часам старшынька, даволі ўсцешаная хаўрусам знаўцы позаў Камасутры, вырашыла вярнуць належнае суседцы, што ўсё яшчэ мітусілася па пад'ездзе ў пошуку страты. Пацікаваўшы хвіліну-другую ля дзвярэй, яна выпусціла Лакі на пляцоўку, шпурнула штосьці ў расчынены куфар і знікла з вачэй. Праз хвіліну зноў выйшаў на майданчык мужчына, гэтым разам каб зачыніць куфар. Вечка са сланом рыпнула, паслухмяна апусцілася на належнае месца. Усё сціхла.

Мне карцела як хутчэй пазнаёміцца з новым суседам, ды было ўжо запозна. На шчасце, ён сам гэтак не думаў. Ледзь паспеў я згатаваць гарбату, як у дзверы мне пазванілі. Я адчыніў: у праёме стаяў сусед.

– Раз ужо мы суседзі з вамі, дык я вырашыў вам давесці, што рэч гэтая (ён паказаў на куфар) мне вельмі дарагая, – не абцяжарваючы сябе якім-колечы ўступам, з парога пачаў ён. – Так што ў выпадку чаго хацелася б спадзявацца на вашу падтрымку. Ну, да прыкладу, крадзяжу там ці яшчэ чаго...

– Вам часта даводзіцца пераязджаць? – больш з ветлівасці, чым з цікаўнасці спытаў я.

– Даволі часта. Зараз вось толькі што вярнуўся з… Ат, не будзем пра гэта.

– Вы бізнесовец?

– Не, місіянер, – па хвіліне маўчання адказаў ён.

– Місіянер-каталік ці праваслаўны? – дэманструючы дасведчанасць у хрысціянскіх справах, зноў спытаў я.

Не тое і не другое, – адказаў ён неахвотна. – Рэлігія, якую я спавядаю вось ужо дзесяць гадоў, завецца рэлігіяй рэчаў. А мой куфар сярод іх – рэч найгалоўная, бо служыць схронам для ўсіх астатніх. З гэтым куфрам я нямала павандраваў па розных экзатычных і не вельмі мясцінах.

– Вы, мусібыць, маеце намер пісаць навуковую працу? – пацікавіўся я.

– Не, – адказаў ён і махнуў рукою. – Так далёка мае амбітнасць не сягае.

Мы папілі гарбаты, пагаманілі яшчэ пра сёе-тое, і мой госць зазбіраўся адыходзіць.

– Спадзяюся, вам у нас спадабаецца, – сказаў я на развітанне. – Людзі ў нас…

– Людзі скрозь аднолькавыя, – панура перабіў ён мяне і з замілаваннем у вачах пакратаў даланёю вечка куфра. – Можаце мне паверыць. – І, не чакаючы маёй рэакцыі на сваю банальную выснову, сцішана-мройліва дадаў: – Аднолькавыя, не сумнявайцеся.

Сумнявацца не выпадала – хоць бы таму, што я, прызнацца, не надта і разумеў, пра што ён гамоніць. Таму развітанне атрымалася лёгкае і радаснае – як і след разыходзіцца добрым людзям перад начою.

– Ці не маглі б вы сказаць вашае імя? – папрасіў я напрыканцы.

– Чаму ж не, – адгукнуўся ён і цырымонна, крыху манерна, на старасвецкі капыл адрэкамендаваўся: – Айцец Тамаш Базыленя, да вашых паслуг.

Першае, што я пачуў, прачнуўшыся ўранку, было, як заўсёды, рыпенне ложка ў кватэры паверхам вышэй: нястомны Лакі перад тым, як развітацца на цэлы дзень з Аляўцінай, дэманстраваў кабеціне рэшткі любоўнага, што застаўся ад вечаровага спаткання са старшынькаю, энтузіязму. Сям і там па кватэрах звінелі ходзікі, але падымацца ніхто не спяшаўся: крокаў нідзе не было чутно, дзверы не ляпалі. Ціша, што кожнага разу суправаджала ранішні шал у сорак восьмай, і гэтым разам заставалася непарушнаю. Так доўжылася з паўгадзіны.

Нарэшце Лакі гучна рыкнуў, выбаўляючы, няйначай, цела з салодкіх цянётаў чарговага ўрока Камасутры, саскочыў з ложка, пайшоў мыцца. І пад'езд тае ж хвіліны ажыў, загаманіў, напоўніўся гукамі. А праз паўгадзіны, здаволены пасілкам, зноў змоўк: пачынаўся працоўны ды вучэбны дзень. Адным з апошніх выйшаў з кватэры Лакі. Старшынька, якая ці не ад самага золаку падчэквала легкадумнага студэнціка ля сваіх дзвярэй, праводзіла яго ўдзячным паглядам звычайна самотных, а цяпер у адначас павесялелых, калі не шчаслівых, вачэй.

Мне зрабілася сумна, да таго ж карцела даведацца хоць што пра айца Тамаша, я выйшаў на пляцоўку. Надзіва, сусед ужо стаяў ля куфра, з выразам гідлівасці на твары порхаўся ў ім выбівалкаю для дываноў.

– Што-небудзь шукаеце, суседзе? – спытаў я.

– Наадварот, пазбаўляюся ад таго, што нашпурлялі за ноч, – злосна адказаў ён.

– Нашпурлялі?

– Уявіце сабе! Хоць я добра памятаю, як звечара прымкнуў куфэрак. – Айцец Тамаш спрытна падчапіў у скрыні выбівалкаю штосьці белае, падкінуў у паветры. – Бачыце?

Скамечаны жаночы станік, апісаўшы паўкруга, мякка абвіў камель кітайскае ружы паміж сцяной і падваконнем.

– Ну, як вы гэта растлумачыце?

Я згадаў, як надоечы старшынька, развітваючыся з Лакі, кінула штосьці ў адчынены куфар, і дурны смех ахапіў мяне. Я памкнуўся сказаць пра сваю здагадку суразмоўцу, ды не паспеў. Хтосьці, цяжка грукаючы чаравікамі па ўчарнелым цэменце, спускаўся долу з апошняга паверха. Мы з айцом Тамашом дружна хіснуліся ў нішу пры смеццеправодзе.

Дачасна саслеплы праз бясконцае шчыраванне ў сеціве праграміст Рабак з пяцьдзесят трэцяй кватэры сышоў на майданчык, папыхваючы цыгаркай, утаропіўся вачмі ў расчыненую дзверыну куфра. Затым зладзеявата азірнуўся наўкола, хуценька сапстрыкнуў пазногцем агмень з канца цыгарэціны і, плюнуўшы дзеля надзейнасці на недакурак, кінуў яго ў куфар.

– Добра яшчэ, не заманулася яму загасіць цыгарку аб слана, – сказаў, выходзячы са схову, айцец Тамаш і падчапіў недакурак сухім прутам ад ружы. – Ці, яшчэ горш, кінуць запаленую... Я ж кажу: усе людзі аднолькавыя. На Філіпінах я ледзьве паспяваў вычышчаць з куфра бананавае шкарлупінне, гэтулькі набіралася яго за ноч. І жук і жаба лічаць сваім абавязкам што-небудзь ды кінуць... І каб каму ў галаў калі прыйшло, колькі ўсё гэта каштуе! Куфру тры стагоддзі, і, як мне вядома, гэткіх інкрустацый усяго дзве ва ўсім свеце. Але людзям гэта зусім нецікава ведаць, яны хутчэй засіляцца, чым дадуць сабе клопату выявіць праўдзівы кошт чаго б там ні было.

– Ці не перабольшваеце вы? – сказаў я.

– Перабольшваю? Ні ў якім разе. А каб вы самі ўпэўніліся ў слушнасці майго меркавання, магу прапанаваць вам дослед.

Ягоныя словы заінтрыгавалі мяне.

– І што то будзе за дослед? – спытаў я з надзеяй пачуць нешта незвычайнае.

Айцец Тамаш наблізіў спярэшчаны аспінамі твар да майго.

– Нічога асаблівага, так, драбяза. – Ён панізіў голас. – Вы, спадзяюся, чулі пра шагалаўскі музей у Віцебску?

– Канечне. Днямі там, здаецца, адчынілася эспазіцыя з замежных калекцый.

– Вось-вось...

– Ці не хочаце вы ўчыніць крадзеж? – жахнуўся я.

– Які там крадзеж! – Айцец Тамаш паблажліва ўсміхнуўся. – Што да вас, дык вам наогул не давядзецца нічагуткі рабіць. Адзінае, што я хацеў бы вам даручыць, – гэта прыглядзець за куфрам, пакуль мяне не будзе. А разам і за кватэраю.

– Добра, – згадзіўся я. – Але ў выпадку чаго прашу мяне ні ў што не ўблытваць.

– Наконт гэтага можаце не хвалявацца. – Айцец Тамаш замкнуў куфар, аддаў мне ключ. – Я вярнуся хутка, так што дні праз тры зноў убачымся.

Мы цёпла, як добрыя прыяцелі, развіталіся, і праз гадзіну дзверы ягонай кватэры, гучна ляпнуўшы, абвясцілі пра гаспадароў адыход. Я вызірнуў у вакно: айцец Тамаш борзда шыбаваў з пеналам для папер у руцэ і плецаком за спінаю да тралейбуснага прыпынку.

Увесь першы дзень, што ён адсутнічаў, мяне даймала жаданне адчыніць куфар ды пакінуць расчыненым хоць на колькі хвілін. І толькі боязь быць заспетым за гэткім заняткам кім-небудзь з суседзяў, а праз тое западозраным айцом Тамашом у няшчырасці ды хлуслівасці да часу мяне стрымлівала. Але хэнць была такая неадольная, што ўрэшце я не вытрываў, паддаўся спакусе.

Ужо перакуліла на адзінаццатую, і на майданчыку было ціха. Я адчыніў куфар, прыўзняў вечка. Пах старызны, накшталт таго, што пануе зазвычай наўкола сметніц, шыбнуў мне ў нос. У куфры было пуста, толькі дзе-нідзе па кутах ды ў зазорах між дашчэчак жаўцелі ашмёткі тытуню і паскі паперы. Я ссунуў вечка ўбок, каб бачна было, што куфар незамкнёны, пайшоў у кватэру даглядаць фільм пра паходжанні сексуальных суседак. Даглядзеўшы яго, я лёг у ложак з цвёрдым намерам неадкладна заснуць. Але не паспелі і збольшага прытуманіцца мае разгарачаныя эратычнымі кадрамі глузды, як з пляцоўкі пачулася гамана. Я падышоў да дзвярэй, глянуў у шчэлку.

Пара падлеткаў, ён і яна, сядзелі на куфры і лузгалі семкі. Хлопец раз-пораз прыкладваўся да бутэлькі, што стаяла між імі, зрабіўшы зацяглы, з прыцмокваннем, глыток, перадаваў пляшку дзяўчыне. Тая адпівала, адкідвала галаў назад, і яны цалаваліся.

Сну майго як не было. Я вярнуўся з калідора ў пакой, адчуваючы, што не дам рады заснуць, зноў уключыў тэлевізар. І не заўважыў, як пачаў драмаць.

Да рэальнасці мяне вярнуў крык – ці то звонку, ці то з пляцоўкі. Я падхапіўся з ложка, сілячыся зразумець, што да чаго, рынуўся да дзвярэй.

На майданчыку было пуста, але зверху, ад сорак восьмай кватэры, даносіліся галасы. Вельмі гучны жаночы – Аляўцінін, і сцішаны, як чымсьці зглушаны – мужчынскі. У вузкім, ледзь далонь прапхнуць, праёме дзвярэй насупраць бліснула і знікла пара ўзбуджаных вачэй старшынькі.

Лакі басанож збег на пляцоўку, нешта мармычучы пад нос, у роспачы замітусіўся ля куфра. Затым схапіўся адною рукою за вечка, пальцамі другой націснуў кнопку збоч старшыньчыных дзвярэй. Кабета нешта сказала яму праз дзверы, але не адчыніла, і ён, незадаволена крывячыся, пасунуўся да сябе.

Больш прыгодаў не прадбачылася, і я пайшоў спаць.

Дзень наступны пачаўся для мяне са спазненнем: дала знаць аб сабе начная бессань. У доме было так ціха, што спачатку мне падалося нават, што яшчэ ноч. Але сонца ваўсю свяціла ў вакно, на двары без супынку гулі аўто, і трэба было ўставаць. Я падняўся з ложка, спехам папіў кавы, выйшаў на пляцоўку. Ля куфра стаяў сусед Валодзька, кіроўца фуры па ачыстцы горада ад бадзяжных сабак, і з невыказным хваляваннем на твары сузіраў разбэрсаныя па кутах вечка прэзерватывы. Прэзерватываў было тры, усе яны былі скарыстаныя. Убачыўшы мяне, сусед ніякавата, быццам гэта ён сам, а не хто іншы раскідаў па куфры ўсю гэтую неатрэбшчыну, усміхнуўся.

Я падняў вечка і аслупянеў у здранцвенні: куфар быў літаральна нашпігаваны розным друзам. Бульбянае шалупінне ўперамешку з маянэзам, папера, рыбная луска, дзіравыя шкарпэткі, дзяржальна ад патэльні, квашаныя яблыкі – ад гэткага асарці ў мяне ажно застракацела ўваччу. Понізу ўсяго, прыкрыты лахманамі, ляжаў, ашчэрыўшы пашчу, здохлы кот. Сполах, што ўсё гэта можа пабачыць, вярнуўшыся знянацку, айцец Тамаш, скаваў мяне. Трэба было штосьці рабіць.

– Прынясу цырацiну, i згрузiм у смеццеправод, – сказаў Валодзька i пайшоў да сябе.

Цырата, якую ён вынес неўзабаве, была дастаткова шырокая, i мы не марудзячы пераатарылi смецце з куфра ў яе. Яго аказалася так шмат, што скрутак засеў у адтулiне смеццеправода i давялося скiдваць у яе паасобныя фрагменты людскога плебейства штучна. Апошнiм паляцеў у рукатворны Тартар кот. Сумленне, што цiхамiрна драмала ў нас з Валодзькам да гэтае хвiлiны, раптам прачнулася i выступiла ў абодвух на тварах у выглядзе плямаў бурачковага колеру. Скончыўшы акцыю па ачыстцы куфра, я замкнуў яго, i мы разышлiся па кватэрах.

Дзень, што папярэднiчаў вяртанню айца Тамаша, прайшоў больш-менш бесклапотна. Праўда, нехта ўначы спрабаваў збiць замок на куфры, але да ажыццяўлення гнюснае задумы справа не дайшла. Так што калi айцец Тамаш напрыканцы дня з’явiўся на майданчыку, у мяне ўсё было чын чынам.

Айцец Тамаш выглядаў стомленым, але вясёлым, нават узнёслым. Вiдаць было па ўсiм, што ў Вiцебску яму, не тое што мне тут, пры куфры, спадарожнiчала шанцаванне. Я памкнуўся распытаць у яго, што ды як было, але ён дыпламатычна адмаўчаўся. Настойваць на адказе я, памятаючы выслоўе пра небяспечнасць ведання пра людскiя справы больш таго, чым людзi жадаюць самi пра iх распаведсцi, не палiчыў патрэбным. Хоць, прызнаюся, суседава зацятасць мяне крыху пакрыўдзiла. Праўда i тое, што яна ўрэшце была з каптуром кампенсаваная бутэлькаю фiрмовага вiцебскага бальзаму, якую мы распiлi ўдваiх у ягонай кухнi пад роспачлiвы енк тэлевiзiйшчыкаў па «няшчаснай», што яны асаблiва падкрэслiвалi, Украiне.

Мне ўсё карцела даведацца больш падрабязна пра прычыны ваяжу майго хаўруснiка ў сцюдзёны Вiцебск, але як толькi я паспрабаваў завесцi пра тое размову, айцец Тамаш мякка, але рашуча спынiў мяне. «Усякай гароднiне свой час», – сказаў i, ссунуўшы незадаволена бровы, разлiў па чарках рэшту напою. Я зразумеў, што дапытвацца – марная справа, i змоўк у спадзеве, што само як-небудзь высветлiцца. Тым часам пляшка апусцела, i мы выйшлi на пляцоўку праветрыцца. Айцец Тамаш адамкнуў куфар, прыдзiрлiва агледзеў усе яго закуткi. Затым правёў даланёю па дне, паднёсшы руку да самага твару, гучна, ажно забульчэла ў даўгiм носе, удыхнуў у сябе паветра.

– Здыхлёю смярдзiць, – сказаў i з недаверам глянуў на мяне. – Няйначай вы адчынялi, i нехта ўкiнуў штосьцi з падлы.

– Я адчынiў усяго на паўгадзiны, – не наважваючыся хлусiць больш брутальна, прамармытаў я дзеля апраўдання.

– I што здарылася за тыя паўгадзiны? – наступаў айцец Тамаш. – Укiнулi ката?

– Ката, ваша праўда. Але як вы здагадалiся, што менавiта ката?

Айцец Тамаш выцер руку аб станiк, што ўсё яшчэ вiсеў на камлi ружыны.

– Сабачыны я гэтулькi паперацягаў у смеццеправод у Карэi, што i спраcоння адрозню яе пах ад кашэчага.

– Даруйце мне.

– Бог даруе, – сказаў айцец Тамаш i, усцешаны, вiдаць, нагодаю прадэманстраваць уласнае высакародства, па-братэрску казытнуў мяне пальцамi той самай рукi, якою толькi што мацаў дно куфра.

Млосць падступiла мне да горла, i я, каб схаваць яе ад айца Тамаша, схiлiў галаў – нiбыта каб спраўдзiць па гадзiннiку час.

– Без чвэрці адзінаццаць! – удаючы сполах, што ўжо гэтак позна, ахнуў ён і падаўся да сваіх дзвярэй.
– Вы не зачынілі куфар, – нагадаў я.
– Зачыню пазней , – адказаў ён абыякава і пазяхнуў. – Не кансерваваць жа мне з вашае ласкі ўвесь гэты смурод.

Паўгадзіны мінула, а з суседавага жытла не даносілася ні гуку. Разам з тым шостае ці якое там яшчэ пачуццё мне падказвала, што айцец Тамаш не спіць. Я не памыліўся. Акурат апоўначы дзверы ўпобачкі з маімі сцішана рыпнулі, я хіснуўся да сваіх з намерам конча ўбачыць, што будзе далей.
Айцец Тамаш сядзеў на кукішках ля куфра і прышпільваў да ісподу вечка нейкую паперчыну. Затым узяўся перакладваць нешта ў куфар з кошыка, што стаяў побач.. Што гэта былі за рэчы, я не бачыў, бо, як на тое, айцец Тамаш засланіў відарыс спінаю. Скончыўшы справу, ён зачыніў, не замыкаючы, вечка куфра, выпрастаўся.
– Дабранач, суседзе! – сказаў раптам прама ў шчэлку маіх дзвярэй і па-блазенску, як дзіця, высалапіў язык.
Заспеты знянацку гэткаю ўвагаю, я ледзь стрымаўся, каб не адказаць ветлівасцю на ветлівасць.
Ледзьве ён пайшоў, як хтосьці яшчэ ашчаслівіў майданчык паўночным візітам. Я зноў падкраўся да дзвярэй.
Аляўціна, уся расхрыстаная, у адной начнусе, стаяла на пляцоўцы і з імпэтам вырывала з нейкай кніжкі аркушы, што адзін за адным падалі з яе рук у цьмянае прадонне куфра. Павырываўшы аркушы, яна бразнула абгортку кніжкі вобзем, раз'ятраным прывідам знікла на лесвіцы.
Я ціхутка, як толькі мог, выйшаў на майданчык. Знявечаная вокладка Камасутры шкадобна бліснула мне насустрач срэбрам літарын, затым зрок мой, ўражаны вычварнаю праяваю Аляўцінінай рэўнасці, сягнуў у глыб куфра. Я разгроб гурбу аркушаў і ўбачыў акурат тое, дзеля чаго шчыраваў па нашым развітанні на пляцоўцы айцец Тамаш. Надзіва, гэта былі рэчы гастранамічнага прызначэння. Адзіным, што не пасавала да ўсяго астатняга, з'яўляўся літаграфічны малюнак на іcподзе куфра. Я зірнуў на яго, і мне здалося, што дзесьці раней я ўжо бачыў яго перакуленых, з жахлівымі рыбінымі пашчамі персанажаў. Але згадваць, дзе, было запозна, і я, не жадаючы надалей рызыкаваць прыяцельскімі стасункамі з айцом Тамашом, паспяшаўся ў сваю кватэру.
Прачнуўшыся ўранні, я, у адрозненне ад папярэдніх дзён, перш-наперш уключыў тэлевізар. Заіклівая, але досыць апетытная дыктарка, скасіўшы ўбок расшыраныя кантактнымі лінзамі вочы, апавядала пра крадзеж шагалаўскага шэдэўра ў Віцебску. Праз хвіліну на экране з'явіўся партрэт гіпатэтычнага злодзея, і я ўздыхнуў з палёгкаю: нічога ў тым партрэце ад абрысаў твару айца Тамаша не было і блізка. «Дзякаваць Богу», – падумаў я і пайшоў у калідор, бо нехта пазваніў у дзверы.
На пляцоўцы стаяў айцец Тамаш і шчэрыўся ў ветлівай, аж занадта, калі ўзяць пад увагу мае здрадніцкія паводзіны падчас яго адсутнасці, усмешцы.
– Вы ўсё чулі?
– Чуў, – сказаў я і таксама ўсміхнуўся. – І вельмі рады.
– Вось як! – ці то не зразумеўшы сэнсу сказанага мною, ці то адно ўдаючы неўразумеласць, здзівіўся ён. – Радыя крадзяжу? Але ж дык!

Затым ён схапіў мяне за руку, не даўшы і хвіліны на роздум, літаральна выцягнуў на майданчык і ўрачыста, бы святар пры ўдзяленні прычасця, расчыніў куфар.

– Бачыце?

Куфар быў пусты, толькі ў адным з кутоў бялеўся акуратны стосік старонак з Камасутры.

– Бачыце? – перапытаў айцец Тамаш і яшчэ шырэй адчыніў вечка са сланом. – Чыста, як у ненаедніка на патэльні, да каліва падмялі. Я ж казаў вам: людзі ўсюды аднолькавыя. – Ён тыцнуў пальцам у выяву чалавека-рыбіны на літаграфіі. – Цікава, колькі яна тут правісіць, пакуль хто здагадаецца прысабечыць або паведаміць у музей.

– Дык гэта тое самае, скрадзенае? – жахнуўся я.

Айцец Тамаш і брыва не ўскінуў.

– Не пужайцеся, ніякага крадзяжу не было. Бог сведка – не, хоць, папраўдзе, намер такі напачатку я і меў. Я падабраў гэтае дабро ў двары музея. Відаць, звалілася, калі неслі разам з іншымі экспанатамі ў залу. Так што ніякага крадзяжу…

Лакі гарцліваю ланню збег на пляцоўку, прыгаворваючы штосьці па-свойму, выграб з куфра аркушы Камасутры, прыгарнуў іх да грудзей і з воклічам, што больш пасаваў бы ваяўнічаму індзейцу, чым ураджэнцу Індыі, кінуўся зноў у сорак восьмую.

– Што за вэрхал тут? – з надзеяю, мусіць, хоць здалёку пабачыць каханка высунулася з дзвярэй старшынька. – Што за гамэрня?

Айцец Тамаш шматзначна ўсміхнуўся.

– Вось, гандлюем сякім-такім друзам, – сказаў і пстрыкнуў пазногцем па літаграфіі.

– Гэтаю дрэнню? Ці не яе толькі што паказвалі па тэлевізары? І праўда, яе, я пазнала. Вы сур'ёзна думаеце, хто-небудзь наважыцца аддаць грошы за гэткую брыду?

– Мы гэта якраз і высвятляем, – з ноткаю маральнае перавагі ў голасе сказаў айцец Тамаш. – Дык купіце?

Старшынька войкнула, з жалем пазіраючы на сходы, што яшчэ захоўвалі цяпло ад падэшваў палюбоўніка, знікла ў кватэры.

– Што далей, айцец Тамаш? – спытаў я.

– Што? – задуменна перапытаў ён. – А што, сапраўды? – І, пакінуўшы мяне пры незачыненым куфры, памалу, як сонны, падаўся да сябе.

Што гэта была апошняя наша размова, я даведаўся толькі назаўтра.

Айцец Тамаш з'ехаў з дома гэтак жа нечакана, як і з'явіўся ў ім. Усё тыя ж малойцы вынеслі на майданчык ягонае майно, сцягнулі ліфтам долу і ўзгрузілі ў прычэп зялёны, з рарытэтнаю інкрустацыяй на вечку куфар. Літаграфію Шагала айцец Тамаш самаручна счапіў з ісподу вечка і аддаў старшыньцы, дамогшыся папярэдне ад кабеты абяцання паведаміць пра месца знаходжання экспанату ў віцебскі музей. Куды ўчарашні сусед ад'язджае гэтым разам, ніхто з нас так і не дазнаўся, хоць па тым, як цвёрда дакляраваў ён Лакі прыслаць асобнік Камасутры на адной з раманскіх моваў замест парванага Аляўцінай, ды па зменены прозвішчы ў пашпарце – Базылеску, – што выпадкова (далібог!) трапіла мне на вочы, няцяжка было здагадацца: кудысьці ў Еўропу і хутчэй за ўсё – на радзіму Дракулы.

## АСІМЕТРЫЯ

Трамвай прагрукатаў па мосце, і ўсё аціхла. Час нібы спыніў хаду, і ніякага жадання спраўджваць яго ў спадара Бортніка не было. Ад тае хвіліны, як патэлефанавалі з вышуку і сказалі пра няшчасце з дачкой, час страціў для яго звыклую штодзённую вартасць. Так што гадзіннік на руцэ дарэмна намагаўся нагадаць пра сябе навязліва-метадычным, бы пошум дажджу, ад якога ўжо добра стаміўся і чакаеш не дачакаешся, калі ж ён, урэшце, скончыцца, ціканнем.

Вада пад мостам дыхала парай, але самой вады не было бачна. Толькі ў адным месцы, якраз там, дзе два тыдні таму ўсё і здарылася, зеўрала няўмольнаю стыласцю цёмна-шэрая пляма віру. З моста, з амаль пятнаццаціметровай вышыні, яна нагадвала прадонне студні. Пара раз-пораз ахутвала і гэтую страхавітую пляму – праўда, ненадоўга, на якое імгненне, бо тае ж хвіліны, падхопленая брызам, расссейвалася ўсцяж пароспага альхоўем спуску.

Спадар Бортнік прыхінуўся грудзьмі да парапету, каб як след угледзецца ў ваду, і зноў, як і надоечы, пачуў крокі. Дзявочая постаць таропка ступіла на мост з процілеглага берага, нерухомаю зданню застыла над вадой.

Лера?

Гэта была яна. Пастава, вопратка, звычка глядзець з-пад рукі, перанятая ў Нэлі, – усё было даччынае, знаёмае да драбніцаў. Дрыжыкі хваляю прабеглі па ягоным целе, ссяродзіліся дзесьці пonізу каленяў. Ён склаў далоні ў пярэплаціну, каб гукнуць дзяўчыну, ды не паспеў: з пагорка зноў данесліся крокі.

Двое мужчын імкліва спусціліся да моста, спыніліся ў якой сотні метраў ад Леры. Яна, аднак, не зрэагавала на з’яўленне старонніх, як стаяла ўчапіўшыся далонямі ў парапет, так і засталася стаяць. Адзін з мужчын падышоў зусім блізка да яе, нешта сказаў. Яна нічога не адказала. Тады мужчына пасунуўся яшчэ бліжэй. Затым абхапіў дзяўчыну за стан, моцна, ажно яна азвалася войканнем, сціснуў у абдымках.

«Дык вось як усё было», – падумаў ён і з палёгкаю ўздыхнуў. Адвярнуўся, каб не бачыць, што будзе далей, стаіўся ў вусцішным маўчанні пры калоне з ліхтаром. Але калі праз хвіліну зноў павярнуўся тварам да тых траіх на другім беразе, яны ўжо былі паасобку. Мужчыны шыбавалі краем моста да месца, адкуль ён цікаваў, дзяўчына, спусціўшы рукі долу, засяроджана вадзіла паглядам па паверхні вады. Раптам яна перахінулася праз парапет, склала папераддзе сябе, як гэта робяць плыўцы, рукі, рынулася стоць галавой у вір.

Вада ўзбуджана гайданулася пад цяжарам яе цела, пырснула на кустоўе дробным асіметрычным веерам літарын і лічбаў.

Але ж нялюдскае!

Спадар Бортнік матлянуў галавою, каб прагнаць насланнё. Ды дарэмна. Літары ўсё плылі і плылі прад вачмі, і чым далей, тым гусцейшым рабіўся іх бясконцы шыхт. Так доўжылася колькі хвілін, аж пакуль рэкламны ролік не выбухнуў на экране ўпацелымі торсамі ўроскід з флаконамі дэзадарантаў і не вярнуў ягоную растузаную зданкамі свядомасць да рэальнасці.

Рэальнасць была гэткая ж бязладная і няўцямная, як і тыя зданкі. І ён, не жадаючы патураць ёй, машынальна памкнуўся рукою да пульта тэлевізара. І зноў спазніўся: літарыны-гіпнатызёры павыпаўзалі з кута, паплылі ўпоперак пукатага, бы перакормленая рэптылія, экрана. Спачатку літарыны, за імі, выведзеныя тлустым шрыфтом, – лічбы. Шэсць лічбаў, падзеленых на пары кароткімі, больш падобнымі да кропак, рыскамі. Дзяўчына шукае працу. Нумар тэлефона. Дзяўчына шукае… Нумар… Дзяўчына…

Нумар быў яму нібыта знаёмы. Ён напружыўся, каб успомніць, дзе бачыў яго, але не даў рады: у галаве ўсё зблыталася.

Тым часам літары, а за імі лічбы сплылі. Але праз хвіліну, ледзь скончыўся ролік, з’явіліся зноў – быццам наўмысна, каб яго пазлаваць ды яшчэ больш растузаць.

Дзе ён усё-ткі іх бачыў? Можа, у нататніку?

Спадар Бортнік сунуў руку ў шуфляду шафачкі, натыкаючыся пальцамі то на нажніцы, то на шпулькі з ніткамі, то яшчэ на нейкую драбязу, дастаў з-пад ісподу важкі, з зашчапкай упоперак абгорткі нататнік. Разгарнуў яго – і адразу натрапіў вачмі на нумар з экрана – шасцізначны, той, які дачка самаручна ўпісала ў нататнік у дзень, калі сыходзіла з дому на прыватную кватэру. За ўвесь гэты час ён так ніводнага разу і не патэлефанаваў ёй, не надаралася нагоды. Спачатку Лера раз на тыдні наведвалася дахаты, каб узяць што-ніштo з вопраткі ці абутку, – гэтага ім абаім было даволі, аж з каптуром. Затым і такія стасункі сышлі на ніштo. Што ж, як ні ён, ні яна ў больш цесных не мелі патрэбы… А можа, гэта толькі выдавала яму, што не мелі? Вунь жа як яно ўсё павярнулася…

Каб жа ж ведаць загадзя, што гэтак скончыцца…

Час, калі прабягала між імі іскра ўзаемаразумення і шчырае зацікаўленасці справамі адно аднаго, беззваротна мінуўся, як занемагла Нэля, жонка. Ад самага пачатку ён падазраваў, што Лера вінаваціць у матчынай хваробе яго. Быў то акурат час піку ягоных любошчаў з Тамараю, і,пэўна, да дачкі што-небудзь пра іх дайшло. Праз каго? Ды хаця б праз Нэлю: дзеці заўжды вельмі чуйныя да настрою бацькоў. А што Нэля ледзь не ад самага пачатку ўсё ведала пра ягоную каханку, ён, спадар Бортнік, зразумеў нашмат пазней, калі жонка трапіла ў лякарню. Так што калі ведала пра здраду Нэля – ведала і Лера. Хоць, папраўдзе, з ёю, як і з самою Нэляй, на гэтую тэму гамонкі не было. Як, зрэшты, і прыкметаў нейкага супраціву ягоным паводзінам з ейнага боку. Аднойчы толькі, калі трываць жончыны прыступы зрабілася невыносна і ён дамогся, скарыстаўшы сякія-такія сувязі, для Нэлі месца ў прэстыжнай лякарні, дачка адкрыта выказала сваю нязгоду. Тады яму ўдалося пераканаць Леру, што так будзе лепш для ўсіх і найперш – для маці, і яна нібыта пагадзілася. Нібыта – бо адносіны між імі ад таго дня пакрысе і сапсуліся. Усё, што ён зараз ні рабіў і што яна раней ухваляла, цяпер раздражняла яе і выклікала вачавіднае непрыманне. Скончылася тым, што яна сышла з кватэры. Апошняю кропляй, што падтачыла іхнія адносіны, стала, смеху варта, Лерына нежаданне вучыцца. Ён даводзіў пра неабходнасць мець належную адукацыю і ўжо амаль што пераканаў яе, але ў апошні момант яна занатурылася і не пайшла на іспыты ва універсытэт. Тады ён і завёў тую гамонку пра працу. Лера пакрыўдзілася, сказала, што знойдзе сабе занятак без ягонае дапамогі і наогул сыйдзе з дому. Ён пагадзіўся – з разлікам, вядома, што вельмі хутка яна зразумее сваю памылку і вернецца дахаты.

У кватэры, якую дачка зняла ў складкі з нейкаю дзеўкай, ён быў аднойчы, у дзень пераезду, калі дапамагаў перавозіць клункі. Тады Лера і ўпісала нумар тэлефона ў некалі агульны, а зараз толькі ягоны, нататнік. Хто б мог падумаць, што давядзецца пабачыць той нумар на экране тэлевізара.

Сапраўды, ён не тэлефанаваў ёй, але яна аднаго разу такі патэлефанавала, праз амаль два месяцы зацятага маўчання. Застылым голасам папыталася пра ягонае асабістае жыццё, паведаміла (менавіта так – паведаміла), што вось-вось знойдзе сталую працу. А яшчэ сказала, што хацела б разам з ім наведаць Нэлю ў лякарні. Размова была нечаканая і сухая, як восеньская бліскавіца. А праз тыдзень пасля яе Леру знайшлі ў віры пад мостам.

У аддзеле вышуку, куды яго паклікалі ў той жа дзень, схіляюцца да высновы, што гэта – самазабойства. Яму такое прыпушчанне служкаў Феміды ад самага пачатку падалося дзікім і неверагодным. І ён вырашыў пагутарыць па тэлефоне з Лерынай дзеўкай-супольніцай па кватэры. Тая прызналася, што справы і ў яе, і ў Леры былі дрэнь: абедзве перабіваліся выпадковымі заробкамі ў нейкім начным бары. Што то былі за заробкі, ён , каб не вярэдзіць лішне душу, высвятляць не стаў, і так збольшага было зразумела. Але сама навіна ашаламіла яго. Ягоная дачка зарабляе на пражыццё ў нейкім бары?! Ашаломленасць змянілася адчуваннем вінаватасці – упершыню, бадай, за ўсе апошнія гады. Ды, звыкшы да завядзёнкі ва ўсім гнуць сваю лінію, ён вырашыў не паддавацца яму. Самазабойства! А можа, зусім і не! Вунь колькі басцяецца паначы featurerознага быдлячча, ад якога чаго заўгодна можна чакаць…

Літары на экране працягвалі свой няўмольны карагод. Адны і тыя, адным і тым навязлівым рэфрэнам: дзяўчына шукае, нумар, дзяўчына шукае…

Ён дачакаўся, калі з’явіцца нумар рэкламнае службы, хуценька запісаў яго на паперчыну. Затым, хвалюючыся і змыліўшыся два разы ад хвалявання, набраў.

– Вы з абвесткаю? Ведаеце нашы тарыфы? – дзявочы голас гучаў лагодна і пачціва.– Калі так – дыктуйце тэкст.

– Я наконт той, што ідзе на вашым канале, – як мага стражэй сказаў ён. – Чалавека няма ў жывых, а ягоная абвестка без супынку круціцца. Што гэта за парадак! Тэрмінова спыніце!

– Мы не маем права спыняць без дазволу замоўшчыка, – таксама строга, але па-ранейшаму пачціва запярэчыла дзяўчына. – Ці вы і ёсць замоўшчык?

– Не я – мая дачка.

– То няхай яна сама і патэлефануе. А лепш, калі зойдзе з квітком…

– Яна два тыдні таму памерла.

– Як гэта? – Дзяўчына сумелася, змоўкла. Яму нават падалося – паклала слухаўку, але праз хвіліну голас яе загучаў зноў: – Як прозвішча?

– Маё? – цяпер ужо сумеўся ён.

– Вашай дачкі.

Ён сказаў прозвішча, і яна зашамацела нейкімі паперамі. Шамаценне доўжылася хвіліны тры, і нарэшце яна зноў азвалася:

– Лера Бортнік? Не, гэтая абвестка аплачаная іншым чалавекам.

– Кім жа?

– Гэтага я не маю права вам сказаць.

– Як гэта – не маеце? Нумар тэлефона маёй дачкі, а вы не можаце сказаць, хто замовіў абвестку?

– Прабачце, не магу. Не крыўдуйце. – Яна вытрымала, мусіць, са спачування да ягонага няшчасця, невялікую, на нейкае імгненне ўсяго, паўзу, паклала слухаўку.

Цяпер адзінае яму заставалася – патэлефанаваць на тую кватэру. Ён хуценька, быццам баючыся страціць запал, з якім узяўся за справу, набраў нумар. Слухаўку знялі хутка, нібы знарок чакалі пры апараце. «Лерын бацька?» – дзеўка расчаравана хмыкнула, паспяшалася надаць голасу адценне адчужанай абыякавасці. Так, абвестку яны далі ўдзвюх з Лерай, яна не зняла яе пасля няшчасця, бо насамрэч шукае працу. Калі ён жадае забраць Лерыны рэчы, можа прыехаць на кватэру ў любы час, хоць зараз, ёй чужога не трэба. Дарэчы, кошт абвесткі яна сплачвала адна, бо Лера якраз сядзела тады без грошай. Таму, калі ў яго і на гэты конт ёсць які сумнеў, яна можа паказаць квіток.

Надзіва, практычнасць дзяўчыны яго не толькі не абурыла, наадварот, – чамусьці ўсцешыла. Маладая – а гэткая ўчэпістая! Не тое што Лера – спешчанае дзіця, кроку не ўмела ступіць без бацькоўскае апекі.

Але ж во – ступіла...

Ад згадкі пра дачку ў мінулым часе патыхнула злавеснасцю і дакорам: ці пра тое след яму, бацьку, зараз думаць? Можа, лепей, сапраўды, паехаць па Лерыны майткі, раптам на месцы пашэнціць вывудзіць з дзеўкі яшчэ сякія-такія звесткі? Рук, казаў той, не падкладзеш, дык хоць, можа, крыху адпусціць боль.

Ён падняўся з канапы, трымаючыся за скроні – надта ж балела, ажно расколвалася, галава – паплёўся ў ванны пакой мыцца. Зачапіўся мімаходзь паглядам за цыферблат ходзікаў у вітальні і сцепануўся ад здзіўлення: адзінаццаць гадзін, а адчуванне такое, быццам ужо ноч.

Дзеўка чакала яго, бо валіза з Лерынымі рэчамі стаяла спакаваная пры дзвярах і дзверы адчыніліся ўвобміг, ледзь паспеў ён дакрануцца да кнопкі звона.

– Жадаеце паглядзець, ці не засталося што з рэчаў?

Ён прайшоў у адзін з двух пакойчыкаў, слізгануў паглядам па выцвілай шпалерыне, па дыванку пры ложку, перавёў позірк на стол. Усё акуратна прыбрана, так, як ён заўжды патрабаваў ад дачкі. З абведзенага чорнай тушшу ці не двухгадовае даўніны здымка на падваконніку паласнула па зрэнках пара сумнаватых Лерыных вачэй. Ён памкнуўся да вакна, каб узяць здымак, але дзеўка спыніла яго.

– Не трэба, хай застанецца мне на памяць. Мы з Лераю, хоць і не заўсёды адна адну разумелі, няблага бавілі час разам. У вас, пэўна, іншыя фоткі ёсць, а ў мяне адна – гэтая.

– Ну, хай сабе, – пагадзіўся ён і знарок павольна адышоўся ад вакна. Просьба дзеўкі расчуліла яго, і цяпер яму патрэбны быў час, каб прыкілзаць эмоцыі.

– Можаце паглядзець тут, – сказала яна і адчыніла дзверку шафы. – Нічога не засталося, усё я спакавала ў валізу.

– Мяне гэта не турбуе, – не зірнуўшы нават у бок шафы, сказаў ён. – Калі хочаце ўзяць што-небудзь з Лерынага, – вазьміце. Хоць і ўсю валізу... Але адкажыце на адно пытанне...

– На якое?

– Што за праца была ў вас? Ну, у вас з Лераю...
– Праца як праца. Дапамагалі дзядзькам пазбавіцца самоты, за грошы, вядома...Разумееце?
– Не зусім. Вы што – спалі з імі? – Голас спадара Бортніка здрадліва затрымцеў. – Так?
– Так. Праўда, не заўсёды. Надараліся выпадкі, калі абыходзілася драбязой. Пагаварыць там, паспяваць, ці яшчэ што... Не з прыемных занятак, ды што зробіш...
Ён хацеў спытаць, ці часта даводзілася ім усё тое рабіць, але не наважыўся з боязі натыкнуцца на хлусню і паманіўся перавесці размову на іншае, што найбольш вярэдзіла душу ўвесь гэты час:
– Лера... яна што-небудзь казала вам пра мяне?
– Сёе-тое... А што думала пра вас, і без слоў няцяжка было здагадацца. Пра вас і пра маці, гэта дакладна.
– Думала? Адкуль вы ведаеце? – Дыялог даваўся яму цяжка, вельмі цяжка.
– Я не такая бессардэчная і дурная, як вам, мабыць, здаецца.
– І што яна думала?
Дзеўка пастаяла колькі хвілін моўчкі, моўчкі кранула здымак на падваконніку.
– Яна казала, што чалавек павінен жыць дзеля сябе і дзеля сваіх блізкіх.
– Гэта фраза з Талстога... У дзевятым класе я, памятаю, памагаў ёй пісаць сачыненне на такую тэму.
– Не ведаю, не чытала Талстога. Чытанне не па мне.
– Што яшчэ яна казала?
– Што вы змалку прывучалі яе да парадку. Што любы непарадак і асіметрыя ў вас, а праз вас і ў яе выклікаюць агіду. Мяне ж дык якраз яны прываблiваюць, таму мы часта сварыліся. Нават у той дзень, калі яна скокнула... прабачце, калі яна...
– Вы думаеце, яна сама гэта зрабіла?
– Не сумняваюся. Нашыя знаёмцы не ахці што, канечне, але яны на такое няздатныя, я ведаю. Так што хутчэй за ўсё яна сама... Я б такое ніколі не магла вычварыць.
– Чаму?
– Яшчэ чаго! Бацька кінуў нас з маці, калі мне было шэсць гадоў. Потым маці пасадзілі... Я не дзеля таго выбівалася адна з усяго гэтага гаўна, каб... А вы... вы не вінавацьце сябе. – Яна падышла зусім блізка, трымаючыся адною рукой за рог стала, раптам пацалавала яго ў шчаку.
– Што гэта вы? – спытаў ён збянтэжана і пасунуўся ўбок.
– Так, падумала, што вам гэта будзе прыемна. Замест Леры... Абвестку я здыму заўтра. Яшчэ тры дні яна мае трываць, але як ужо такая справа...
Надзіва, такое рашэнне дзяўчыны не выклікала ў яго вялікае радасці. Нечакана для сябе ён зноў пасунуўся да яе, паклаў правую руку ёй на клуб. Цела яе здрыганулася, бы ад удару, хіснулася ў глыб пакоя.
– Перастаньце!
– Прабачце, – панура сказаў ён і падхапіў валізу. Але тут жа паставіў яе на месца. – Не ведаю, як гэта атрымалася. Прабачце...
– Зацяжкая? Можа, памагчы? – Дзеўка спачувальна глядзела на яго. Яе нежаданне гаварыць на казытлівую тэму дадало яму ўпэўненасці.
– Не трэба. Хай застаецца ў вас пакуль што. Можа, пазней калі забяру.

– Як хочаце. Мяне зваць Ірынаю, – абыякава сказала яна і падала, амаль што ўпхнула ў далонь яму тонкую, з бранзалетам на запясці, руку.

Ён выйшаў з кватэры, не азіраючыся, хоць чуў, як і дзеўка выйшла следам на пляцоўку, пасунуўся ўлегцы да прыпынку.

Намер паехаць у лякарню да Нэлі выспеў у яго нечакана, калі было ўжо добра апоўдні. Адзіным, што замінала тае ж хвіліны сесці ў аўто, быў сумнеў, ці мінуўся ў жонкі пазаўчарашні прыступ, пра які надоечы паведаміў па тэлефоне доктар. І як не, то ці не здарыцца так, як аднойчы здарылася, калі размова між імі нагадвала дыялог двух глушнёў, а напрыканцы яна ні з таго ні з сяго ўпершыню згадала раптам пра Тамару. Адчуванне прыкрасці тым разам так доўга потым кваліла яго, што ён некалькі тыдняў не наважваўся паехаць да Нэлі зноў. Але, можа, зараз усё будзе іначай? Зрэшты, можна патэлефанаваць загадзя доктару, даведацца, як яна сябе адчувае.

А яшчэ яго турбавала, ці дайшло да Нэлі што-небудзь пра дачку. Ведама, свет цесны, ледзь здарыцца што, як усе пра тое ведаюць. Канечне, рана або позна і ёй увядзе ўсё ў вушы які-небудзь зычлівец. Хай сабе, абы не зараз. Чым пазней дойдзе да яе навіна, тым лепш будзе і ёй, і яму. Цяпер жа, калі зявілася, хоць і зусім кволая, надзея на ацаленне, лішні стрэс ім зусім недарэчы.

Ён набраў нумар доктара, злуючыся на гарачыню, якую адчуў толькі зараз, і ўключыўшы кандыцыянер, што вокамгненна напоўніў пакой шапаткім пошумам, прыклаў слухаўку да вуха. Доктар здзіўлена алёкнуў два разы, хутка-хутка забалбатаў пра крызу, што, здаецца, дзякаваць Богу, учора мінулася, пра непярэліўкі з лекамі, пра нейкую нечаканую праверку, што вось ужо трэці дзень трасе ўстанову і яго асабіста, ды ён, на шчасце...

Што на шчасце – ён так і не зразумеў, але што Нэля адчувае сябе няблага, к канцу размовы ўсё ж дацеміўся.

Жонка захварэла раптоўна, як знарок – пасля адной іх сутычкі з-за нейкае драбязы (што Нэля ўжо тады ведала пра ягоную здраду, ён здагадаўся значна пазней). Драбязы – для яе, бо для яго дробязяў не існуе. Усё, чым жыве, чым дыхае сям'я, ніколі не з'яўлялася для яго драбязою. Многія тыцкалі гэтым у вочы, ды яму тое не абыходзіла. Рэпутацыя педанта яго не бянтэжыла і не палохала: хіба гэта блага, калі ведаеш дакладна, чаго хочаш, і патрабуеш гэткага ж ведання ад іншых?

Спачатку яму падалося, што ўся тая хваробіна – звычайная жаночая істэрыка. Але калі пабялелі Нэліны вочы і сліна раптам выступіла па куточках скусанага зубамі рота, ён спалохаўся. Выклікаў «хуткую», і тая адвезла Нэлю ў лякарню.

Хвароба працякала цяжка, суправаджалася правааламі памяці. Абсанс, або зблытанасць памяці – так сказаў доктар, і нічога іншага не заставалася, як яму паверыць. Нэля схуднела, была то занадта нервовая, то, наадварот, занадта апатычная. Апатычная зазвычай – калі памяць вярталася да яе, і тады Нэля была як Нэля – ранейшая ўсмешлівая кабета, якую ён ведаў ад юнацтва, разкаватая, але дасціпная, з адмысловаю інтуіцыяй.

Прасвятленні здараліся нячаста, але сёння быў, відаць, адзін з такіх выпадкаў. Гэта спадар Бортнік адразу зразумеў, як толькі ўбачыў жонку.

– Прывёз кепскую навіну? – спытала яна і акінула яго пранікл івым паглядам. – Так?

Пытанне заспела яго знянацку, і ён, збянтэжаны, моўчкі сеў побач з Нэляй.

– Не камплексуй занадта, – працягвала яна. – Я бачыла абвестку па тэлевізары... Праца па абвестцы – гэта вельмі кепска. Ты падказаў ёй такое? Гэта небяспечна, вельмі небяспечна. Ці мала на якога злыдуха можна ўзбіцца... Вунь колькі жанчын трапляе ў рабскае сіло! Ты павінен што-небудзь зрабіць. Скажы ёй, каб кінула гэтую справу. – Яна гаварыла лагічна і пераканаўча, але ўсё адно адчувалася – па ледзь улоўным трымценні голасу, – што і лагічнасць гэтая, і пераканаўчасць часовыя. – Чаму Ляруня не прыехала? Мінулы раз яна абяцала.

Думка, што яна нічога не ведае пра смерць дачкі, дадала яму гумору.

– Ты ж ведаеш, мы зараз рэдка бачымся, – сказаў ён першае, што прыйшло ў галаў.

– Яна твая дачка, не забывайся, – сказала Нэля дакорліва і паклала сваю руку на ягоную. – Твая і мая.

– Твая і мая, – падтакнуў ён і лагодна дадаў: – Наша.

Ягоныя словы неяк дзіўна паўздзейнічалі на Нэлю. Яна пазяхнула, пастарэчы ссутулілася і тут жа, упобачкі – галава на ягоным плячы, – заснула. А можа, адно ўдавала, што заснула? Бо як толькі ўвайшла медсястра, каб паклікаць яе на нейкую працэдуру, увобміг падхапілася, быццам усцешаная магчымасцю як хутчэй развітацца з ім, весела пашыбавала прэч.

– Калі не дачакаешся, крыўдаваць не буду, – сказала з усмехам, і ў голасе яе зноў, падалося яму, прагучала жаданне, каб так яно і сталася.

Ён пасядзеў у самоце некалькі хвілін на канапе, аглядаючы пакой. Просты, аж занадта для жанчыны гэткага складу, як Нэля, пакойчык цяпер, калі яна пайшла, выглядаў зусім пустым і непрытульным. І яму падумалася, што вось гэтак, напэўна, уявіцца ён чарговаму жыльцу, калі яе, Нэлю, выпішуць адсюль. Калі, вядома, наогул выпішуць: дэпрэсія – рэч непрадказальная. І яшчэ адно казытала свядомасць: чаму яна гэтак холадна з ім абышлася? Магла б і папрасіць дачакацца. Можа, знарок так зрабіла, каб прымусіць яго пахваляваца? Можа, сказаць ёй пра Леру, яна маці і мае права ведаць... Напэўна, гэта будзе правільна. Ці, можа, спачатку параіцца з доктарам, каб крый Бог не нарабіць бяды?

Ён выйшаў у калідор, стараючыся не звяртаць на сябе ўвагу хворых, што панура чакалі сваёй чаргі ля працэдурнага пакоя, пасунуўся да кабінета доктара.

Доктара на месцы не было. Ён патузаў для пэўнасці шыкоўную ручку дзверыны, што ніяк не пасавала да ўбогага калідорнага інтэр'еру, пайшоў далей. Людзі з чаргі, абуджаныя ягонымі няпэўнымі крокамі, паўздымалі галовы, нібы прыцэньваючыся, што за пацыент з яго будзе, зноў застылі ў здранцвелым чаканні.

Дзверы працэдурнага пакоя расчыніліся, і доктар, той самы, якога ён шукаў, выйшаў у калідор. Следам за ім выйшла Нэля. Ён памкнуўся да жонкі, каб загаварыць, але яна адхіснулася ад яго, мармычучы штосьці неўразумелае, кінулася наўцёкі. Вочы яе, чвэрць гадзіны таму лагодныя і ціхмяныя, адсвечвалі хваравітым бляскам, дыханне было перарывістае, няроўнае. Яна дабегла да пераходу ў другі, бальнічны адсек, не разлічыўшы хуткасці, моцна выцялася бокам аб выступ сцяны, павалілася на падлогу. Яны з доктарам паспяшаліся да яе, каб памагчы падняцца, але яна сама ўсхапілася, істэрычна закрычала:

– Не хачу! Не!

Медсястра, адзіная, хто, мусіць, даваў усім тут рады ў гэткія крытычныя моманты, выслізнула з пакоя побач, абхапіла няшчасную за плечы, павяла ў палату.

– Вам лепш пайсці, – прабачліва ўсміхнуўся доктар і нырнуў у дзверы следам за Нэляй і сястрой.

Чарга, узбуджаная на хвіліну надзвычайным здарэннем, праводзіла яго цікаўнымі і, як падалося яму (а можа, толькі падалося?), непрыхільнымі позіркамі.

У кватэры гуляў скразняк ад кандыцыянера, гэта ўзлавала яго. Пакінуць на гэтулькі часу нявыключаным прыбор – так і да жабрацтва можна дайсці, вунь колькі, пэўна, нашчоўкаў лічыльнік.

Хацелася піць. У лядоўні, аднак, нічога не аказалася, апроч «біфіды». Ён надрэзаў пакет, наліў пітва ў кубак, паставіў на пліту, каб сагрэлася. Затым перайшоў у спальню, машынальна ўключыў тэлевізар, утаропіўся вачмі ў экран.

Рэкламы, надзіва, сёння не было, і гэта супакоіла яго.

Затое даймала смага. Ён памкнуўся да дзвярэй, каб зноў пайсці ў кухню, як у гэты ж момант на экране з’явілася рэклама. Сплюшчаны між жаданнем спатоліць смагу і конча ўбачыць, што далей будзе ў тэлевізары, спадар Бортнік уладкаваўся на канапе, не зважаючы на гарачыню, што запанавала ў пакоі, як толькі ён выключыў кандыцыянер, пачаў пільна ўзірацца ў неахайныя, падобныя адзін да аднаго тэксты абвестак.

Але ўсё было не тое, чаго ён употайкі чакаў. І толькі калі ён ужо амаль прыснуў, скурчыўшыся ў куце канапы, штосьці падобнае да ўчарашняга роліка мільгнула ўрэшце на экране, разанула па вачах аляпістасцю літарын.

Ён страпянуўся ўсім целам, развінаючы рукамі згароду з літарын і лічбаў, што чапляліся за вопратку і дзерлі скуру, з асалодаю рынуўся наперад, да моста, з адчайным жаданнем пачуць, нарэшце, знаёмыя крокі.

Жанчына імкліва спусцілася да моста, хаваючы твар у каўнер паліто на, збочыла ў хмыз, прыхінулася плячмі да камля вербалозіны.

«Тамара!»

Тонкая рука, гэтым разам, аднак, не Тамарына, а Ірыніна (ён пазнаў яе па бранзалеце) высунулася з хмызу, павабіла яго да сябе.

«Ірына!» – гукнуў ён і стрымгалоў рынуўся бегчы да таго берага. Але не паспеў дамчацца і да сярэдзіны, як мост незадаволена рыпнуў, нібы наўмысна хочучы перашкодзіць дапяць да дзяўчыны, выгнуўся вужакаю, шпурнуў яго вобзем.

Ёлкі густы смурод, няведама скуль узяўшыся, ахінуў ягонае цела, палез жывасілам у вочы, нос, скуру. Ён дацягнуўся далонямі да бліжэйшае прэнціны парапета, праз сілу падняўся…

У пакоі было шэра ад дыму.

Ён падхапіўся з канапы, ачмурэлы ад смуроду, хіснуўся ў кухню. Вобмацкам (нічога не бачна было за дымам) выключыў пліту, сашмаргнуў з газоўкі ў мыйку абгарэлы кубак, кінуўся расчыняць фортку. Вецер уварваўся ў памяшканне, вольна пагойсаў па падстоллі, пазбіваў дым у ірваныя клубы, загуляў па нагах.

Усё яшчэ хацелася піць.

Спадар Бортнік набраў з крана ў шклянку вады, колькімі глыткамі асушыў яе да дна. Затым прычыніў, каб не напусціць у кватэру сцюжы, фортку, вярнуўся ў спальню.

Рэклама ўсё яшчэ ішла на экране, але даччынай і Ірынінай абвесткі спаміж іншых не было. «Дзякаваць Богу», – падумаў ён і зноў скурчыўся на канапе. Літары, дражнячыся, з яшчэ большым імпэтам замільгацелі на экране.

Крок, яшчэ крок, яшчэ…

«Пэўна, тыя двое», – падумаў ён і азірнуўся.

На сцежцы, што вілася ад пагорка да моста, не было ані душы.

Ён зноў азірнуўся – цяпер ужо туды, дзе мінулым разам бачыў Леру.

Дачка стаяла на мосце, выпрастаўшы рукі, адчужана, без ценю страху на твары глядзела на дзве мужчынскія постаці, што таропка спускаліся да ракі ад трамвайнага прыпынку.

KAMUNIKAT.org

## МЫЙШЧЫК ЛЁХА

Каталка рыпнула, гайданулася на няроўнай, з нахілам да сцёкавай адтуліны падлозе, спынілася пасярод пакоя. Санітары адпіхнулі яе ў кут, каб не перашкаджала, знялі цела, пераклалі на стол для мыцця.

– Патапаўна, папаўненне!

Патапаўна, сапучы, праціснулася з падсобкі ў памяшканне.

– Ну, вось, затарыліся пад завязку, – сказала і па-гаспадарску акінула паглядам сталы з нябожчыкамі. Па яе задаволенай, з хітраватым прыжмурам усмешцы няцяжка было здагадацца, што перамовы са сваяком новенькай прайшлі ўдала. Яна счакала, калі пойдуць санітары, павабіла Лёху да сябе, торкнула ў руку дзве тысячныя купюры.

– Апаласнеш кабеціну, – загадала коратка, здымаючы халат. – Мне ў сталоўку бегчы. У тры змена пачынаецца, дык не спазніцца. – І, пакінуўшы напарніка сам-насам з чатырма мерцвякамі, хуценька выпхнулася за дзверы.

Звыклы да такіх яе дачасных зыходаў Лёха ўздзеў шланг на нос крана, узяўся рэгуляваць ваду. Рэгуляваў і дакараў сябе за залішнюю службістасць: можна б і інакш было, як тая ж Патапаўна. Абліе труп збольшага сцюдзёнай, абцярэ рушнікам – і гатова. Затое і ў сталоўцы паспявае падрабіць, і яшчэ недзе.

Дзверы з падсобкі ціха расчыніліся.

– Ну, дала? Колькі? – Вартаўнік Федзька, пачухваючы раз-пораз віхрастую па-юначы галаву, стаяў у праёме і хціва ўсміхаўся.

– Колькі трэба! – нечакана для самога сябе зазлаваў Лёха. – Табе справа!

– Справа! – ускіпеў Федзька. – Забыўся, колькі я табе дабра зрабіў?

Лёха прымірэнча махнуў рукою. Сапраўды, на Федзькаву незычлівасць ці абыякавасць наракаць не выпадала. Каб не ён, і сёння, пэўна, сядзеў бы без працы.

– Дзве тысячы дала.

– Дзве ўсяго? Гэтак мала? Дурыць цябе Патапіха, а ты маўчыш. Ды дзвюх і на добрую «бомбу» не хопіць.

– Дакладзеш, нічога.

Лёха прысунуў да стала тазік з анучамі, удаючы, быццам вельмі заняты, павярнуўся да вартаўніка спінаю. Той мацюкнуўся, знік у падсобцы.

Лёха скіраваў канец шланга на нябожчыцу, пачаў акуратна паліваць твар, шыю, жывот.

Цяперашнюю сваю працу ён не сказаць каб шанаваў, але выконваць стараўся сумленна. Прыдалася навука бацькавай маці, для якой кепска памыць нябожчыка было не меншым грахом, як украсці. Хоць праца мыйшчыка, вядома ж, не з прыемных і лёгкіх. Іншым разам вунь як намітрэнжышся, пакуль распранеш мерцвяка. Цела калянае, неслухмянае, хоць ты яго распарвай варам. Днямі прывезлі аднаго са скукожанаю нагой. Штаны вузкія, ні туды ні сюды, давялося разразаць калашыны нажніцамі. Найлягчэйшае – макіяж рабіць. Гэта куды прасцей, хаця сваякам і цяжка дагадзіць. Тое ім не так, гэта не гэтак. Але затое і без прываркУ не застанешся. Выпадаюць дні, што і дзесятку тых «левых» ухопіш. Зрэшты, як прыходзяць лёгка тыя грошы, так лёгка і сплываюць. Асабліва, калі жывеш упобачкі з

гэткім валацугам, як Федзька. Абы шархнула ў кішэні, як нацягне немаведама скуль крыклівых, з ababітымі тварамі баб, і пачынаецца вэрхал. Дайшло да таго, што на мінулым тыдні сцягнулі і прадалі ўпотайкі нейкай цётцы адзіны ягоны, Лёхаў, касцюм.

Далей трэба было перавярнуць цела на жывот. Лёха адклаў убок шланг, пасунуўся да дзвярэй падсобкі.

Замест Федзькі за сталом сядзеў мужчына і энергічна назвоньваў па мабільніку. Убачыў Лёху, порстка падхапіўся з зэдля.

– Вы мыйшчык?

– Я.

– Там сваячку маю прывезлі, дык глядзіце, каб акуратна ўсё... Я разлічыўся з вашаю начальніцай. Яна тут?

– Пайшла ўжо.

– Пайшла? – абурана выгукнуў мужчына. – Як гэта?

– А вось так, – не тлумачачы нічога, сказаў Лёха. – Пайшла і ўсё.

Мужчына крактануў, дастаў з кішэні пінжака партманет.

– Наце вам пятак і зрабіце ўсё як трэба, – сказаў і ўвайшоў следам за Лёхам у трупярню. Убачыў аголенае сваяччына цела, хіснуўся да яго. – Забіраць будзем заўтра. У нас вельмі вузкі лесвічны пралёт, а кватэра на дзесятым паверсе, дык няхай тут паляжыць. Вы ўжо мыеце?

– А хіба не бачна? – Лёха з абыякавым выглядам паклаў грошы ў кішэню. – Памажыце мне перавярнуць.

– Я? – ніякавата ўсміхнуўся мужчына. – Вы што – адзін тут?

– Як бачыце.

Яны асцярожна: Лёха за перадплеччы, мужчына за ногі – перавярнулі нябожчыцу на жывот. Мужчына пабыў яшчэ колькі хвілін і пайшоў.

Абмыўшы жанчыне спіну, Лёха зноў паспрабаваў перавярнуць яе. Гэта было няпроста, давялося аднвчасова прытрымліваць кабеціну за плечы і за ногі, так што атрымаліся амаль што абдоймы.

Цяпер заставалася яшчэ адно – апрануць. Бялізна і сукенка віселі на вешаку пры ўваходзе. Лёха прасунуў нябожчыцы пад паясніцу валік, прыўзняў ногі ўгару.

Цэтлік саслізнуў з пальца жанчыны, дзінкнуў аб цэмент. Лёха падняў яго, і сэрца ягонае зайшлося хваляваннем.

«Крэнць З.П.» Зоя? Ці магчыма такое?

Ён колькі хвілін узіраўся ў твар нябожчыцы, але дарэмна: зменены перадсмяротнымі пакутамі, ён і блізка не нагадваў Зоін. Затым ён адхінуў убок прасціну, глянуў на нагу ніжэй калена.

Цела яшчэ як след не абсохла, кропелькі вады сям і там блішчэлі на скуры, але рубец на стыку сустава і лыткі быў бачны добра. Яна ўсё-ткі, Зоя!

Яны пазнаёміліся на дні нараджэння ў ягонай стрыечнай сястры. Лёха толькі-толькі адслужыў у войску, прыехаў у горад са сваіх забытых Богам Стайкоў шукаць лепшага жыцця. Зоя рабіла масавічкай у мясакамбінатаўскім прафілакторыі. Знаёмства хутка перарасло ў сяброўства, і праз паўгода яны ажаніліся. Зоя ўладкавала Лёху кіроўцам на мясакамбінат, развозіць па крамах прадукцыю. Праца была цяжкая, але прыбытковая. Акурат перад тым пачалася перабудовачная неразбярыха, і цягнулі ўсё, што кепска ляжала. Вельмі хутка і Лёха ўвайшоў у смак. Праз два гады Крэнцы, якія дагэтуль жылі

ў ведамаснай маласямейцы, купілі трохпакаёвую кватэру. Кола іх знаёмстваў шырылася, жыццё біла фантанам. Хаджэнні ў госці, шашлыкі з сябрамі пад добрае віно на беразе возера сталі гэткаю ж неад'емнаю часткай іхняга побыту, як сон ці глядзенне тэлесерыялаў. Лёха ўсё часцей прыходзіў дахаты нападпітку. Але Зоя на тое не зважала: ці мала якая можа быць у мужчыны нагода, каб выпіць. І толькі калі пачалі даходзіць чуткі, што ў мужа з'явілася палюбоўніца, яна не стрывала, вырашыла пагаварыць з Лёхам. Неўзабаве пасля той размовы Лёху арыштавалі за крадзеж і пасадзілі на тры гады. Увесь тэрмін зняволення Зоя рэгулярна наведвала яго ў турме. Вызваліўся ён праз два гады, па амністыі. Але зноў на мясакамбінат дарога была закрыта, і ён уладкаваўся каменшчыкам у брыгаду, што ездзіла на шабашку ў Расію. Там заробкі былі не горшыя, як на мясакамбінаце, але ж і вольнае ад штодзённых сямейных клопатаў жыццё рабіла сваю чорную справу. Скончылася тым, што з брыгады яго папрасілі. Лёха вярнуўся дахаты і неўзабаве спіўся дарэшты. Якраз к гэтаму часу Зоя зацяжарала. Аднаго разу, вярнуўшыся апоўначы з чарговай пагулянкі, ён у адказ на жончыны ўшчуванні пырнуў яе сп'яну нажом. Зоя, баючыся, што яго зноў пасадзяць, заяўляць нікуды не стала. Рану на назе залячылі, але стрэс быў занадта моцны, і здарыўся выкідыш. Тады Зоя і падала на развод. Яны разышліся. Жонка пераехала ў двухпакаёўку, яму дастаўся пакойчык на ўскрайку горада побач з бальніцаю. Халасцяцкае жытло бы магнітам прыцягвала розны люмпенізаваны люд і вельмі хутка ператварылася ў прытон. Увесь гэты час Лёха перабіваўся выпадковымі заробкамі на складах. Так працягвалася чатыры гады. Напрыканцы мінулага лета Лёху на паўтара месяца знерухоміў інсульт. Хвароба, на шчасце, аказалася не смяротнай, але задумацца пра жыццё прымусіла. Бацькі паўміралі, ні на якую староннюю дапамогу разлічваць не выпадала, і Лёха пачаў шукаць працу. Тут і прыдалася дапамога суседа Федзькі, які звёў яго з Патапаўнай. Так Лёха трапіў у трупярню.

Зоя! Няўжо гэта яна?

Зжаўцелы, худы – скура ды косці – твар пазнаць было немагчыма. Нядзіўна, рак робіць сваю справу адмыслова. Што жанчына памерла з гэтай хваробы, было несумненна. За год працы ў трупярні Лёха навучыўся вызначаць захворванне не горш за якога лекара.

Федзька зноў усунуў кудлатую галаву ў дзверы.

– Хутка ты? – спытаў нецярпліва. – Крама зачыніцца.

– Паспеем. – Лёха прыкрыў цела прасцінаю, пайшоў да крана мыць рукі.

Ля крамы было нешматлюдна. Дзве жанчыны, абедзве ў пакамечаных спартовых касцюмах і пакаёвых тапках, зыркліва пацікоўваючы за Лёхавай даланёю з грашыма, тут жа прыстрагаваліся да яго ў чаргу.

Ён купіў дзве бутэлькі таннага віна, аддаў Федзьку. Той з задаволеным выглядам сунуў пляшкі па кішэнях шырачэзных, з абтрапанымі калашынамі штаноў. Жанчыны, не адступаючы ні на крок, моўчкі пасунуліся за ім.

– А ты што не ідзеш?

Лёха ў нерашучасці застыў пасярод ходніка.

– Мне не выпадае сягоння.

– Яму не выпадае! – віснучы ў Федзькі на плячы, завішчала адна з жанчын.

– Глядзі ж, каб не пашкадаваў пасля, – здзіўлены нязвыклымі паводзінамі сябрука, сказаў Федзька і папраставаў да бліжэйшага сквера.

Лёха счакаў, пакуль яны адыдуцца, хіснуўся да кабеты, што гандлявала кветкамі побач з газетным шапікам.

– Колькі каштуюць? – спытаў, дастаючы з кішэні прыхаваны пятак.

– Пяцьсот адна, – адказала гандлярка. – На што вам?

– На пахаванне.

– Тады вось гэтыя бярыце, якраз чатыры засталіся. – Яна выняла з вядзерца чатыры гваздзікі, загарнула ў цэлафаніну. – Дзве тысячы з вас.

Лёха вярнуўся ў трупярню, паставіў гваздзікі ў Патапаўніну бутэльку з-пад малака, зноў вярнуўся на вуліцу.

Крама яшчэ працавала. Ён купіў сёе-тое з ежы і бутэльку віна, унікаючы месцаў, дзе маглі прышыніцца Федзька з кабетамі, пасунуўся дахаты.

Голая, з абдзёртымі бруднымі сценамі кватэра непрыветна патыхнула насустрач пахам цвілі і нямытага рыззя. Патурбаваныя крокамі, незадаволена рыпнулі зацярушаныя табакай і шматгадовым друзам маснічыны падлогі. Старэнькі тэлевізар, адзіная больш-менш прыстойная рэч у кватэры, самотна бліснуў з кута пацямнелым ад пылу экранам. Лёха памкнуўся да яго, каб уключыць, але перадумаў: раптам дзе блізка Федзька з тымі бамжыхамі, угледзяць, што дома, – не адчэпішся.

Бачыць жа нікога не хацелася, думкі ўвесь час круціліся вакол Зоі. Як цудоўна яны некалі жылі, як шмат мелі ўсяго, аж не верыцца. Цяпер, здаецца, што б не аддаў, каб толькі вярнуць тыя дні, гадзіны, хвіліны. Дык не, не вернеш нічога. Добрае нельга вярнуць – можна толькі ўтрымаць, пакуль яно ў руках. Ён свайго ўтрымаць не здолеў, і каго зараз у тым вінаваціць, апроч сябе? Кветкі купіў... А хто яму купіць, як памрэ? Не мыйшчык жа чужаніца, што заступіць на ягонае месца. Зоя – вось адзіны чалавек, хто мог бы. Але яе няма ўжо, а другая наўрад з'явіцца. Як неразумна, як па-дурному ўсё атрымалася. Собіла яму тады з тым нажом заюшыцца.

Ён наліў у шклянку (чаркі даўно пазносілі кудысьці Федзькавы бабы) «чарніла», залпам выпіў.

І адразу нібыта і адпусціла. Ат, што думаць: будзе як будзе. А што было, таго не вернеш.

Ён дапіў віно, не распранаючыся, кульнуўся на ложак.

Калі ўранку ён прыйшоў у трупярню, там ужо кіпела праца. Патапаўна, ссунуўшы дзеля эканоміі часу сталы з нябожчыкамі адзін да аднаго, палівала адразу дваіх зімнаю вадой. Стол, на якім надоечы ляжала Зоя, быў пусты. Прывялыя гваздзікі бездапаможнаю грудкай ляжалі на падваконні.

– Ты маю бутэльку заняў? – заціскаючы канец шланга пальцам, спытала незадаволена Патапаўна. – Надумаўся! Кралю раненька забралі, сваяк прыязджаў. – І, адняўшы палец, дадала пад пошум вады: – Сёння мне раней у сталоўку, дык калі падвязуць каго, – спарадкуеш сам. Грошы вунь, на зэдлі.

– Добра. – Лёха ўзяў грошы, нягучна свіснуў.

Федзька высунуў з падсобкі галаву, запытальна міргнуў чырвонымі з учарашняга бадуна вачыма.

– Што?

– На, збегай, – аддаючы яму цішком ад Патапаўны тры тысячы, сказаў Лёха. – Яна хутка пойдзе, дык памянём небаракаў. Ды лепшага купі, не абы-якога.

– Лепшага? На тры тысячы?

– На яшчэ. – Лёха дастаў з кішэні рэшту. – Лепшага, чуеш? Адзін раз паміраем.

– Так кажаш, быццам сам сябе хаваеш.

– Не сябе... сваячку, – сказаў ён і тут жа сціх: у душы шмат чаго было, але пускаць туды старонняга, хай сабе і дружбака, не хацелася.

– Вось што – сваячку! – ажывіўся Федзька. – А то глядзім: кветкі. Ну, справы! То на хаўтуры схадзі, паясі хоць толкам.

– На хаўтуры! А ты касцюм мне адкупіў, каб было ў чым пайсці? Га? Чамчыла!

Лёха апрануў халат, спатыкаючыся аб тазікі, пайшоў дапамагаць Патапаўне пераварочваць чарговага нябожчыка.

Яму ўсё яшчэ было кепска, але ўжо не так, як звечара. Расслабляла, адцягвала ад панылых думак прысутнасць людзей. Ды і ўпэўненасць, што які ні паскуднік Федзька, а грошай ніколі не прысабечыць, а наадварот, яшчэ і дакладзе сваіх, як мае, на сабантуй, дадавала гумору.

## ВЕЦЕР, ВЕЦЕР...

**1**

Маці высунула галаву з кухні, злым – быццам варам абліла – паглядам зіркнула на яго.

– Выспаўся, боўдзіла? – сказала і зайшлася кашлем. – Першая гадзіна... Толькі б еў ды спаў, і больш нічога. Абутак і той я павінна сушыць! Няўжо так цяжка выняць звечара з чаравікаў вусцілкі ды пакласці іх на батарэю? Хоць бы жаніўся, ці што... .Як мне ўсё гэта абрыдла!

– Як і мне твая звяга, – сказаў ён і зняў з вешака паліто. Узяўся апранацца, але яна перабаразніла:

– Што ў кішэні? Зноў што-небудзь сцягнуў?

Яна памкнулася памацаць кішэню паліто, але ён грубым жэстам адпіхнуў яе ў кут.

– Перастань!

– Ну, ладна, – бачачы, як загараюцца нядобрым бляскам сынавы вочы, саступіла яна.– Бульбы прынёс са склепа? Учора яшчэ прасіла...

– Сама прынясеш, – буркуў ён і ўзяўся за ручку дзвярэй.

– Куды ж гэта?

– Па нявестку табе. Чакае ў двары, во і прывяду. Каб атруты якой табе падсыпала, каб скапыцілася ты хутчэй.

– То ж хоць талковую вядзі, а не такую, як сам, дурніцу! – не вытрымаўшы абразы, усхапілася яна. – А то і атруціць як след не здолее. Ці, лепей яшчэ, – распусніцу якую прывалачы, іх поўна зараз усюды.

– Без цябе разбяруся, – абыякава – што карысці бясконца спрачацца! – сказаў ён і пайшоў на пляцоўку.

Настрой быў паганы, але з гэткаю заюшліваю маткай, як ягоная, хіба ён можа быць іншы? Во праўда, прывесці якую лярву – хай бы паспытала шчасця. Пра тое ён ужо падумаў, спускаючыся ад ліфта да выхаду.

Вецер, скавычучы, уварваўся ў праём дзвярэй, абдаў ногі сцюжаю. Ён сышоў на ганак, хаваючы твар у каўнер паліто, пасунуўся да новага, з месяц таму заселенага шматпавярховіка, што чырванеў тарцом ля крамы ў другім канцы мікрараёна.

Дзяўчына выйшла з крамы, няспешна наблізілася да пад’езда. Яе чырвоная шапачка на тле чысцюткага (апоўдні толькі выпаў) снегу, тут, сярод падобных адзін да аднаго дамоў, выдавала яшчэ больш яркай, чым заўчора. Сэрца ягонае забілася хутчэй. Нават занадта хутка, бо, калі ён ступіў следам за дзяўчынаю на ганак, ледзь даў рады суняць дрыжыкі.

– Вецер, вецер – на ўсім Божым свеце, – не зважаючы на яго, раптам прадэкламавала яна і набрала код кватэры.

– Ты, Алеська? – азваўся з кватэры жаночы голас.

– Я.

Дзверы адчыніліся.

Дзесятак метраў да ліфта ён прайшоў моўчкі следам за плецаком у выглядзе мядзведзя-каалы, і толькі калі яна спынілася і незнарок шмарганула яго па

шчацэ, здымаючы на хаду з шыі, рогам чырвонага, пад колер шапачкі, шаліка, страпянуўся, спытаў:

– Вершы чытаеце?

– Паэму вывучаем у школе, дык засеў у галаве кавалак, – адказала яна і ветліва, як сталаму знаёмцу, усміхнулася. Затым вызваліла з іспадчыны руку, безуважным жэстам націснула кнопку ліфта.

Наверсе зашумела: кабіна зрушылася з месца, паклацваючы тросам, пасунулася долу.

– Шмат задаюць у школе? – зноў спытаў ён.

Вусны яе стуліліся ў капрызлівай грымасе.

– Яшчэ як шмат!

– Але ж на дыскатэкі, пэўна, ходзіце?

– Хадзіла, у восьмым класе. – Яна ўздыхнула, удаючы сум, што маладосць, маўляў, гэтак хутка прамінула, прыхінулася галавою да сцяны. Шапачка на яе галаве з'ехала набок – гэта надало тварыку дзяўчыны свавольна-гарэзлівы, крыху нават гуллівы выгляд.

Дзверы ліфта рэзка расчыніліся.

Дрыжыкі ў целе, і асабліва ў руках, зрабіліся зусім невыноснымі.

– Табе, здаецца, на шосты? – імкнучыся суняць іх і нечакана для самога сябе пераходзячы на «ты», сказаў ён і націснуў апошнюю, дзесятага паверха, кнопку.

– Мне на шосты! Што вы робіце?– абурана выгукнула яна і памкнулася рукою да шчытка з кнопкамі.

Ён перахапіў руку, моцна сціснуў у запясці. Затым выхапіў з кішэні нож, прыставіў дзяўчыне да горла.

– Вы што?.. – з выразам жаху на твары адхіснулася яна.

– Ціха! Маўчы!

Яна суцішылася, баючыся падняць вочы, спалохана завадзіла паглядам з кнопкі на кнопку. Ён тузануў яе да сябе, груба абхапіў наўскос за плечы.

Ліфт спыніўся, дзверы расчыніліся – так гучна, што ён нават уздрыгнуў. Яна, адчуўшы, мусіць, ягоны сполах, зрабіла спробу вырвацца, але дарэмна: сілы былі няроўныя.

У пад'ездзе не чутно было ні гуку, і гэта дадало яму рашучасці. Ён вывернуў руку дзяўчыны за спіну, па-ранейшаму трымаючы нож ля шыі, пацягнуў да дзвярэй на гарышча. Нагою адчыніў іх, штурхнуў ахвяру ў вузкі, прыцемнены праём. Яна зачапілася плецаком за выступ вушака, і ён груба, ажно яна енкнула ад болю, пхнуў яе наперад. Затым прыціснуў да сцяны, пачаў сцягваць вопратку. Яна колькі хвілін супраціўлялася, і даволі рашуча, але раптам аціхла.

– Я… я сама, – сказала асіплым голасам, і яму пачулася ў голасе яе пажада. Гэта да такой ступені яму не спадабалася, што ён на імгненне адпусціў дзяўчыну.

– Што?

– Я сама, – паўтарыла яна і зняла паліто разам з плецаком.

Ён кінуўся зноў да яе, нібыта таксама згараючы ад пажады, але замест таго каб працягваць распранаць, раптам пачаў душыць.

– Я табе зараз, гадзіна!

Дзяўчына ўтуліла галаву ў плечы, не даючы яму як след укіпцюрыцца ў горла, учапілася абедзвюма рукамі ў пояс штаноў. Тканіна шорхнула, бы

ірвучыся, штосьці гучна дзвэнькнула аб сцяну. Ён адарваў руку дзяўчыны ад пояса, моцным штуршком паваліў абмяклае цела на дошкі збоч праёма.

Ад бліжэйшае да гарышча кватэры данесліся галасы. Хтосьці падымаўся да іх, і ён шчыльней прыклаў нож да шыі дзяўчыны. Дотык ляза канчаткова яе суцішыў.

– Але ж ветрадуй! – прагучаў зусім блізка незадаволены жаночы голас. – Дзе тут цёпла будзе, калі ўсё кругом насцеж...

Жанчына зачыніла дзверы гарышча, мармычучы штосьці, пайшла прэч.

Ён счакаў, пакуль грымне, зачыняючыся, ліфт, прыслухаўся, ці не няма яшчэ каго побач. Было ціха. Так ціха, што чутно было дыханне дзяўчыны пад ім. Трэба было нейкім чынам скончаць пачатае. Але як?

Ён ірвануў да сябе шалік, перацягнуў яго пад шыяй дзяўчыны. Яна, здагадаўшыся пра ягоны намер, штосілы ўчапілася ў матэрыю абедзвюма рукамі, паспрабавала пазбавіцца смяртэльных абдоймаў.

Але было запозна. Шалік змяёй абвіўся вакол шыі той, каго неаднойчы ратаваў ад сцюжы ў марозны дзень, адбіраючы дыханне, мёртваю пелькай сціснуў ёй горла.

– Вярнуўся! – Маці выйшла ў калідор, няўхвальна хітнула галавой. – Сапеш, бы старэча. Наслядзіў во ботамі... Дзе ж краля, якую абяцаўся прывесці?

– Мама, не заводзься, чуеш? – злосна сказаў ён і пасунуўся ў свой пакой.

Снег біўся ў вакно, ляпіўся буйнымі камякамі да бруднай, прызанавешанай стракатаю фіранкай шыбіны, паўз якую цьмяна вымалёўваўся ўдалечыні пакурочаны будаўнікамі відарыс прылеглага да мікрараёна парка.

Ён падышоў да вакна, зірнуў на дол паўз снежную завесу. Затым прыклаў далонь да шкла, бязгучна засмяяўся.

Як там яна дэкламавала?

«Вецер, вецер – на ўсім белым свеце...»

– Што ты вярзеш, дурань? Які табе вецер? – Маці стаяла ў дзвярах і круціла пальцам ля скроні. – Зусім звар'яцеў... Дваццаць сем гадоў чалавеку...

– Ці сціхнеш ты калі? – Ён схапіў з канапы падушку, шпурнуў у маці. – Як мне ўсё гэта надакучыла! – Вярнуўся да вакна, не помнячы сябе ад злосці, адчыніў яго насцеж. – Вось, вось жа табе вецер! Глытай!

Калючы студзеньскі вецер уварваўся ў пакой, з нахабным перарывістым посвістам закружляў па кватэры.

**2**

– Доўга не хадзі, Нінуля. – Маці ўздыхнула, зірнула з перасцярогаю ў вакно. Пасля трагедыі месяц таму з малодшаю дачкою, Алесяй, гэта быў амаль што рытуал. – Шарэе, а паўсюль гэтулькі рознай дрэні. Сама разумееш... І з сумачкай! Навошта яна табе на дварэ? Прынадзіш катарага – не адаб'ешся потым...

– Ці мала што можа спатрэбіцца, – хаваючы падалей у чэрава сумкі нож, адказала яна. – Не хвалюйся. – Цмокнула маці ў шчаку, пайшла з кватэры.

Наўзбоч дома, ля горкі, купка дзяцей бавілася гульнёю ў снежкі. Побач, на тым самым месцы, дзе яны тры дні таму пазнаёміліся і дзе спаткаліся ўчора, стаяў Андрэй.

– А што ж сёння не дэкламуеце? – падыходзячы ззаду і пераадольваючы здрадлівую сухасць у роце, сказала яна і шчыльней прыціснула да сябе сумачку. – Дарэчы, што гэта быў за вершык?

– Зацікавіў вас? – спытаў ён і ўсміхнуўся. – Дзесьці пачуў, во і не выходзіць з галавы. Прашпацыруем? Учора вы абяцалі…

– Учора было куды цяплей, – сказала яна няпэўна. – Лепш дзе-небудзь пасядзець.

– Можна зноў у мяне, – павагаўшыся хвіліну, прапанаваў ён.

– А маці што скажа?

– Яе няма, усё яшчэ не вярнулася ад сястры. Так што ніхто нам замінаць не будзе.

– Добра.

– Але з умоваю: пойдзем, як і ўчора, паасобку.

– Вы ці не саромеецеся мяне?

– З чаго гэта?! – Яна засмяялася. – Прабачце, тут недалёка жыве мой сябар. Ён наўрад мяне зразумее, калі ўбачыць з вамі.

Цяпер засмяяўся ён:

– А-а, знаёмая гісторыя… Што ж, хай будзе па-вашаму.

Ён пайшоў, яна, счакаўшы, пакуль ён адыдзецца на прыстойную адлегласць, пасунулася следам.

Ля дома было амаль бязлюдна, толькі свяціліся, поўнячы двор жаўцізною, вокны кватэр.

– Мы як дэтэктывы з вамі, – пажартаваў ён і пайшоў першы ў пад’езд.

У кватэры было амаль гэтак жа холадна, як і на пляцоўцы – гэта яе здзівіла.

– Забыўся пазачыняць форткі, во і надзьмула сцюжы, – сказаў ён нібыта апраўдваючыся.

– Форткі! – перастарэкнула яна. – Вакно расчыненае!

– Не магу трываць гарачыні, – прызнаўся ён. – Люблю вецер. Маці злуецца – а па мне дык нічога лепшага няма. Так і паляцеў бы, здаецца... А вам вецер падабаецца?

– Не.

– Чаму?

– Не падабаецца, і ўсё.

– Зачыніць?

– Зачыніце.

Ён зачыніў вакно, вярнуўся да яе.

– А віно вам падабаецца?

Ягоная звычка паўтараць адно і тое яе раздражняла, але яна змоўчала.

– Вы ж ведаеце ўжо: падабаецца. Але сёння я хачу кавы.

– То я згатую.

– Калі ласка.

Ён пайшоў у кухню, яна ўладкавалася на канапе, міжволі пашукала вачмі штаны. Яны па-ранейшаму ляжалі на зэдлі збоч канапы.

Яна дастала з кішэні жакета знойдзены на месцы забойства Алеські і прыхаваны ад уніклівых вачэй следчага аплік, паднесла яго да шырынкі.

Колер апліка, форма яго, згібы – усё адпавядала зашчапцы на штанах. Што гэтак будзе, яна не сумнявалася, таму ні хвалявання асаблівага, ні ўзрушэння такое супадзенне ў яе не выклікала. Наадварот, дадало рашучасці давесці справу да канца.

Яна паднялася з канапы, выйшла ў калідор.
– Вы куды? – спытаў ён здзіўлена. – Уцякаеце?
– Выйду папалю, – пэўная, што ён падасца следам, адказала яна.
– Паліце ў кватэры.
– У кватэры не магу. Ніколі не палю ў кватэры.
– Фобія?
– Што ж зробіш. Бацька заўжды паліў у кватэры, вось і з’явілася.
– На пляцоўцы зімна, ускіньце паліто.
– Добра. – Яна апранула паліто, выйшла на пляцоўку. Паднялася да ўвахода на гарышча, дастала з сумачкі цыгарэту.
Ён падняўся следам за ёю, стаў побач.
– На гарышчы ёсць канапка, можна пасядзець, – прапанаваў, падаючы руку.
– Гэта тое, што трэба, – пагадзілася яна.
Ён праціснуўся ў праём, прывыкаючы да цемры, стаў наўзбоч увахода.
Яна дастала левую рукою з сумачкі аплік, другою сціснула дзяржальна нажа.
– У мяне сюрпрыз, – сказала і пасунулася да яго бліжэй.
– Што за ён?
– Заплюшчце вочы, – прашаптала яна і, як толькі ён выканаў загад, хуткім жэстам паднесла аплік да ягонага твару. – Вецер, вецер – на ўсім Божым свеце... Не на белым, нягоднік, – на Божым...
Ён памкнуўся адхіснуцца ад яе, але не паспеў. Лязо нажа, разразаючы матэрыю швэдра, увайшло ў плоць, захлынулася крывёю.

**3**

Дзімава рука саслізнула долу, дацягнулася да яе далоні. Дотык быў лёгкі і халодны, бы подых вятрыска са шчэлкі балконнай дзверыны.
– Дык ты згодная?
Яна безуважна зазірнула паўз ягонае плячо ў часопіс, што ён гартаў ужо амаль гадзіну, быццам упершыню бачачы і яго самога, і гэты чытаны-перачытаны часопіс, перасела з канапы на зэдаль. І сама прапанова пабрацца, і тое, як яна была зробленая, – неяк похапкам, спехам – надавалі падзеі адценне банальнае шараговасці. Не на такое яна, канечне ж, спадзявалася, не такога чакала.
– Табе ніколі не прыходзіла ў галаў думка, што кожнаму з нас найперш патрэбны чалавек, які ведаў бы пра нас усё?
– Як я пра цябе ведаю? – не адрываючыся ад чытання, спытаў ён.
– Баюся, ты і збольшага не ведаеш маіх таямніц.
– Тваіх таямніц? Адкуль яны ў цябе! – Дзіма падняўся, пасміхаючыся, пайшоў у калідор.
Яна таксама хацела падняцца, каб праводзіць яго, але не змагла: нейкая сіла быццам знарок працягвала трымаць яе на канапе.
– Дык да заўтра! Прыйду а восьмай.
– Да заўтра.
Ляпнулі, зачыняючыся, дзверы, шорхнула на сцяне насупраць ад дотыку скразняку шпалерына.
Маці ўвайшла ў пакой, села насупраць яе.

– Я ўсё думаю…
– Пра што, мама?
– Пра Алесю. Собіла нам пераехаць у гэтую кватэру… Сядзелі б у старой, і нічога б не здарылася… Як я тады не западозрыла нічога… Упусціла дзяўчыну ў пад’езд, а сама заснула… А тут, у колькіх метрах, яна гэтак пакутавала. Побач амаль… Ніколі, ніколі сабе не дарую!
– Не трэба, мама, не квялі душу. Не вернеш…
– Прабач. Што сказалі ў вышуку?
– Нічога новага. Распытвалі... Яшчэ адно забойства, забілі мужчыну… зарэзалі… Дык мяркуюць, што неяк звязанае з Алесьчыным.
– З Алесьчыным! – Маці схапілася за сэрца, апусцілася на канапу побач з ёю, сказала ціха, быццам баючыся, каб не пачуў хто старонні: – Аплік той, што на гарышчы ты знайшла... выкінь ты яго!
– Ужо выкінула.
– Дзякуй Богу! – Маці паднялася, трымаючыся адною рукой за сэрца, другою за галаву, пратэпала да вакна. – Вецер, вецер – на ўсім свеце…
–… на ўсім Божым свеце, – папраўіла яна і пайшла за маці следам. – Мам, я хачу сказаць табе…
– Сказаць? – Маці адарвала вочы ад шыбіны, за якоюваўсю вар’яцела апошняя перадвясновая завея, з пакутлівым уздыхам павярнулася да Ніны тварам. – Не трэба, я ўсё ведаю.
Пагляды іх спаткаліся, быццам у пошуку адхлання, павольна, як дзве кроплі вады, што ўрэшце змаглі агульную перашкоду, патанулі адно ў адным.

## ЗЛАЧЫНСТВА

## КАНЧЫТЫ ВАЙС

Ад самага рання Канчыта Вайс, пенсіянерка, а да нядаўняга часу адна з лепшых паляводак каапературыву «Бавоўна», што на Каліфоршчыне, была не ў гуморы. Спачатку свінчо сапсавала ёй настрой, вырваўшыся з загародкі і паблоціўшы чужыя, суседкі Прысцылы, грады. Затым прыцягнуўся нецвярозы Пітэр, лез смоллю, напраміліы Бог прасіў пахмяліцца. А калі яна адмовіла, – торкнуў раптам у вочы тым забытым, без малога трыццацігадовае даўніны саромным, пагражаў расказаць, як усё было, дачцэ яе Джэйн, што мелася днямі прыехаць з Нью-Ёрка памагаць матцы палоць буракі. Суседку яна ўлагодзіла вельмі хутка: паабяцала сплаціць шкоду гароднінай з новага ўраджаю. З Пітэрам жа – куды цяжэй, тут, адчувала, не тое што гароднінай, а і чым больш грунтоўным наўрад абыдзешся.

От і не ведаеш, адкуль заявіцца ліха! Адзіную мела яна, Канчыта, за цэлае жыццё прыгоду – тую ноч у закінутым цытрусніку, і глядзі во, каб не вылезла зараз усё бокам. Як у вочы дачцэ зірнуць? Дзяўчыне і так несалодка, каторы год нэндзіцца пасля няўдалага шлюбу ды разводу ў «картараўцы» без выгодаў на Манхэтэне, уласных клопатаў хапае ёй з каптуром, а тут пра матку яшчэ такое даведацца... А то яшчэ па суседзях пойдзе пагалоска! Нецвярозаму што? Ляпне ды і заваліцца спаць, а ты думай-мяркуй, як з тым усім расчэрпацца. Гад! Гвалтам, лічы, узяў-дамогся тады яе, а цяпер ёй жа і пагражае!

Хатнія клопаты, аднак, пакрысе прыглушылі адчуванне прыкрасці. А як ссутонілася на дварэ, і суцішылася ў загародцы пры хляве ўлагоджанае рэзгінамі свежага ахрап'я свінчо, і котка прыснуў на канапе пры нагах, і прыспеў няўзнак час серыялу, і наогул благое знікла кудысьці, быццам і не было яго. Канчыта ўключыла тэлевізар, пасунулася да стала, каб зручней было глядзець, утаропілася вачмі ў экран. Да пачатку кіна заставаліся хвіліны дзве. Апошнія кадры «Дабавоўнаў» сплылі пад бравурны марш у кут экрана, і знаёмая мелодыя-застаўка абвясціла пачатак чарговае серыі.

Аўдоля з Віктусяй, абедзве ў шыкоўных строях, пры макіяжы, працягвалі абмяркоўваць план удушэння Антука Кудзелі, які ў пазаўчарашняй серыі падманам спакусіў у загарадным асабняку Віктусіну пляменніцу Алеську, а перад тым украў у Аўдолінага палюбоўніка дыямент, падараваны ягонаму дзеду адною немкай шэсцьдзесят год таму за выратаванне дачкі падчас бамбёжкі Берліна. Аўдоля даводзіла, што лепей за ўсё зрабіць гэта ўначы, калі нягоднік уляжацца спаць. Віктуся, наадварот, трымалася думкі, што задушыць Антука трэба ўдзень, і менавіта зараз, пакуль не сышоў дахаты лёкай Юрась, бо тады ўсе падумаюць на яго, а яны застануцца па-за падазрэннем.

У сянёх ляпнулі дзверы, нехта ўвайшоў у калідор. Канчыта падхапілася з канапы, дробненька перабіраючы зварыкожанымі нагамі, хіснулася да ўваходу. Ля дзвярэй стаяў Пітэр, з нахабным усмехам на твары церабіў даланёй няголеную шчаку.

– Дык нальеш усё-ткі ці не? – сказаў лагодна і схіліў у пачціва-насмешлівым паклоне бляклую, нібы выцвілы дыванок, галаву, прыкрытую, няйначай, дзеля форсу збадзяным каўбойскім капелюшом.

– Трасцы табе! – зазлавала яна і схапіла пачапельнік. – Ідзі, адкуль прыйшоў!

Пітэра, аднак, пагроза не напалохала.

– А конча табе, Конча, лаяцца? – сказаў ён і палез рукою ў кішэню. – Гэта бачыла?

Невялічкі, дыяметрам з залатую завушнічыну ў дагледжаным Аўдоліным вуху прадмет бліснуў на яго шырокай, як рыдлёўка, далоні.

– Гузік? – усміхнулася яна і махнула абыякава рукай. – От дзіва!

– А ты як след паглядзі. Паглядзі-паглядзі… Ну, што?

– Мой гузік! – ахнула яна і працягнула руку, каб схапіць яго. – Аддай!

– Не аддам, – сказаў Пітэр і схаваў гузік назад у кішэню. – Покуль не нальеш віскі.

– А як не налью, то што?

– Тады… Тады Джэйн усё раскажу, як абяцаў. Хай ведае пра матку, якая была ў маладосці гулёна. І яшчэ сяму-таму ўвяду ў вушы…

– Бессаромны ты! – ледзь стрымліваючы гарачы свой індзейскі (бацька яе паходзіў з Мексікі і трапіў на Каліфоршчыну ў пошуках працы ў часе апошняй перабудовы) тэмперамент, зайшлася абурэннем Канчыта. – Ці я не адбівалася? Сіллю ўзяў, згвалціў лічы, гузік яшчэ прысабечыў, а цяпер торкаць будзеш!

– Ага, адбівалася, – пасміхнуўся здзекліва Пітэр. – А што ж не крычала тады? Не паскардзілася нікому? Атрэслася ды замуж хуценька за Фрэнка выскачыла. Вунь як я потым мучыўся-пакутаваў…

– Анягож, пакутаваў! Праз тыдзень па маіх заручынах з Рэйчал пабраўся! Мучыўся ён! Аддай гузік!

– Нальеш – аддам.

– А падавіся ты ім! Зусім ужо мазгі прапіў!

– Ну, дык што ж… Як так, то пайду. Калі надумаешся раптам палагаднець, – дагоніш. Ля вываратня пачакаю… Галава надта баліць, саснілася сягоння, што памру.

– Не першы раз паміраеш, – сказала Канчыта, не чакаючы, пакуль няпрошаны госць выйдзе ў сені, хіснулася зноў да тэлевізара.

Віктуся з Аўдоляю рыхтавалі напой, якім мелі намер падпаіць Антука перад забойствам. Падрыхтаваўшы зелле, яны вольна паселі ў фатэлі пры століку з шампанам ды чырвоным вінам і апетытнай закуссю, завялі гаману пра тое, ці дастаткова моцны ў Антука інтэлект, каб разгадаць іхні змысел. Падрабязнасці размовы Канчыта ледзь улоўлівала: перашкаджаў засяродзіцца напамін пра гузік.

Як не абшукалася пасля тае ночы, баючыся прызнацца матцы, што згубіла яго. Тры дні толькі і паспела пафарсіць перад сяброўкамі, і на табе – згубіла! Каб дрэнь якая, то, можа, і не так шкада было б, а то ж парцалянавы, бацькава сястра Эліс-Роза прывезла адмыслова для яе ажно з Кліўленда, выменяўшы ў тамтэйшага габрэя-старызніка шэсць штук на дзве шпулькі нітак. Тканіну для сукенкі фарбавалі пад іх колер, і сукенка атрымалася – шык, усёй акрузе на зайздрасць, дарма што не крамная. А зараз, зараз во як ёй выкручвацца? Гэта ж і праўда, крый Бог, ляпне п’янтос каму – сораму не абярэшся. Ды, як на тое, сама неяк аднаго разу расказала дачцэ пра той гузік,

не ўсё, канечне, без залішніх падрабязнасцей, але ж вось... вось табе і падстава, каб Джэйн дала веры Пітэру.

Ды каб хоць вартая была тая даўняя апоўначная валтузня ў цытрусніку гэткіх нерваў! Яна і адчуць нічога не паспела, так хутка ўсё скончылася. Сціснуў, шамэць-шамэць, і ўсё... Адзінае, што засталося, – пляма понізу падола, ледзьве адцерла назаўтра шкіпінарам.

Тым часам Аўдоля з Віктусяй прыступілі да ажыццяўлення страшнай задумы. Адна схавалася пры вакне за гардзінаю, другая пайшла клікаць Антука, каб прапанаваць таму выпіць.

Паднялася і яна, Канчыта. Слізганула вобмацкам (лямпачка заўчора яшчэ перагарэла, ды ўсё не выпадала за клопатамі пайсці ў краму па новую) у істопку, пакінуўшы прыадчыненай дзверыну, каб хоць крыху было бачна ў цемры, нацадзіла ў бутэльку з бутля віскі, панесла на двор.

Пітэр, як і абяцаўся, чакаў пры вываратню.

– На, лыга! – сказала Канчыта і падала яму, асцярожна трымаючы аберуч, каб не выпусціць няўрокам і не пабіць, бутэльку.

– Бачыш, а казала – трасцы! – пацвеліўся Пітэр і прагна адхлюбнуў з гарляка. – Слабаватае ж нешта.

– Мацнейшага іншы хто няхай нальe. Во што скажы мне: у цябе моцны інцялект?

– Інцялект? – перапытаў Пітэр. – Быццам сама не ведаеш! Цвёрды і моцны, як крэмень! Забылася?

– Цьфу на цябе! – плюнула Канчыта. – Ну, давай гузік!

– Гу-узік табе? – прагундосіў Пітэр і здзекліва хмыкнуў. – За гэткую слабізну? Ды і не такі шыкоўны, як твой гэты, больш каштуе за такую пляшку.

– Значыць, не аддасі?

– Не.

– Ну, глядзі... – Канчыта павярнулася спінаю да крыўдзіцеля, давячыся ад крыўды слязьмі і натыкаючыся штораз у цемры на каменне і асцюкаватыя круглякі ерыхонскае ружы, пад роспачнае екатанне каёта, што даносіўся аднекуль здалёк, папраставала дахаты. Было ёй кепска, затое цяпер яна ўжо дакладна ведала, што трэба рабіць, каб уратавацца ад Пітэравага зламысніцтва.

Аўдоля, лежачы на канапе побач з Антуком, угаворвала таго адпіць яшчэ хоць крыху з высознага, як падсвечнік, фужэра. Як толькі ён выпіў, з-за гардзіны выйшла Віктуся, рашуча ўздзела няшчаснаму на галаву цэлафанавы мяшэчак. Затым жанчыны завязалі мяшэчак на шыі ахвяры шпагацінай, прыбралі ў пакоі і зніклі.

«Як проста ўсё», – падумала Канчыта і, бы загіпнатызаваная толькі што ўбачаным на экране, хіснулася да шафы, дзе ляжалі, памятала, мяшэчкі і кавалкі цэлафана, што засталіся з пазапазалеташняй вясны, калі Тэд, былы зяць, збіраўся, ды так і не сабраўся зладзіць над загародкаю для індыкоў хоць які дашак. Выцягнула першы, што трапіў пад руку, абгледзела. Быў прыгожы, з срэбным паскам упоперак, але дзіравіаваты. Ды надта тым не прынялася: калі ўздзець цэлафаніну дзіркаю на патыліцу, усё адно не дасць лыга рады дыхаць. Затым выключыла тэлевізар, выйшла на двор, пасунулася ўздоўж плоту да вываратня. Ішла памалу, быццам нейкая таемная сіла тузала, не жадала пускаць, але як толькі яна запавольвала крок, тая ж самая сіла штурхала яе наперад.

Пітэр ляжаў на траве ля вываратня. Побач валялася пустая бутэлька з-пад віскі. Канчыта адкінула яе ў хмыз, нахінулася да Пітэравай галавы.

– Пітэр! Пі-ітэр!

Пітэр не адзываўся.

«Во нажлукціўся, – падумала яна і схілілася яшчэ ніжэй, каб пашнарыць у ягоных кішэнях. – Як так, то, можа, і цэлафан не спатрэбіцца».

Аднак гузіка ў кішэнях – ні ў абодвух пінжака, ні ў бакавых штаноў – не было. «Напэўна, у заднюю паклаў», – падумала Канчыта. Але, каб далезці ў заднюю кішэню, трэба было перавярнуць п’янага на жывот. Гэта было і нялёгка, і рызыкоўна да таго ж (раптам прачнецца), і яна вырашыла скончыць усё, як у тым фільме, адным махам. Разраўняла мяшэчак, прымеціўшыся, а затым заплюшчыўшы, каб не так страшна было ўсё тое рабіць, вочы, усцягнула яго Пітэру на галаву. Надзіва, ён нават не варухнуўся, нібыта быў ужо нежывы. «Як проста», – падумала зноў яна і апрометцю кінулася назад да хаты.

***

Прачнулася яна рана, а шостай. І адразу змікіціла: на дварэ нешта дзеецца. Вызірнула ў вакно і спалатнела ад страху: ля вываратня тоўпіліся людзі. Рэйчал галасіла, заломвала ў адчаі рукі ля «хуткай», дзе ляжаў ужо, мусібыць, Пітэр. Спачатку Канчыта хацела, каб не выклікаць падазрэння, пайсці туды, але пабаялася: раптам што не так зробіш ці скажаш і вытыркнецца няўрокам шатанскі ўчынак. «Не, лепш не рызыкаваць», – падумала і так і прасядзела ў хаце, адно выходзячы каб пакарміць свінчо ды індыкоў, да самага дня пахавання.

***

Дзень быў пахмуры, надзіва няцёплы для гэткае – стаяла сярэдзіна жніўня – пары. Канчыта сядзела перад тэлевізарам, чакала, калі з’явіцца на вуліцы пахавальная працэсія. Быў час серыялу, але глядзець яго не выпадала: раптам там што благое ў Віктусі ды Аўдолі, і перакінецца во тое благое на яе. Ды цікаўнасць перасіліла: уключыла-такі тэлевізар.

Віктуся і Аўдоля сядзелі перад дазнаўцам, удаючы нявіннасць, дзівіліся, адкуль на цэлафаніне, якою быў задушаны Антук, з’явіліся адбіткі іх пальцаў.

Канчыта сцялася ад жаху. Вось што – адбіткі, як яна пра тое раней не падумала! Пітэр, доктар казаў, памёр ад зліяння, ды ўсё адно, як знойдуць тую цэлафаніну, хоць сабе і дзіравую, з яе адбіткамі… Што ж рабіць?

З вуліцы пачуўся слабы гул, працэсія з труною паперадзе вымкнулася з завулка, пасунулася да яе хаты. Канчыта падхапілася, счакаўшы, пакуль катафалк зраўняецца з вокнамі, выскачыла на двор, незаўважна ўціснулася ў рэдзенькі – адны старыя – натоўп. І акурат апынулася побач з Рэйчал. Тая плакала і нават ледзь не страціла прытомнасць, глянуўшы на труну, але дала сабе рады, з воклічам «Індычаты ж някормленыя застануцца!» пайшла далей.

Тым часам працэсія дасунулася ўжо да вываратня. Канчыта скасіла вочы ўбок і знямела ад убачанага. Ля паркана, што аддзяляў бабаўнянікі ад вулкі, крокаў за дзесяць ад вываратня матляўся на асцюках ерыхонскае ружы той самы, з срэбным пасам упоперак, мяшэчак. Яна спынілася, удаючы млявасць, счакала, пакуль усе пройдуць, хіснулася назад, зняла мяшэчак, сунула ў кішэню. І, уздыхнуўшы з палёгкаю, зноў пабегла даганяць працэсію. Цяпер ёй ужо карцела як хутчэй даведацца, ці ў новых штанах у труне Пітэр, ці ў тых

самых, старых, з гузікам. Во ж каб у старых: закапаюць гузік разам з нябожчыкам – і ніхто аніколі не даведаецца ні пра даўнюю ганьбу яе, ні пра міжвольнае цяперашняе злачынства. Тады больш і думаць-хваляваецца не будзе ёй пра што, не тое што гэным дзвюм спешчаным плюндрам з серыялу, Віктусі і Аўдолі – а хай жа панепярэлівіць іх, хай пакруціць, як яе за жыццё пакруціла-панепярэлівіла. Хоць якія там ім непярэліўкі: багатаму, ведама, – і бес дзяцей люляе.

***

З усіх галоўных грахоў апошні, сёмы – лянота – ці не самы шматзначны. Усім благім, што маем, што здараецца з намі: нэндзаю фізічнай, няўдалаю кар’ерай, кепскім здароўем – яму найчасцей абавязаныя. Лянота – антыпод руху, значыць, – жыццю.

***

Падчас сустрэчы ў бібліятэцы адзін з чытачоў:

– У французаў – вежа Эйфелева, у англічанаў – Таўэр, у італьянцаў – Калізей ды Форумы. А ў нас што?

Тады сумеўся ад нечаканасці, адно прамармытаў нешта пра Мір ды Нясвіж. І толькі вяртаючыся дадому згадаў сваё, з дзяцінства знаёмае. Тры сядзібныя дамы на адлегласці ў пяць вёрст. З іх адзін помнікам архітэктуры ў міжваеннай Польшчы быў аб’яўлены.

Усё «страбесавана», як кажуць у нас на Мёршчыне, «распасорана».

***

Бацькі і іх равеснікі ў краму за дзесяць, у касцёл за шэсць, на кірмаш за дванаццаць вёрст хадзілі-ездзілі. Мясціны, што на Індру па дарозе, што на Удоўту, што на Друю, – вачэй не адвесці. А паветра такое, што адно дыхаць ім з ранку да вечара. Наглядзеліся краявідаў, надыхаліся паветрам. А паўміралі амаль усе заўчасна – дусту наглытаўшыся, што цягалі з прычэпаў у шаху пад наглядам калгасных паганятых, болькі пазапускаўшы, якія б палечыць, ледзь з’явіліся, а ўсё з-за некальніцы не выпадае. І атрымалася: мясціны для жыцця найпрыдатнейшыя, а жыць няма каму.

***

Дзеда Юзафа і бабы Ганны, матчыных бацькоў, хутар на вяршыні гары месціўся. Унізе, ля Вяткі звілістай, – тэраска паўкругам, ад яе ўгору – пад’ём стромкі. Зноў тэраска, зноў пад’ём. Наўкола пагоркі, з вакна кухні рэшта гарадзішча прудніцкага 12 стагоддзя вока лашчыць. Падчас вайны то немцы, то партызаны не-не ды і зазірнуць у вабны куточак у пошуках спажывы. У хаце ж, апроч дачок, – чатыры сыны. І вокнаў, як наўмысна, у хаце чатыры. Пастануць «смелныя», як кажуць наддзвінцы, мальцы па адным перад кожным – і паспрабуй, сунься, нячысцік. Так і не сунуўся ніхто ані разу.

***

Маці зубы забалелі – раптоўна і амаль усе адразу. Пайшла ў Друю да лекаркі рады даваць. А тая падлячыла адзін, а астатнія па адным праз дзень загадала паказваць. Хадзіла-хадзіла маці за дванаццаць вёрст, чыста збілася, а канца лячэнню не бачна. Суседка дапамагла. «Дурная, торкні ўрачысе дзесятку, –

кажа, – і паглядзіш, як усё лёгка зробіцца». Торкнула, і ў той жа дзень, сапраўды, пакуты скончыліся.

За год да смерці – рухавая яшчэ маці была і бадзёрая – сядзелі мы ўдваіх з ёю ў двары бараўлянскай бальніцы, абмяркоўвалі хуткую аперацыю. Грошы раптам дастала з кішэні: «На, торкні доктару». Адмовіцца хацеў – не змог. Хоцькі-няхоцькі пайшоў «торкаць».

Я на адным краі канапы, доктар – сярэдняга ўзросту мужчына родам з-пад Сянна – на другім. Я да яго з грашыма ў жмені, ён – ад мяне. Я да яго, ён – ад мяне. «Ці не хабарам мучаецеся? – пытаецца. – Не трэба. Вось вылечым вашу матку, тады і паставіце пляшку каньяку». Не давялося ставіць.

Маці нічога пра тую мітрэнгу на канапе не сказаў, так і адышла з перакананнем: не торкнеш – не зрушыцца.

***

На зваротным шляху з Францыі спыніліся ў вясковым гатэльчыку ў Шчэцінскім ваяводстве. «Можа, дзядзькава хата дзе недалёка?» – мільганула думка. Памкнуўся ісці ў рэцэпцыю, каб распытаць, дзе ды што, але сусед па пакоі спыніў: «Кінь дурное, такіх супадзенняў не бывае». Паслухаў яго, не пайшоў. А ўранку, ад'ехаўшыся ад гатэля вёрст пяць, глядзь у вакно: Krszymo-w. Дзядзькі Ільдэфанса вёска! Адно палюбаваўся тым указальнікам.

***

Дзед з бабаю (напярэдадні вайны тое было) дзяцей вырашылі пабежмаваць. Але неабходнага пры ўдзяленні сакраманту адзення – комжаў – пашыць не змаглі: не было з чаго. У штодзённым павялі ў касцёл. Святар убачыў, што не так, як трэба, апранутыя, і не дапусціў да абраду. Вярнуліся ні з чым дахаты.

Маці зрэдку згадвала той выпадак, без злосці, праўда, але з крыўдаю ў голасе: «Трэба ж, вайна грукалася ў дзверы, а ён такое... І з-за чаго – з-за накідкі нейкай!»

***

Беспадстаўна пакараны напярэдадні сямікласнік сядзіць на ўроку моўчкі, не ўсміхнецца.

– Мы ж усё высветлілі, – кажу, каб неяк расшавяліць вучня, – дык чаму не адпусцішся?

– А каб потым зноў не расчароўвацца, – адказвае.

Чатырнаццаць гадоў чалавечку.

***

Бабе Тэсьцы, швагравага бацькі сястры, – пад дзевяноста. Мужык даўно памёр, сын адзіны ў Падмаскоўі жыве. Сядзім са старой у кухні, размаўляем. Кабета дасведчаная: радыё замежнае слухае, кніжкі чытае. Пра беларускія гурткі, што ў Якужах і Шальцінах перад вайною існавалі, апавядае, пра пастаноўку «Паўлінкі», паліцыяй польскай забароненую. Кніжачка невялічкая на стале – у чорнай вокладцы, з паўстлелым карашком. Разгортваю: «Голас душы» лацінкаю, 37-га года выданне. Адкуль, пытаюся. Язэп Малецкі, кажа, прэзентаваў, хочаш – вазьмі сабе на памяць. І зноў апавядае пра далёкае-перажытае – паважна, без каліва наракання на крыўды ды непамыснаты лёсу. Пра беларускае – ані слова больш. Быццам намякае: мы адрабілі сваё, адбылі, ваша цяпер чарга, а нас больш неадкладная справа чакае.

***

Калега з кафедры на працу сумная прыйшла.

– Ці не здарылася што благое? – пытаемся.

– Ды з бацькам непярэліўкі, – адказвае. – Я ўчора толькі ўвайшла ў кватэру, а ён: «Дрэнь, дачка, справы! Так ногі раптам забалелі, ледзь узышоў на пяты паверх. Няўжо старэчае пачынаецца?»

– А колькі ж гадоў бацьку?

– Восемдзесят два.

Сядзім, спачуваем, супакойваем кабету, як можам.

***

Янінка-дурніца гадоў дваццаць па вёсках ад хаты да хаты бадзялася, жабрачыла. Улетку з лялькамі ля ракі бавілася, нанач на лахах у лазні спаць клалася. Аднаго разу маркотная да маці прыйшла:

– Дрэнь людзі ў Мезарэчы.

– Чаму?

– А во хлеб, што заўчора назбірала, паклала на палок, дык на дол штурнулі.

Назаўтра ў вёсцы адно і гаворкі было – пра той хлеб. І праз тры гады, і праз пяць усё згадвалі пры нагодзе:

– Што дзівіцца з людзей, калі хлеб і то «былі штурнуўшы».

***

Джэк кожнага, хто ні зойдзе ў кватэру, сустракае такім брэхам, што дзіву дасіся: адкуль у гэткай малой (вагі – тры з паловай кіло) істоце гэтулькі злосці?

А казваецца, не ў злосці справа. Варта госцю выставіць нагу, як сабака ўжо пад ёю – маўляў, казычы. Пачнеш казытаць – тут жа сціхне. Перастанеш – зноў брэх. І чым далей цягнецца гульня, тым уладней і патрабавальней робіцца Джэкаў голас. Як чалавек каторы: аднойчы паддасіся і ўжо да скону будзеш слугаваць.

***

У ваколіцах нашых дзвюх вясковых прыкметаў, так бы мовіць, не было спрадвеку – студняў і козаў. Ваду з калодзежа першы раз на матчынай і сваёй малой радзіме, у Вяце, адкуль бацькі перавезлі немаўлём у мезарэцкія пакоі, паспытаў. Казу ў дзесяцігадовым узросце праз вакно пабачыў. Быў ранак зімовы, светлы пасля доўгай завеі, сад у снезе патанаў. Невядома адкуль каза дзікая паўз сумёт вымкнулася – і да яблыні. Зграбная, бялюткая – вачэй не адвесці. Кару грызнула раз-другі і знікла прывідам, бы растаяла. Потым снілася часта, непапушчы белы бык няшчаснаму Фалалею.

***

З кабетамі вяцкімі пра капліцу гамонім. Лексіка памежных тубылак – сакавітая, гусценька перасыпаная словамі паўночна-заходняга лакальнага маўлення: недзека, вунака, ядзём, смелны, якочаць – дух займае. Развітваемся цёпла, як родныя – калі яшчэ давядзецца спаткацца?

– Да пабачэння! – кажу на адыход.

– Ага, давідзэнька! – адказваюць. – Пшыежджайце ешчэ, рады бэньдземы.

Быццам былі – і не стала.

***

Суседнія з маім Мезарэчам вёскі Сташулі і Каснарэўшчына называюць Абісініяй і Кітаем. Мезарэча таксама мае другую назву – Куба. Па-першае, наводшыбе. Па-другое, свой Фідэль ёсць – у асобе дзядзькі Петрака. Дакладней, быў, бо ўжо колькі год спачывае на мясцовых кладах. Як, дарэчы, і многія з «кубінцаў», «абісінцаў» ды «кітайцаў». Большасць недарэчна палегла, не дацягнуўшы да шасцідзесяці. Зараз з усіх трох вёсак адна «Абісінія» сяк-так яшчэ ліпіць.

***

Падчас інтэрв'ю з каталіцкай сям'ёю для «Ave Maria» – пра абставіны забойства шаснаццацігадовай дачкі размова.

– Хоць злавілі нелюдзя? – пытаюся напрыканцы.

– Не, – маці адказвае.

– Шкада.

– Што вы! – не пагадзілася. – Зловяць – ёй на тым свеце горай будзе.

Кватэра – праз два паверхі ад пляцоўкі, дзе забойства чынілася, і жыць у ёй – як штодня нанова тую жудасць трываць. Дзесяць гадоў неўзабаве споўніцца, як трываюць.

***

У Люды Сіманёнак: «І невыноснай робіцца пустэча – адсутнасць неабходных мне людзей».

Ад маленства да сталых гадоў арбіту свайго зямнога існавання спадарожнікамі насяляем. У выніку – хто толькі ні круціцца на ёй, хто толькі ні трапляе на тую арбіту міжвольна ці наўмысна. Тым часам і самі за спадарожнікаў – міжвольных або прынаджаных – на чыіхсьці арбітах круцімся.

Церпім. Нас церпяць.

***

Дзядзька Тадзік, бацькаў брат, рыжанін у першым калене, век свой на радзіму наракаў: маўляў, дарогі кепскія, беднавата, выгодаў аніякіх. Апошні раз незадоўга да ягонай смерці ў Рызе ля цягніка размаўлялі. Маркотны, разгублены быў. І ці дзіва: сорак гадоў адрабіў на фабрыцы, дзеці латышы напалову, а грамадзянства – няма. Твар завінуў каўняром, усхліпнуў: «Не даў Бог розуму – папёрся ў гэтую Рыгу. Дома вунь як добра было б».

***

Сядзім у кухні, дзядзькі 50-гадовыя, пітво цэдзім у знак прымірэння. Раптам ён пра кепскае тое колішняе зноў: «Памятаеш? Аддасца табе!» Сумеўся ажно: што адказаць на такое? Цяжка з людзьмі, якія не маюць звычкі зазіраць у пашпарт.

***

Сын жаніцца надумаўся, а ёй – нявестка неўпанараў. Ходзіць ды жаліцца ўсім, якая кепская, а галоўнае – не дзеўка.

Пабраліся маладыя. Жывуць добра, дружна. А калі так, то і пахваліцца не грэх. Вяртаючыся аўтобусам з райцэнтра, апавядае свякрова голасна, каб усе

чулі, якая нявестка ёй увішная ды талковая трапілася. А маладзіца нападпітку:
– Бач ты! А не дзеўка ж, здаецца, была!

***

У суседзяў радасць: кошка-прыгажуня акацілася, чацвёра малых прывяла. Кот-бацька штохвіліны ўпобачкі, ні на крок ад сужэнкі ды дзетак не адыходзіцца. Есць блага, схуднеў ад клопатаў: свет няпэўны такі, як то далей будзе?

***

Маладзіца ў службовым пакоі, сімпатычная – так і хочацца зачапіць-пажартаваць.
– Утульна тут у вас, цёпленька. Медытуеце?
Заірдзелася, успыхнула:
– Как вам не стыдно! Думайте, что говорите!
Пазней прызналася: зблытала, паперамі голаў затлуміўшы, медытацыю з мастурбацыяй.

***

Вяртаючыся напярэдадні вайны з Ленінграда ад сястры, баба Гэлька трапіла да памежнікаў. Хата – праз Дзвіну, а на Дзвіне крыгаход. Пачала прасіцца, каб пусцілі перабегчы.
– Добра, – пагадзіліся. – Толькі бегчы будзеш пад посвіст куль.
Так і перабегла.

***

Бадзяжка год сямі ў Львове ля касцёла міласціну просіць. Кабета з нашае групы:
– Вот, возьми, мальчик.
– А що – ти по-москальскі будеш зі мною розмовляти? – пакрыўдзіўся.

***

У трэцім класе напісалі дыктоўку. На наступны дзень прыносіць Марыя Мікалаеўна правераныя сшыткі.
– Вы што напісалі? – пытаецца сярдзіта.
Разгортваем сшыткі і палатнеем ад сполаху: ва ўсіх без выключэння ў слове аб'ядалі замест «д» – «б» напісана.
Пазней ужо Воўка, настаўніцы сын, прызнаўся: скраў у маці ўвесь стос і выправіў у кожным па адной літарыне.

***

Белка – сучка бадзяжная. Як шчаніцца час – пад ганкам адной са шматпавярховак логава ладзіць. Звычайна ўвесну гэта бывае. Снег яшчэ ўсюды, сцюдзёна, але і сонца зрэдку не-не і выблісне. Вылезе Белка пагрэцца ці паесці, што людзі прынясуць, уздыхне па-чалавечы і зноў у нару сваю цёмную, да дзетак, ад вока людскога падалей. Не цёткам некаторым раўня.

***

У сапраўднага творцы шмат ворагаў. Але галоўным з усіх ён лічыць аднаго – сябе. У кручанага – ворагі ўсе, апроч яго самога.

***

Дзед Юлісь і баба Гэлька заўсёды замест «чорт» прамаўлялі «хорт». Няйначай, змена аднаго гуку ў слове рабіла ў іх свядомасці д'ябальскую істоту не такой злавеснай.

***

Пры паступленні ва універсітэт, паспяхова здаўшы тры першыя экзамены, на апошнім, па гісторыі, «паплыў». Два маладыя, гадоў па трыццаць пяць, экзаменатары, чую, раяцца між сабою:

– Што будзем рабіць?

І пачынаюць шукаць штосьці ў нейкім даўжэзным страхавітым спісе. Не знайшоўшы, што шукалі, вырашаюць:

– Паставім пяцёрку, хай чалавек вучыцца.

Усе гады з удзячнасцю памятаў тую неспадзяваную спагадлівасць і ніяк не мог уцяміць яе прычыну. І толькі папрацаваўшы колькі гадоў у інстытуце, даўмеўся: пашукалі хлопцы ў «блатным» спісе прозвішча, не знайшлі – і зрабілі, як сумленне падказала.

***

У студэнцтве захапляўся экзістэнцыялізмам. І не заўважыў, як асобныя пастулаты гэтай моднай тады ў Еўропе, а ў нас амаль невядомай філасофскай плыні ператварыліся ў жыццёвае крэда. Атрэсці цяжар іх уплыву ўдалося ўжо падчас працы ў школе. Дзякуй Богу! Жыццё само па сабе дастаткова спраўны разбуральнік, каб яму яшчэ ў гэтым дапамагаць.

***

З прафесарам Іванам Штэйнерам вучыліся ў адной групе. І так склалася, што пасля універсітэта 25 гадоў не бачыліся. Спаткаліся неяк у Віцебску на адной канферэнцыі.

– Гэта Іван Фёдаравіч, доктар навук, – знаёмячы, кажу цікаўным. – Мы вучыліся разам.

– Так, і спалі ў інтэрнаце на адным ложку, – штораз дадае дасціпны Іван.

Падчас развітальнай вячэры ўсе кажуць тосты, і я падняўся. Вядома, пачаў з таго, як рады спатканню з сябрам юнацтва. Маўляў, вучыліся разам…

– І спалі на адным ложку, – удакладняе гучным, выдатна пастаўленым голасам прафесар.

– Але арыентацыі не мянялі! – давялося дадаць пад агульны смех.

– Не, – пацвярджае Іван Фёдаравіч. – Не мянялі.

***

Вакол бацькавага і суседніх котлішчаў – трава ў чалавечы рост. А касіць няма каму. А не так даўно, помніцца, сварыліся за тыя пожні. Згадваю, як напрыканцы сямідзесятых, падчас дзяльбы дзед укленчыў і, перажагнаўшыся, са слязьмі на вачах стаў даводзіць, што дзелячова кавяла на паўкрока не туды паказвае. Маўляў, трэба перамерваць.

Усім хапіла.

***

Увайшоў у аднапакаёўку, ледзь даўшы «дзень добры», прагрукаў бруднымі чаравікамі на покуць, трубным голаса сказаў:

– Могло бы быть и получша, но ничаво. Здесь расположимся, племяш.

І, ні згоды не атрымаўшы на часовае пасяленне, не падзякаваўшы, пакінуў свайго пляменніка, якога прывёз уладкоўваць у медінстытут, а сам знік за дзвярыма.

Саноўны, райкамаўскае гадоўлі.

***

Утойваць праўду ад невылечна хворага – нярвата. Робячы гэтак, мы, хай сабе і з найлепшых памкненняў, міжволі пазбаўляем блізкага чалавека магчымасці давесці да ладу апошнія зямныя справы, якія, на яго думку, ён адзін можа зрабіць як след.

Мы з сястрою і братам без малога год хавалі ад маці страшную праўду. Не ўпэўнены, што той высакародны падман яна не ўспрыняла напрыканцы як здраду…

***

Матчыны вочы неўзабаве па скананні – невымерны калодзеж. Дваццаць гадоў мінула з тае часіны, як у іх зазірнуў, а ўсё не знайду слоў, каб апісаць. І ніколі ўжо, мабыць, не знайду.

***

З літсустрэчы ў турме для непаўнагадовых злачынцаў – рабаўнікоў, забойцаў, гвалтаўнікоў – уражанне.

У зале – сотня чалавек з гакам. Усе ў робах, галовы абголеныя, усе аднолькавыя, бы стаўбуны на плоце. Каб лацвей завалодаць увагаю, іду на хітрасць: апавядаю праўдзівую гісторыю пра стрыечную сястру, што некалькі год адбывала пакаранне за забойства. Стаўбуны імгненна ажываюць, на тварах з'яўляюцца ўсмешкі.

Напрыканцы сустрэчы абступаюць цесным колам, задаюць пытанні. А праз пару тыдняў атрымліваю з турмы ліст з запрашэннем наведацца яшчэ. Цяпер думаю: ісці ці не? Наблізіў наўмысна да сябе, як роўных, але ці меў на тое права?

***

Чалавечы лёс Рэмбо – зыход ці нібы наўмыснае імкненне да яго. Прадвызначанасць, калі, што ў світцы грэшніка, што ў плашчы праведніка, – аднолькава няўтульна.

***

Нішто не пакідае ў душы такога следу і не лучыць так моцна дваіх, як супольна перажытая ў раннім юнацтве фізічная блізкасць. Таму цяжка даць веры Фаўлзу, калі ён апісвае абсалютнае расчараванне героя пры спатканні з пасталелай і ўжо не такой вабнай, як калісьці, каханкай. Зрэшты, у кожнага свой досвед.

***

Падчас вучобы ў Летнім універсітэце ў Рыме трапіў у адну групу з амерыканскімі студэнтамі польскага паходжання. Праз колькі дзён пасля знаёмства прачнуўся сярэдначы ад дэкламавання ды спеваў на верхняй тэрасе. Аказалася – рэпетыцыя. Заўтра экскурсія на Монтэ-Касіна, дык рыхтуюць літмантаж у гонар пахаваных там воінаў-супляменнікаў. І ўсё прачула, годна, на бездакорнай польскай мове. Быццам і не было двух дзесяткаў гадоў удалечыні ад гістарычнай радзімы.

***

Вёска мая, Мезарэча, – без адзінага карэннага жыхара. Усе з наваколля, пабраўшыся, на панскую зямлю папрыходзілі. Ці не таму гэткі разнабой у маўленні: нада – набя – надабя; саўсім – сусім – сусём; узноў – знова – зновака. І толькі запаволена-думнае «гэта водзека» – як сімвал тутэйшае лучнасці.

***

Апавядае пра заўчасна памерлых сясцёр: як захварэлі, як пакутавалі перад скананнем. І усё – нібы жартам, са смешкамі, хі-хі ды ха-ха. На кладах магілак тых сясцёр амаль не відно – удзірванелыя, каб табе кветачка. Дачка нішчымніка. Пры Польшчы бацьку зямлю ля самага балота нарэзалі. Ведалі, каму што можна даць.

***

За пару дзён да мамінай смерці суседка-выпівоха завітала – адведаць. Села ва ўзгалоўі і давай дэчыць, як ёй жыць неахвота. «Саўсім не хачу, Стэфценька, дадушы». Можа, суцешыць гэткім чынам хацела?

***

На 3-м ці на 4-м курсе, начытаўшыся Сартра ды іншых экзістэнцыялістаў, а больш – пра іх па выданні Ярашэўскага, выступіў на камсамольскім сходзе групы ў абарону індывідуалізму. І не так светапогляду было ў тым выступленні, як юнацкага куражу.

Назаўтра пад шклом у фае перад актаваю залай – верш «Я, Франц Сіўко...» – ананімны, вядома.

Цяпер бы, пэўна, і абразіўся, тады ж адно пасмяяўся ды памылкі зверху на шкле асадкаю выправіў. Можа, і правільна зрабіў: раптам той вершык для аўтара першым крокам на шляху да паэцтва стаў.

***

Неўзабаве па сканчэнні універсітэта ў краслаўскай кнігарні. Касцюмчык сталічнага крою і валасы доўгія – не паспеў выветрыцца налёт студэнцкае вольніцы. Магазіншчыца-латышка з цікаўнасцю:

– Паляк, няйначай?

– Беларус.

І цікаўнасць, і ветлівасць – бы карова языком злізала.

***

У нас праваслаўны – значыць «левы» ці зрэдку «правы», але амаль ніколі не нацыяналіст; каталік – значыць «правы» ці нацыяналіст і калі-нікалі «левы»;

уніят – значыць амаль заўжды нацыяналіст і «правы», але ніколі не «левы». Ці дачакаемся, што кожны можа быць і першым, і другім, і трэцім – беларускім?

***

Дзед у маладосці, вырашыўшы ажаніцца, спыніў выбар на Гэльцы.

А яна – з «непачэснай» сям'і. Не тое каб гультаватыя людзі, а так – несур'ёзныя нейкія. Заўпарціўся дзедаў бацька: возьмеш Гэльку – нічога не дам.

Пайшоў маладзец паведаміць каханай кепскую навіну. А яна паслухала ды гоп на зямлю – страціла прытомнасць.

«Паглядзеў я, – апавядаў дзед, – што такое дзела, ды й рашыў па-свойму». Пабраліся. Больш за шэсцьдзесят год разам пражылі. Усюды ўдваіх, усюды ўсё сумесна.

Баба Гэлька трыма гадам раней за свайго Юліся памерла. Перад смерцю паляруш укасаўся, спаралізаваная ляжала. Намучыўся дзед. А, як сканала, сказаў: «Каб даў ёй Бог яшчэ пару гадкоў – я б шчаслівы быў».

Аднак сыну сярэдняму, бацьку майму, з дзеўкай з «непачэснай» (некаталіцкай) сям'і ажаніцца не дазволіў.

***

У дзяцінстве бацькі прывучалі ўцалоўваць бабе і дзеду рукі. Ледзь угледзяць постаці на сцежцы, адразу: «Баба з дзедам ідуць, ты ж глядзі, у руку не забудзься пацалаваць».

Рукі старых – сухія, з вузлаватымі пальцамі, але заўсёды, нягледзячы на цяжкую фізічную працу, чыстыя, са своеасаблівым пахам хлеба і маладой пожні.

А цалаванне вельмі хутка скончылася – пад кепікі суседзяў ды актыўнае «выхаванне» школай.

***

Дзевяностатрохгадовая баба Юлька ў няблізкіх сваякоў век дажывае. Уранку – за касу і на пожню з мужчынамі.

– Навошта табе гэта, Юлечка? – пытаецца суседка.

– А як папробіш, тады і паясі смялей, – адказвае.

***

З любое справы першымі самыя непрымірымыя і істэрычныя сыходзяць.

***

У глухой, запаветнай вёсачцы паблізу Панізнікавага Лявонпаля. Хлопчык тузае дзеўчанё за касу, а тая яму:

– Не руш, не то скажу папу.

А цётка-аднавяскоўка:

– Ой, дзяцёнак, да папы даехаць і ста даляраў, пэўна, не хопіць.

***

Пошласць зместу – паўбяды. Пошласць стылю – бяда ў квадраце. І пра самае высокае можна сказаць так пошла, што пашчэнкі звядзе.

***

Паверхам вышэй пасяліліся новыя суседзі. І вось каторы месяц запар прачынаюся а чацвёртай раніцы ад тузаніны над галавой. Спачатку яна стогне пад шалёнае рыпенне ложка, затым ён далучаецца. Суседзі, адыходзячы на працу, шматзначна ўсміхаюцца, але незадаволенасці ніхто не выказвае. Усе бедныя, «відзікаў» не маем, дык хай хоць «чуекі» будуць.

***

У цёткі Тамары і дзядзькі Чэся падчас інфляцыі трыццаць дзве тысячы рублёў ляснулі – усё, што сабралі цягам многіх гадоў. Збіраліся купіць хату ў райцэнтры, ды не паспелі. Пасля дзядзькавай смерці цётка Тамара засталася адна на сваім аддаленым – ні жытла іншага, ні чалавека паблізу – хутары.

– Ехалі б да каторага з дзяцей, – кажу пры сустрэчы.

– Што ты! – абурылася. – Гэтулькі сродкаў укладзена ў хату! Хіба можна кінуць!

І ўсё ходзіць, ходзіць наўкола будынка.

Праз чатыры месяцы, узімку ўжо, знайшла выпадкова паштарка цётку на дварэ – нежывую. Падчас хаўтураў грошы тыя прыгадалі.

– Сказала ёй, што капец грашам, дык засмяялася толькі: маўляў, хата ж уцалела, – успомніла паштарка.

Апусцелую хату і ўсё, што засталося з рыззя, неўзабаве шукальнікі скарбаў па хмызе расцягалі.

***

Тадзікі, Франакі, Антоны, Фрэдзькі, Рэнькі, Зосі былі ў маёй Павяцкай школе ў 60-х. Зараз на ўсю школу адно такое імя ці спаткаеш. Усё Наташы, Тані, Светы, Сашы, Андрэі. Менш за паўвека спатрэбілася, каб усё памянялася.

***

Баба Гэлька ў восемдзесят гадоў штонядзелю хадзіла на імшу ў касцёл за восем вёрст. Прыпыніцца каторы са знаёмых з падводаю, прапануе падвезці.

– А не, не, хорт яе, яшчэ спадніца пакомкаецца, – адкажа і шыбуе далей, ні на бездараж не зважаючы, ні на адлегласць.

***

Два дні цягаліся па катавіцкіх крамах, уздыхалі:

– Які шык! Вось бы нам гэтак!

На трэці сутыкнуліся з праблемаю ператтлумачыць нейкі надпіс – нікога побач.

– Якое кепскае абслугоўванне, – занудзіліся. – У нас лепш!

***

У цягніку Віцебск–Мінск пасадзілі ў агульны вагон, плату ўзяўшы як за плацкартны. З паўдзесятка чалавек абурыліся, астатнім – хоць бы што. Больш таго, тымі, хто абурыўся, пачаліся выказваць незадавальненне.

Хлопец, ці не студэнт, не вытрымаў: «Звыкліся, ці што, з паўсюдным падманам?» І павольна, па складах на ўвесь вагон дадаў: «Па-мяр-коў-ныя!».

***

Размова з польскім ксяндзом пасля наведвання аднаго з кляштараў.

– Вас не турбуе, што такая значная частка маладых людзей ідзе ў святары ды манахі?

– O, to nic, polako-w jest duz-o.

Сапраўды, – duz-o. Едзеш трасаю – усюды вёскі, мястэчкі, гарады. І ўсё так добра ўладкавана, так густоўна, што міжволі пазайздросціш. А на працягу ж, здаецца, ці не двух стагоддзяў і на мапе не значыліся.

Pan.stwo. Дзяржава.

***

Хлопца за вочы і ў вочы чапірадлам звалі. Бывала, прычэпіцца да каго – абцугамі не адарвеш. Адбярэ ў каторай дзеўкі брошку, пакладзе сабе ў кішэню, а потым тыдзень шлэпае следам і напамінае:

– Бро-ошка, бро-ошка…

Праўдзівы чапірадла.

***

Як і многіх людзей неўратычнага складу, не-не ды захопіць навязлівая ідэя. У маладосці найчасцей кнігамі «хварэў».

Вельмі ж хацелася, памятаю, Пруста прыдбаць: выкладчыца Цімафеева, нягледзячы на знешнюю суворасць, цікавасць да свайго прадмета – замежнае літаратуры – прывіць умела.

Аднаго разу прысніўся той Пруст – не сам, кніжка ягоная, вядома. А назаўтра глядзь у браслаўскай кнігарні – стаіць між тамоў даведачнай і тэхнічнай літаратуры. Сэрца тахнула, калі пабачыў загаловак – «У накірунку Свана».

Гэткім жа чынам і Лесінга прыдбаў, і яшчэ штосьці.

***

З бацькам не мелі даверлівых адносінаў. Апошняе спатканне з ім адбылося ў сястры, куды яго перавезлі, каб лацвей было даглядаць хворага. Не падымаўся ўжо і выглядаў кепска, бачна было: не жылец.

Назаўтра ўранку я ў краму пайшоў, а калі вярнуўся, сястра з пакоя, дзе бацька ляжаў, паклікала: «Хутчэй хадзі, канае». Я – да іх, апратку на хаду здымаючы. Як на злосць, «маланку» заела, ніяк не даць рады зняць куртку. Пакуль валаводзіўся з «маланкай», бацька памёр. Адно, што заспеў, – як хваля па целе ягоным прабегла ды грудзі таргануліся.

Ні роспачы не было, ні шкадавання вялікага. Але калі падчас хаўтураў падняўся, каб нешта сказаць, словы ў горле захраслі і слёзы самі ручаём паліліся. Ад усведамлення няспраўджанасці таго, што магло б быць як між крэўнымі людзьмі.

***

Чацвертакурснік-філолаг прыносіць на зацвярджэнне план заліковага ўрока, а ў ім – каля дзесятка арфаграфічных памылак.

– Як жа так? – пытаюся.

– А ў мяне заўжды з граматай праблемы былі, – адказвае.

– А выкладаць як будзеце ў школе?

– А я сусветную культуру буду выкладаць, а не мову.

***

Выступаючы ў шматлюдных аўдыторыях, не-не ды прыгадаю эпізод з юнацкіх часін.

Аўтастанцыя ў райцэнтры. Лета. Мне шаснаццаць, прыязджаў у горад па нейкай справе. У кішэні – квіток, чакаю аўтобус дадому. Цесна, горача, снуюць туды-сюды занятыя сабою людзі.

Падрульвае аўтобус, усе кідаюцца да дзвярэй, каб заняць зручнейшае месца. А мяне – страх спаралізаваў перад натоўпам. Аўтобус кранаецца, і я застаюся ў станцыйным калідорчыку, пры квітку, чакаць больш позняга і невыгоднага рэйса.

Наступным разам, не жадаючы ўскладняць сабе жыццё, раблю пасадку там, дзе менш людзей, – на ўскрайку горада.

***

Згадаўшы пры чарцы ў адной кампаніі аповед знаёмай пра тое, як абдурвае мужа, каб з'есці смачнейшы кавалак, чую асуджальна-нязгоднае:

– Лухта!

Жанчына сярэдніх гадоў, сімпатычная, пры целе.

Схіляюся над талеркай, не адважваючыся пярэчыць. А праз хвіліну чую, як расказвае суседцы сваю «гісторыю»:

– Я і адно яму прапаную, і другое, абы салаку тую не чапаў. Дык не – абавязкова возьме. Адзінае шчасце – у лядоўні сам далёка не шнарыць... Прыгарну салаку чым іншым, і не заўважыць.

***

З суседам па пляцоўцы, бывала, павітаешся, – каб слова ў адказ. З год так працягвалася, аж пакуль аднойчы ля ліфта не сутыкнуліся.

Стаю ўнізе, ліфт чакаю. Дзверы расчыняюцца: ён, сусед. Мяне не бачыць, бо наўзбоч стаю. Ды як апарожніць кішэчнік ад газаў – сцены дрыжма. Тут глядзь: я побач.

– Дзень добры! – з ніякаватаю ўсмешкай.

З таго часу заўжды вітаецца.

***

Ніякая іншая размова не выяўляе такой ступені даверу, як размова ні пра што.

***

К., эрудытка, цікавейшы чалавек (і дзівачка ў дадатак), у маім дзесятым «А» літаратуру выкладае. Клас цяжкі: дваццаць хлопцаў, дзесяць дзяўчат, усе з гонарам. У К. – суцэльны гармідар на ўроках. «Такія гады, – скардзіцца аднаго разу. – Прыйшоў бы ты калі на ўрок, паглядзеў». Іду. Саджуся падчас перапынку за апошнюю парту, чакаю званка. К. уваходзіць, на табурэт збоч стала ў праёме між партамі ўладкоўваецца. І ўсё сподняе – да апошняе ніткі – навідавоку. У класе рогат, вядома. К. злуецца, ды ніяк не зразумее, што да чаго. «Ну, бачыў, якія?» – пытаецца пасля ўрока. «Бачыў», – адказваю.

***

Пачатак шасцідзесятых. Спецыялістаў дыпламаваных на вёсцы – кот наплакаў. Ставяць брыгадзірам па чарзе мясцовых мужыкоў. Першаму дзядзьку Стасю «карона» выпадае. Ходзіць па хатах уранні, на працу «загадвае». Цётка Мартуся Цярэшчыха, суседка, незадаволена: «Ага, рабіць ім за ніщто! Праз год здымаюць Стася, Цярэшку, мужыка Мартусінага, Мечыка, ставяць. І цётка: «О, надабя робіць! Без работы – халера яе...»

***

Знаёмы ксёндз-францішканін распавёў: «Еду на аўто – даішнік спыняе: «Вашы дакументы!» Падаю паперчыну – на лаціне, з пячаткаю Курыі Францішканскай. Чытае быццам: «Ага... так... так... зразумела...». «Дачытвае» да пячаткі: «О, дык гэта жонкі вашай машына?».

***

Друйскім цягніком з родных мясцін у Віцебск вяртаюся. Неўзабаве горад, час бялізну здаваць. Ссоўваю ўсё ў мяшэчак, нясу правадніцы.

– Кладзіце сюды! – дзеўка кажа.

Кладу, як загадала, іду назад у купэ. Праз пяць хвілін убягае:

– Наўлечкі няма! Плаціце тысячу пяцьсот!

– Як няма? Во ж у прысутнасці пасажыраў складваў...

– Нічога не ведаю. Паглядзела – няма. Паклалі і пайшлі...

– Вы ж загадалі пакласці... Не, каб пры мне і паглядзець.

– Во які вы! Што ж, сваю з дому прынясу, аддам за вас.

Туман загадкавага здарэння цётка з суседняга купэ развейвае:

– У Полацку нехта сцібрыў, выходзячы. Я чула, як з напарніцай охалі ды бедавалі пасля. А з вас узяць вырашылі, няйначай...

Выходзячы з вагона, прыпыняюся, торкаю ў руку дзяўчыне тысячу пяцьсот.

– Не ўцямлю, як гэта здарылася, – кажу. – Вазьміце вось грошы.

– Не надо, мужчина! – успыхвае. – Пусть это останется на вашей совести.

***

Суседка на пахаванне замужняй дачкі ў Краславу ездзіла. Вярнулася, распавядае, як было ўсё: «Кветак гэтулькі – Езус! А людчыкаў – на панадворку ледзь тоўпіліся! Але што ж тое ўсё – блага было Крысечцы ў свякровы... Памерла, дык хоць мучыцца болей ня будзець». І – ані слязіны, ані ўздыху, ані ценю шкадобы ў вачах. Характар.

***

Бабарыкі – паблізу Дзвіны вёска, настаўніка Антона Феліксавіча, што ў пачатковай школе нас вучыў, малая радзіма. Сам ён гімназію ў Друі скончыў, цікавы, дасведчаны быў чалавек. Сяброў-аднакашнікаў па замежжы ў ліхалецце параскідала, а ён амаль адзіны з усіх за настаўніка на вёсцы застаўся. Распіўся спакваля на вясковым бязлюддзі, але пад старасць узяўся за розум, кінуў захапляцца зеллем. Што нібыта манаграфію пра свае Бабарыкі складае, я з ліста да яго Яўгена Аніські даведаўся. Спытаў, ці праўда. «Меў намер калісьці, – адказаў, – ды так і не дайшлі рукі».

Дадзена было Богам, а не скарыстаў чалавек – што можа быць гарчэй?

***

Перш чым не любіць іншых, варта научыцца не любіць сябе. Нелюбоў да сябе спрыяе разуменню добрага і кепскага ў іншых, нелюбоў да іншых – толькі квеліць ды раз'ядае душу.

***

У дзяцінстве ды юнацтве шукаем (і знаходзім) найперш падабенства да таго з бацькоў, да якога маем большую сардэчную прыхільнасць. З гадамі, узброеныя належным жыццёвым досведам, азіраемся на мінулае і разумеем, што памыліліся.

***

Спявачка маладая па радыё пра гастролі ў Польшчы распавядае:

– Так здорово было, так встречали всюду! Одно не понравилось: они же все там по-своему, по-польски разговаривают, представляете?

***

Маці на вадзе дзвінскай гадавалася. Падчас вайны дзіцем пошту перавозіла на лодцы на латышскі бок. Лодка перакулілася на сярэдзіне ракі, мусіла малая ратавацца. Да берага даплыла, а лістоў з далоні не выпусціла. Але вады з тае пары баяцца стала.

Класе ў пятым я быў, як выправіліся ўдваіх з ёю ў Бігосава трускалкі прадаваць. А перавозчык – п'янюткі, ды яшчэ і лодку сюды-туды, каб напалохаць, наўмысна гайдае. Памятаю, як прыхінула мяне да сябе і ўсё жагналася.

Незадоўга да яе смерці ля ракі разам былі, калі на працу ў Дрысу праз Краслаўшчыну дабіраўся. На хвалі паказала, тузанула да сябе:

– Не плыві, патонеш яшчэ!

Адпіхнуў яе ды і паплыў да другога берага. Самае большае, пра што па дзесь дзень шкадую.

***

Джойс: сыр – труп малака.

## ЯК ЁН У РАБРЫНУ

## ГІМН

У рабрыну бес – і адлегласці стакроць мізарнеюць. Тры вярсты праляціш, шалам апанаваны, і пяць, і сем, а ўсё далей, далей карціць мчацца. Зазвычай, выбіраючыся куды, не вёрсты – метры палічыш таго шпацыру, ногі баючыся змазоліць, пульс дзесяць разоў памацаеш, сэрцайка ашчаджаючы. Тут жа...

Двойчы па два ў адным: вар і лёд, лава і попел.

Бессань – вераду душэўнага клеўрэт, вар'яцтва знячэўнага адданы паплечнік.

Ты – падарожнік-бадзяжка, вераду ды вар'яцтва тых у пілігрымцы да нязнанага, дзе супакой і лагода рэй вядуць, поўны намеру пазбыцца.

Твой намер – ці то насамрэч, ці то нібыта...

Ягоны, бесаў, – ад крэменю цвярдзейшы.

Згода ваша – змовы маўклівае звыроддзе.

Шчэ ні промня паўз шыбіну з шэрані ранішняй не прабіваецца, а наўкола светла, бы ўдзень – шчыруе! Капытом па нерве, рогам у рабрыну, па павеках хвастом... Сон дарэшты знішчыць, розум зацугляе, думкі зблытае, апетыт заб'е, – прэч, сабе колішняму, часам, архітэктарам аблічча твайго цяперашняга, не знявечанаму, – наўздагон, наўздагон, наўздагон! – звабіць ляцець.

Тры вярсты, пяць, сем – колькі трэба табе на спатолю, бесе?

Які артроз, доктар, якая арытмія!

Слізота-каўзота трывогу зглушыць, прыпамін лагодны – слова выпадковае, пагляд ласкавы, усмех прыязны – мякенькім дыванком пад ногі паслужліва ўсцелецца.

Ляціш!

Дакору, што з слова ці з жэсту аблудлівага прабіўся, не нацкуе на цябе падсуклетлівы інтрыган, не паўшчувае, не спляжыць спадзеву. Што яму! У целам спакушанага душу спакусіць – на адно імгненне турботы. Ён ведае гэта, ведае моц сваю.

Ды прывіднасцю мроі, на душы грэшныя сквапны, – не папікне цябе, нягоднік.

Ды нізкасцю высокага, да паскудства звыклы, – не спудзіць, ненажэра.

І жорсткасць, што з пяшчоты, і непрыязнасць, што з любові, – ягоных рук справа. Толькі сіло – ды не сутнасць: гэтак далёка не сягае воля бясіная, гама пачуццяў тваіх непадуладная яму. Гэта таксама ён ведае, і мулка зламысніку, і мітусіцца.

Шкада цябе, злыдух!

Ах!

Абдоймы: поруч – па руно залатое.

Хто за Абсірта тут, хто за Ясона?

На белым белае – нішто на нічым.

Высокае белае тваё, што крылаў моц сілкуе, шэра-белым з падпашыны аблачыны, наўмысна расшкуматанай, бес, хаўруснік твой, вачэй у сабакі пазычыўшы, прыцьмяніць, стынь нясветную на цяплынь перакуе.

Ляці, як дасі рады!

Ляці, нябога, а перад тым, як грымнуцца ў апраметную, пацеры змоў паганскія – гэта ўсё, чым маеш суцешыцца.

Каторы ёсць у...

Імя тваё...

Можа, Плоць, а можа – Дух...

Плоць – транжыра, Дух – ліхвяр. Плоць – з’ядае, Дух – рахункі сплачвае. Адвеку так: Плоці – страўня за жытло, Дух за Цэрбера пры ёй, дзеля перасцярогі.

Як пры табе зараз.

Нат калі голы ты, бы немаўля, і за жытло табе – свет увесь.

Увесь, ад святла святлейшы, мрояй прывіднаю асвечаны.

Натура шатанская...

Нат цяпер, калі святлом тым няведама за якія дабрадзействы ўлагоджаны ты, – пры табе ён, бясіна.

Між ім і святлом – скінія твая таемная, недасяжная.

Маўчанне – паратунак твой.

Бо...

Касаглузды гэны – што скажа?..

Крывадушны той – што падумае?..

Вока іх – суроку жэрадла, язык – джала смяротнае.

У нерат іхні – горш, як у твой, бес, патрапіць.

Дык ляці і не азірайся!

Тры, і пяць, і сем...

Пустэльні біблейскае абшары – што ў параўнанні з тымі, што ў табе сягоння!

Хто ты, і што хіжасць або высакародства твае на тле кветаў тых, што з нематы пакутліва-слодычнай вырастаюць? З тугі, ад мёду саладзейшай, з бяссоння, ад забыцця жаданейшага?

Вачыма гукнеш з добраахвотнае вязніцы, але ці захочаш быць пачутым? Слова – адхланне, слова – і вораг. І слязіна, і смех – усё з яго, Слова.

Дзікун – малады, што ані разу не плакаў.

Дурань – стары, які не смяецца.*

Смейся і ляці!

З цудаў цуд – белае на белым.

Замець снежная скроні белыя белым прыпудрыць, – і бы не ты гэта ўжо.

Маланку выкрасліць рогам з рога пасярод зімы бес-стварэнне, – ці не знак то супольнае доўжыць?

Далей! Далей!

Крок яшчэ, паўкроку – да сябе існага, ланцугамі досведу, што армадаю паглядаў касых, шатана параджэннем, сілкуюцца, не скаванага.

Покуль моцы стае і дыван спадзеву шашаль боязі не падзіравіў.

Гэта – цяпер.

А заўтра…

У схроне-палацы тваім абрыдла-зацішным…

Параза твая – натхненне, што рукою нябачнай – яшчэ адзін змысел бесаў? – прысвячэнне гэтае –    . – літарынай няўклюдна-геаметрычнай глаголіцы выдасць міжвольна на шэрым маніторы.

Ён, што, вар’яцтвам тваім учорашнім ды справы сваёй падрахункам усцешаны, казытне за рабрыну і хіхікне самазадаволена з вечаровага прыцемку.

Удзячнасць твая бязмерная, хоць і з горычы прысмакам, – што сталася гэтак.

З ласкі бясінае…

З штукарстваў ягоных.

* Цытата: **Сантаяна.**

***

Ля вадаспада ва Устшэжы на месцы былой кардоннай фабрыкі малымі штодзень кулогаліся, рыбу лавілі. І не заўважалі ні хараства таго, ні дзівосаў наўкола. Іншыя заўважылі. Цяпер прыязджаеш улетку – людзі чужыя, засмечана ўсё, тлумна. Быццам і не сваё ўжо.

***

У Сігулдзе да латыша пажылога па-расейску – спраўдзіць штосьці – звярнуўся. Залапатаў па-свойму злосна ў адказ, ажно сліна пырснула.

– Не так нешта? – пытаюся. – Ну, прабачце…

– А как ты ко мне, так я к тебе, – ідзе ў наступ. – Учи язык!

– Вучу, – паказваю размоўнік. – Нетутэйшы я.

– А-а, тогда ладно, – мякчэе. – Извини тогда.

***

У спадарыні Эвы, полькі з Канады, муж у Маскве працуе.

– Шмат зарабляе? – пытаемся неяк.

– О, нават казаць няёмка, – багачка ўсміхаецца. – Паверце, дастаткова, каб запрасіць вас у кавярню.

На наступны дзень падчас экскурсіі ў Асізі непярэліўкі ў нашай Эвы: партманет з сумкі выцягнулі.

– Восемдзесят даляраў скралі! – заенчыла роспачліва. – Вось, мела запрасіць вас дзе пасядзець – дык цяпер ужо выбачайце.

***

Маладыя раз-пораз рукапісы прыносяць – аповесці, а то і раманы. А самім гадкоў – семнаццаць-васемнаццаць. Паўшчуваеш за агрэхі, пахваліш за ўседлівасць. А сам міжволі падумаеш іншым разам: «Калі ж жыць будзеце? Ці

не атрымаецца так, што ў маладосці не напамыляўшыся, пад старасць «во все тяжкие» пусціцеся?

***

Паэтка знаёмая з днём народзінаў віншуе. Спрасоння ажно скаланула ўсяго: авохці, уласны юбілей ці не праспаў? На шчасце – не, памылілася кабета, пераблытала дні, тыдзень яшчэ наперадзе да «ўрачыстасці».

Бывае так: прахопішся ўночы ці пад раніцу ад сну – і да пліты: раптам выключыць звечара забыўся? Ці падасца сярэдначы, што ключ звонку ў дзверыне пакінуў, а там, на пляцоўцы, чужых людзей плойма.

Між сном і явою шчэлка, сполаху й трывогі заюшлівае імгненне.

***

Сумежжа моўнае дзіўныя наватворы нараджае. На маёй малой радзіме, парыруючы чый-небудзь нядобразычлівы слоўны захад, так скажуць: «Проша не падпіздэваць!». Хіба не шляхетна?

***

Падчас дыялекталагічнай практыкі заўважыў: «заходнікі» старыя больш на здароўе скардзяцца, «усходнікі» – на адсутнасць увагі ды жыццё наогул. З першымі зразумела ўсё, з другімі… Едзеш дзе-небудзь па Лёзненшчыне – каб святыня табе, каб цэркаўка. А каму даверыш апошні зямны клопат, як не Богу? Вось і пакутуюць людцы невыкупным болем, магчымасці яго пазбыцца не маючы.

***

Як знарок хто падбіраў прозвішчы старшыняў у нашым паваенным калгасе: Гайдулькін – Мятла – Таўкач. Адзіны, хто парушыў ненадоўга страхавіты той шэраг, – Капуста. Не толькі, відаць, дрэва ў навальніцу, як кажуць у нас, «цёнг мае», а й грамадскае ўладкаванне.

***

Пробашч забараніў ставіць на стол гарэлку падчас хаўтураў па бацьку. Людзі ж – здарожаныя, зубамі ад сцюжы ляскаюць, прайшоўшы пехатой па гразюцы да могілак ды з могілак каля дзесятка вёрст.

– Грэх мне будзе, як пастаўлю, – кажу. – Так што і на сябе яго бярыце.

Узялі ахвотна. Але, як гуртам, супольна – і не такім страшным выдаваў.

***

З сястрою стрыечнай наўкола возера на міні-трактарку калясім. Дзень, быццам знарок, – светлы, сонечны. Твар Ганнін – чысты, як і надвор'е – каб смужынка, каб аблачына на ілбе. А праз тыдзень, ведаю, суд. Пасля кампаніі нецвярозай узяўся адзін далязаць, тыцнула нажом, і паваліўся вобзем нежывы.

Невыказнае – на мяжы двух існаванняў блізкага чалавека. І памагчы хочацца, і ведаеш, што немагчыма.

***

Дзед у восемдзесят з гакам на ровары галіцца за тры вярсты прыязджаў. У портках спартовых, на галаве – капялюш, вакол шыі – хусціна чырвоная

накшталт піянерскага гальштука. Усё жыццё – у вёсцы, у працы пякельнай, а вось жа – хоць у кіно за героя-палюбоўніка. Аскепак цывілізацыі гаспадарскай, трывушчасці і годнасці ўвасабленне.

***

У Бешанковіцкую парафію ксёндз малады прыехаў, Алег Будкевіч. І за кароткі час прывабіў не толькі каталікоў, а і шмат людзей староннніх. Карпатліваю працай, абыходлівасцю, беларускасцю непадробнаю, выкшталцонай. Гэтаксама годна і апантана Аляксандр Рагіня на Пастаўшчыне, Вячаслаў Пялінак у Друі і Павяцці, Януш Прусіноўскі, дарэчы, паляк, на Сенненшчыне шчыруюць. З добрым ідуць да людзей, дабром і адгукаецца. Мы ж, бяздзейнасць уласную апраўдваючы, на люд наракаем. І цёмны ён у нас, і дурны, і збыдлячаны. І яшчэ пашаны да сябе ды справы сваёй патрабуем.

***

Цётка Анеля зазвычай «Прыму» паліла. Ідзеш, бывала, паўз хату, абавязкова спыніць:

– Папалім?

Паліла не таячыся, не хаваючы сваёй слабасці, хоць жанчына з цыгарэтаю для землякоў маіх – не з ухвальных ідовішча. Але ніхто ніколі не папікнуў, не пацвеліўся.

Шарм нейкі мела невытлумачальны – ад старых польскіх часоў, і адчувалі гэта, і ставіліся належным чынам.

***

У катавіцкім кляштары кармелітак босых манашка, мяркуючы па голасе (твар чорным закрыты) – зусім маладая, пра побыт ды ўладкаванне ўнутрыкляштарнае апавядае. Нашы кабеты слухаюць уважліва, зрэдку пытанне хто-ніхто задасць. На тварах жа – няўцямнасць напалову са шкадобай: гэткая маладая, жыць ды жыць ёй, а во ў кляштар – ды строгі які! – падалася! Добра, без парадаў, як след бы было зрабіць, абышлося.

***

Сястра дома заўсёды па-беларуску, з мёрскім «акцэнтам» размаўляе. Неяк падчас выступленняў у раёне вырашыў з пісьменнікамі пазнаёміць. «Глядзі ж, – папрасіў, – прыйдуць – прывітай, як заўсёды мовіш». Прыходзім па абедзе. «Добры дзень!» – госці вітаюцца. «Здравствуйте! Проходите, пожалуйста!» – адказвае. Адкуль што ўзялося?

***

З ксяндзом-палякам знаёмым мовою колькі часу займаліся. Сякія-такія і поспехі ўжо былі. А тут – у Піцер у яго камандзіроўка, на семінар нейкі. Вярнуўся сумны дахаты.

– Усё, не буду больш вучыць тваю мову!

І распавёў такое. У Піцеры да беларусаў, гэткіх, як ён сам, «семінарыстаў», звярнуўся па-беларуску – пасмяяліся, як з блазна.

***

Бацькі – ва ўладзе, – ізмы працягваюць «дабудоўваць». Дзеці з цёткамі ды цешчамі – па банках зазвычай, дабрабытам заклапочаныя. Унукі ва універсітэтах – эканоміку, права асвойваюць. І пяць гадоў міне, і дзесяць – усё адны і тыя ж прозвішчы навідавоку застануцца. Далызлыя бо.

***

Класе ў другім настаўнік наш, Антон Феліксавіч, вершык загадаў на памяць вывучыць. А ў ім словы такія: «Таварыш, будзь жа пільны, святыя рубяжы…» Два ўрокі мучыліся, вымаўляючы тыя «рубяжы», «будзь жа пільны». Чужое, незразумелае, неарганічнае.

***

Бацька вечарамі пасля рэпетыцый у вясковым хоры песням нас малых вучыць. Пры гэтым асабліва чамусьці на «Ленин всегда живой» націскае. Падцягваем, як можам.
– А хто такі Ленін? – пытаемся, адспяваўшыся.
– Чалавек.
– Чалавек? А чаму тады ён «всегда живой»?
– Таму што вождь.
– А хто такі вождь?
– Дык ён, Ленін…

***

Маці на рак хварэла. Пасля няўдалае (пра тое не сказалі ёй нічога) аперацыі ў Бараўлянах пяцідзесяціпяцігоддзе вырашылі справіць. Памятаю, стаяла ў кухні, гатавала штосьці да стала. Лыжку мне падала: »Памый!». Двума пальцамі тую лыжку ўзяў, бы ад крываўкі ратуючыся, шпурнуў у мядніцу з вадою.

Праз колькі часу – у бацькі тая самая хвароба. Але ўжо страху не было такога перад ёй. Змізарнеў, папярэднім досведам прытуплены.

Пра сваё і наогул ледзь паспеў падумаць – прамільгнула і сплыло. Можа, таму, што пагрозы непасрэднае жыццю не ўяўляла?

***

Са шпіталю выпісваючыся, квіток непрацаздольнасці атрымаў. А ў ім дыягназ – неўрастэнія! Авохці, што на працы падумаюць? Пацягнуўся да доктаркі па параду. А яна з парога:
– На «неўроз» прыйшлі выпраўляць?
– Як вы здагадаліся?
– Вельмі проста… Тут такіх, як вы, выпраўляльшчыкаў, – кожны першы.

***

Лекар малады, аспірант, падчас ранішняга абыходу першы раз у нашай палаце. Скаргаў – мора, адно моршчыцца паспявае будучае свяціла ды асадкаю шморгаць у нататніку. Апошнім да інваліда, што збоч вакна, коўдраю па самыя вочы накрыўшыся, ціхмяна ляжыць, падыходзіць.
– Ну, вашы як справы?
– Нішто… Дахаты ўжо можна.

– Дахаты! Баліць што?
– Не-е…
– Які вы! Не, каб паскардзіцца, як іншыя. Ану, пакажыце ногі!
Дзядзька коўдру адхінае, на прасціне замест дзвюх ног – адна, і тая апухлая.
– Вось, а кажаце – нішто.
– Дык і нішто! Было б нешта – то і скардзіўся б.

***

Атрымаеш «святое пісьмо» з прынукаю перапісаць дваццаць восем разоў і сцепанешся ад вораху. І выкінуць карціць тую пісаніну ў сметніцу, бо ведаеш – глупства, і боязна: а раптам сапраўды благое, у ёй напрарочанае, збудзецца. Памуляешся гэтак ды і апусціш «пасланне» ў суседскую скрыню. На наступны дзень, глядзіш, – тры ўжо ў тваёй замест таго аднаго.

***

Не так даўно было, здаецца: папросіць дзед прынесці што з начыння і разгубішся міжволі – дзе той кубел, а дзе цабэрак, як іх адрозніць? А яшчэ ж гарнцы ды гарнушкі былі, сіты з рэшатамі, кварты – не злічыць усяго… Па дзедавай смерці адных кашолак ды бязменчыкаў, лямпаў і ліхтароў самых розных канфігурацый гэтульки знайшлі ў істопцы і на гарышчы – на добры музей хапіла б!
А пабудовы гаспадарчыя! Стайня, адрына, клець, свіран… Зараз жа – пуня ды хлеў – увесь джэнтльменскі набор сялянскі. Што ў працы, што ў ладзе жыцця, што ў забаўках – куртата, сціслa, аднастайна.

***

Падзеж каровы – жахлівае для селяніна. На нашым падвор’і двойчы здыхалі. Першую бацька касою прырэзаў хворую. Помню цішу, што стаяла наўкола, пакуль выбаўляў няшчасную ад пакутаў, ды твар маці – збялелы, нежывы.
Мабыць, тады і ўпетрылася на ўсё жыццё ў свядомасць стаўленне да стачыны як да святога. Гадоў дванаццаць меў, калі, адбываючы радоўку, раптам убачыў, што адна канюшыны абраселай аб’елася. Увайшла ў раку па вымя і на бок павольна пачала класціся. Не ведаю, скуль рызыка ды сілы ўзяліся, але так мянташыў небараку палкаю па азадку, што не змагла ўлегчыся. Выгнаў з вады і з паўгадзіны яшчэ ганяў па пожні – да поўнага выратавання.
Другая незадоўга да мацерынай смерці здохла. Мучылася вельмі ад болю.
«Пакладзе мне галаву на плячо і стогне, бы чалавек», – маці казала. Як і першую, не ўдалося ўратаваць. Неўзабаве і маці памерла. Суседкі казалі – з-за каровы.

***

Дзядзька Стась, як і многія з нашых мясцін, пасля вайны па вярбоўцы ў заробкі на Данбас падаўся. Вярнуўся голы-босы, з букетам звычак, для тутэйшага люду нязвыклых. Адзінае, што прыдбаў, – мове расейскай збольшага навучыўся. Ужываў яе дарэчы і недарэчы, асабліва нападпітку. Працаваць адвыкшы, пакрысе красці пачаў. Неяк пеўня суседчынага

падпільнаваў, засек і знёс у Друю на кірмаш. Даведаўшыся пра тое, вяскоўцы пасмяяліся адно: «Ту, што зробіш – з рускага чалавек мовіць!»

***

Гора нібыта чалавека лепшым, мякчэйшым робіць.

У знаёмай, заўсёды сярдзітай настаўніцы сумнавядомы віцебскі душыцель Міхасевіч дачку васемнаццацігадовую забіў. Думалі ўсе, пераменіцца жанчына, стане больш абыходліваю з людзьмі.

Перамянілася – да горшага.

***

Фільм «Пеле-заваёўнік» – згустак болю і роспачы. І разам з тым – велічы духоўнай, трывушчасці гімн – пры зямлі-карміцельцы, пры статку, у цёпканні адвечным – пра нас нібыта. І побач з тым – эстэцтва нашае, з ходнікаў блішчастых чужынскіх на сярмяжныя гоні (іншых – не пазычыш) штучна перанесенае, з кубачкамі кавы на курорце модным – пыхі і пагарды недарэчны сімбіёз.

***

Здараецца, персанаж і бацькі адзінароднага, літаратара, можа стаць ахвяраю. Гора такое ў старога Карэніна, жонка здрадзіла, а пра яго – «пелестрадал»... Ды яшчэ і ягонымі вуснамі.

***

У Набокава ў апісанні Фільяты на адной толькі першай старонцы – каля дзесятка метафараў. Чытаеш – быццам паўз джунглі тых моўных знаходак прадзіраешся. Ці галерэю жывапісную аглядаеш – уваччу стракаціць. І нават калі пачынаеш злавацца, мудрагелістасцю стомлены, не пакідае ўражанне: МАСТАК!

***

Жанчыне аперацыю зрабілі на выдаленне злаякаснай пухліны. Мужык, даведаўшыся, што благое ў сужэнкі, кінуў з дзвюма дочкамі, пайшоў да іншай.

– Здаровай пашукаю, – сказаў на развітанне. – Мужчыны ў цане зараз.

Выкараскалася памалу кабета з хваробы, акрэйбала. Дачок павывучвала, пааддавала замуж.

А на яго – як гром сярод яснага дня – тая самая хвароба. Другі язык, неаперабельны, вырас у роце, неўзабаве і памёр з таго.

***

На радзіме Твардоўскага, у Загор'і, кабеты мясцовыя песню спяваюць падчас урачыстасці ў гонар земляка. Сцепануўся ажно: словы спрэс беларускія!

Праз колькі хвілін запрасілі да мікрафона. Пачаў чытаць па-беларуску – рогат такі ўзняўся, вусцішна зрабілася. Даслухаўшы ж – абступілі, пытаннямі закідалі. Зацікавіліся, і то дзякуй.

***

Гадоў дзесяць таму, атрымаўшы ў «ЛіМ»е ганарар, спакусіўся ля абменніка насупраць чыгуначнага вакзала купіць у двух малойцаў з рук дзесяць даляраў. Грошы мае ўзялі, а замест валюты пасведчанне торкнулі пад нос:

– Парушаеце правілы куплі-продажу, пройдзем у аддзяленне. – І ў падваротню цёмную цягнуць.

На шчасце маё – патрульных купка на вуліцы.

– Сюды! – крычу. – Памажыце!

Адзін уцёк, другога разам са мной прывялі ў пункт аховы правапарадку, што насупраць геафака універсітэта тады месціўся.

– Пакажыце ваша пасведчанне! – загадваюць «абменшчыку».

Выцягвае маладзец з кішэні паперыну, а ў ёй: «Дазваляецца канфіскаваць лішнія грошы ў занадта даверлівых грамадзян».

Гісторыя некароткі працяг мела, ды грошы вярнулі. З таго часу ніколі, нават калі пільная ёсць патрэба, у выпадковых людзей нічога не купляю.

***

З дзяцінства ўспамін.

У калгаснай агромністай шасе*, бярозкамі маладымі аздобленай, – кіно перад вечарынаю. Мы, малеча, па кутах на лавах месцімся, далей ад дарослых. На экране азіяты, усе пры зброі. Адзін, асабліва страшны, паўз поле паўзе з кінжалам у зубах. Азірнешся ды і пасунешся бліжэй да сярэдзіны будынка. А праз хвіліну глядзь: купка ўжо равеснікаў застрашаных кадрам побач з табою.

У свет вакно – вусцішнае…

* **Шаха – вялікая пуня без столі для захоўвання сена і іншых кармоў** (дыял.).

***

У школу за шэсць вёрст хадзілі. Выберашся з хаты а палове восьмай, а пятай вернешся. Паўз яры, лес, па бездаражы. Узімку – цалiком часта. Каторая з дзяўчат меншых ідзе-ідзе ды і ляжа на снег: «Усё, не пайду далей, няма сілы». Сумку возьмеш паднесці, тоўхнеш у каршэнь: «Трэба ісці!»

Таксама – чым не вакно?!

***

Х. Вікерс пра Сесіль Ротшыльд: яна не дазволіла перамагчы сябе свайму багаццю.

Багацце можа перамагчы чалавека, і пасада, і ўлада – што заўгодна. Здароўе ж грамадства прапарцыянальнае колькасці асобін, здольных ім супрацьстаяць.

***

Гаспадыня кватэрная, пенсіянерка з-пад Растова, вяртаецца з пошты і ажно заходзіцца смехам.

– Што здарылася, Панцялееўна? – пытаюся.

– Ой, не спрашивай! Такой случай смешной, уж такой-то смешной! Спрашивает кассирша, нет ли мелочи... «А вот, – говорю, – шешнадцать рублей». А она как захохочет. Минут пять гоготала. Я уж потом догадалась, что к чему. Шешнадцать рублей – разве деньги для нее? Вот и посмеялась с дуры бабы! Ха-ха-ха! Шешнадцать рублей!

***

Каменьчыкі на быстраку – зіхатлівыя, розных адценняў, ажно пырскаюць фарбамі. А выцягнеш з вады, і тут жа страцяць вабнасць: куды дзенуцца і стракатасць тая, і бляск. Так і з чалавекам іншым: пагутарыш хвіліну-другую, і дастаткова, каб расчаравацца.

***

У дзеда з бабаю завядзёнка была: па абедзе – сон паўтары-дзве гадзіны. І якая б пільная ні чакала праца, а і яна тае заўсёднае сіесты парушыць не магла. З часоў аднаасобніцтва, калі селянін адно сабе належаў, адмысловая звычка.

***

Праца, як і шмат што іншае, накшталт наркотыка можа стаць для чалавека.

У маленечкай вёсачцы на Браслаўшчыне на галасы нашы кабета з хаты выходзіць. Сунецца памалу: ногі пакрывелі, не хочуць слухаць гаспадыні.

– Як жывяце, бабуля? Не сумна адной? – пытаемся.

– Ай, скажаце! Карову трымаю, авечак, свіней – не дадуць засумаваць.

Застыдалася, калена з прыкарэлым гноем далонёю прыкрыла.

Восемдзесят тры старой.

***

Цыганка сярэдніх гадоў унаначкі напрасілася. Прыгожая, апранутая густоўна. Як ні ўгаворвалі легчы на канапе, – не згадзілася, уладкавалася на падлозе. І акурат маці туфлі новыя, напярэдадні купленыя, ва ўзгалоўі ў неспадзяванай начной госці аказаліся.

Маці ўстала ціхенька, прыбрала іх быццам незнарок.

– У мяне гэткага дабра, можа, дваццаць пар, – маладзіца засмяялася. І дадала ціха: – Бачыце, а на канапе яшчэ спаць прапаноўвалі.

– От трэба ж – так я нядобра зрабіла, – маці сябе назаўтра дакарала. – Ай, нядобра!

***

Да чалавека знаёмага ў людным месцы памкнуўся, каб загаварыць, глядзь зблізку: не ён зусім. Галаў павярнуў – дзіва: ён, знаёмы, шыбуе па ходніку на процілеглым баку вуліцы. І назаўтра, упобачкі з тым самым месцам, другое такое, толькі з іншым чалавекам, здарэнне.

***

Агаты Крысці творы – бы коўдра акраўкавая. Там агрэх, тут дзірка, там шво паўз стракатасць малюнка свіціцца. Але як стракатае, дык агульны ўзор і бездакорным выглядае.

***

Два тыдні зуб лячыў, скончылася ж тым, што ірваць загадалі. Папрасіў вырваны на памяць. Дома і сяк, і так яго круціў – не даў рады даўмецца, што да чаго. Дзірка паўз каронку на дзясну высвідравана, карыес – некрануты – зусім з іншага боку...

***

Ні сюды, ні туды ў сталым узросце без пачуцця самадастатковасці. Стрыжань жа яе – у адукацыі. Маладымі часта ігнаруем яе, не разумеючы, што ў пяцьдзесят гэтаксама хочацца жыць, як і ў дваццаць.

***

Хамства, як і куртатасць розуму, бывае трох кшталтаў: зацукранае, рафінаванае, патэнтаванае.

***

Бацька жартаваў: «Як памру – ад могілак яшчэ танчыць зачынайце». А смерці надта ж баяўся. Да такой ступені, што калі памёр стары Данат, у якога кватаравалі, парасчыняў спачатку ўсе дзверы, а потым, забыўшыся мяне, немаўля, у зыбцы, выбег з хаты.

Калі бацька сканаў, памыўшы і перааапрануўшы, з сястрою і шваграм па справах хаўтурных у розныя месцы выправіліся. У хаце пляменніца 15-гадовая засталася. «Не баялася?» – пытаемся вярнуўшыся. «Во яшчэ, – паціснула плячыма. – Ён жа не ў маім пакоі ляжыць».

***

У Адамчыка ў дзённіках пра слова «зачым» – як пра кальку з рускай мовы. А ў нашай мясцовасці яго ў значэнні «чаму» якраз самыя старыя людзі, што не зведалі русіфікацыі, ужываюць. А вось словаў «трэба» ці «бачыць» нідзе і блізка не пачуеш.

***

Адпаведнасць слова сэнсу прадмета ці яго прыкмеце ў нашай мове часам агаломшвае нават. У маім куточку між Лявонпалем і Друяй адзін з гатункаў бэзу пры пакоях спаконвеку юльёвым завецца. Аднаго разу палез у слоўнікі паглядзець, што за колер такі – нічога не знайшоў. Ды, можа, і да лепшага: хай застаецца так у памяці ды будучым дыялектолагам на ўцеху – ЮЛЬЁВЫ.

***

Руская паэтка падчас літспаткання ў абласной бібліятэцы:

– Как ваш язык точен! Это ж придумать такое: галіцца! Разве сравнишь с нашим: бриться! Фу! Или вот ещё: шлюб! Слюб – слюбиться. А то – брак!

Другая затое падчас гэткае ж імпрэзы: «Ну, не знаю, как там да что, а диалект ваш – российский».

***

З пярэдадня рэферэндуму 95-га года выпадак.

Студэнтка, дзяўчо зусім, у паўзе між заняткамі падыходзіць.

– Мы с родителями из России к вам переехали. Что вы будете делать с такими, как мы, если только белорусский останется государственным?

– Вучыць вас будзем.

Рэферэндум мінуўся, экзамен здалі. Зноў дзяўчо тое самае.

– А мы с родителями за ваш язык проголосовали.

– Чаму?

– А чтобы вас поддержать.

***

У вёсцы маёй на вяселле не запрашалі, а «прасілі». «Прасатыя» – бацькі са сватам, а лепш за ўсё, калі і самі маладыя, – доўга сядзелі з гаспадарамі ў лепшым пакоі, абмяркоўвалі, што і як будзе падчас урачыстасці. Крый Бог было сунуцца да каго з запрашэннем, хай сабе і за месяц да вяселля, у пятніцу. Большае знявагі і прыдумаць было для чалавека нельга. Бо дзень посны, ні выпіць табе, ні з'есці, ні пагаманіць толкам – от свята!

***

Раз-пораз гвалт наконт прозвішчаў на «о». Вось і прыдумаў сабе версію на суцяшэнне: можа, гэта форма клічная. Як косю, коню, хвалько ці манько ўрэшце. Імя нямецкае, прозвішча ўкраінскае – так і давядзецца ўжо да скону жывым увасабленнем манкурцтва заставацца.

***

Настаўнік чарчэння на ўрокі з Друі на матацыкле прыязджаў. Заўжды пры капелюшы, калашыны штаноў, каб не спэцкаць падчас язды, шпалерынай абгорнутыя. У клас увойдзе: «Сёння бо-олт будзем чарціць!» І языком круць ды верць у роце, бы сапраўды там той болт засеў і ніяк не даць рады яго выпхнуць. Угледзім з вакна на дарозе : «Болт! Болт едзець!» Так і прахадзіў у балтах, пакуль у іншую школу не перавялі.

***

Спрыхаду поля, на першым ад сцежкі слупе, – бусел ці то бусліха за дазорцу. Праз тры слупы – тры галавы дзяцінныя над гняздом тырчаць. Ледзьве наблізіўся да першага – крэкнуў дазорца, і ўвобміг, выконваючы каманду, зніклі галовы, пахаваліся. Метраў з трыста пракрочыўшы, азірнуўся: няма. А што, як загаду не было.

***

Па землятрусе на поўначы Афрыкі селянін з аддаленага ад сталіцы рэгіёна з тэлеэкрана на няўвагу ўладаў да гора людскога наракае: не прыехалі, не паглядзелі, не памаглі нічым.

Сваё згадалася. Сяляне памерлай амаль ужо вёсачкі – тры хаты – увесну пшаніцу ды ячмень, з восені непрыбраныя (камбайна калгас не выдзеліў) на пні паляць. А гэта – палова з шасцідзесяці сотак, паўгаспадаркі сялянскай – і ўсё на зглум, і быццам трэба так.

«Памогуць, а як жа, – вяскоўцы праз слёзы жартуюць, – як выбары пачнуцца».

***

Кабета журавінаў два кошыкі назбірала. «Як жа ўдалося табе? – суседка пытаецца. – Не час яшчэ, забаронена, ловяць на балотах». – «А ты да тых, што ловяць, далучыся, і будзеш з ягадамі», – адказала.

***

Падчас аўдыенцыі ды фатаграфавання з папам Рымскім у Клементынскай зале кожны бліжэй да пантыфіка імкнецца стаць: сказаць штосьці можна, дакрануцца. Ледзь аб'явілі пачатак аудыенцыі, як людзей нейкіх няведама адкуль наляцела, абкружылі папу, тыя ж, для каго прызначалася спатканне, у куце апынуліся.

***

З дзяцінства запомнілася.

Дзед: «Пазыку ж калі аддамо? Вунь калі ўзялі!»

Баба: «Вірутная праўда – надабя расчэрпацца!»

***

Светла, балгарка, узрушаная прымчалася з горада: «У сутарэнні касцёла Сан-Клементэ, што побач з Калізеем, магілка Кірылы ды Мятода, едзьце паглядзіце!» Паехаў. Па-балгарску надпісы братам-азбукарам на магіле, па-сербску, па-ўкраінску, па-расейску... Усе адзначыліся, апроч... вядома каго.

***

Ад 17 стагоддзя – усё «отток» у нас нацыянальнае эліты. То ва ўлонне польскай культуры ды мовы, то расейскай. Сёння зноў ён, «отток». У выданнях адно назвы беларускія, у калідорах рэдакцыйных, у тэатрах – спрэс расейшчына. Абставіны зменяцца – прыток будзе. Цыдуламі, як уцiскалі нас за часам «оттока», наводнім тыя ж выданні, пакутнікамі за беларушчыну паробімся. Тыя, што у «оттоку» зараз, – паперадзе ўсіх пад сцягам мовы як фундаментальнай каштоўнасці апынуцца.

***

Плоць нядужае з гадамі, дух – мізарнее. І асуджай тут Белікава за «футлярнае» жыццё. Глянеш іншы раз на свет і так захочацца хоць у які футарал схавацца.

***

Мова наша без мяккага знака да падоўжаных зычных – бы сардэчнік, на экстрасісталу хворы (удар – пропуск, удар – пропуск): насеньне, насенне, насене, на сене...

***

Бацькаў брат Ільдэфанс без малога праз трыццаць гадоў па ад'ездзе на сталае жыццё ў Польшчу прыехаў на радзіму адведаць крэўных. Нядзеля была, як заявіўся на роднае котлішча: у хаце нікога, дзверы на замку, у касцёле ўсе. Пайшоў да касцёла, там бабу, маці сваю, спаткаў. «Хадзем да бацькі, – сказала, выплакаўшыся. – Неспадзянка будзе старому».

Падышлі да дзеда.

– Глядзі хто! – кажа баба. – Ці пазнаеш?

– Быццам відзеўшы дзе-та, – дзед адказвае. – А так – не, не ведаю чалавека.

Праз колькі хвілін толькі, згадаўшы пра запрашэнне, што паўгода таму высылалі сыну дзеля афармлення візы, даўмеўся, хто перад ім, кінуўся абдымаць-цалаваць.

Адчужэнне між крэўнымі, хоць і змушанае, – прыкрае, няўцямнае, нялюдскае.

***

Дзядзька-хутаранец праз усё жыццё з бяднейшых суседзяў кпіў. Сам з басоты, але разжыўся за Саветамі на гандлі гарэлкаю і мёдам, адчуваў сябе ў наваколлі як не Богам. Калі і размаўляў з кім, дык заўжды звысака, не хаваючы пагарды. Заможны, дзецям, аднак, у адрозненне ад большасці вяскоўцаў, аніколі нічым не памог. Дык не надта і гарнуліся да бацькі сын і дачка, больш да маткі мелі прыхільнасць. Толькі калі ўжо зусім занямог дзядзька, палагаднеў крыху, пачаў хінуцца да людзей.

Неяк жнівеньскім надвячоркам я з грыбоў вяртаўся паўз ягоны хутар. Выскачыў ён з хаты, замітусіўся: «Прынясі сваю цацку, распавесці сёе-тое хачу». Прыходжу праз паўгадзіны з дыктафонам, пачынае свой расповед. Як у часе вайны мабілізавалі яго ў войска, як, трапіўшы ў акружэнне, у балоце нейкім сядзелі, як выходзілі з таго акружэння. І спехам усё, хуткагаворкаю, быццам баючыся не паспець выспавядацца. Дыханне цяжкое, з прысвістам, твар азызлы. Кятурку расшпіліў, не даўшы рады падалей ад прызбы адысціся, лужыну побач з услонам, дзе сядзелі, зрабіў. «Страшна паміраць, – дадаў, скончыўшы аповед. – Можа, напішаш што ў газэціну? Хоць што і па мне застанецца...». Праз пару месяцаў сканаў. Пахавалі, як пустэльніка, побач з чужымі. Сына к таму часу ўжо не было ў жывых. Як памёр, не пажадаў бацька, хоць і меў мажлівасць, перавезці з горада на вясковыя клады. Жонка неўзабаве да дачкі давякоўваць з'ехала, так і застанецца і па смерці самотны, пры не сваіх.

***

З завучаства школьнага.

Абрыдла цягацца да настаўнікаў на ўрокі, кінуў хадзіць. Хвалілі: «Во завуч у нас – золата!». А ледзь да канфлікту, яйка выедзенага нявартага, дайшло, тут жа папікнулі: «А на ўрокі да нас, памятаеш, не хадзіў?».

***

Гадоў сем меў, як з хлапчуком суседскім, Рысікам, ля яблыні ў былым панскім садзе пры пакоях бавіліся. Збанок пры ім быў гліняны, размаляваны ў розныя колеры, прыгожы, як калядная цацка. Узлаваўся я нечага, пхнуў пасудзіну нагою – паляцела, раструшчылася на дробныя аскепкі. Твар задрыжэў Рысікаў, слёзы градам з вачэй. Праз месяц з'ехаў ён разам з бацькамі ў Польшчу, болей не бачыліся.

Колькі гадоў таму здымак суседка паказала: «А гэтага памятаеш хлапца?» – «Не» – «Няго? То ж Рысік. Памёр ужо...».

Ні твару не згадаў, ні паставы, толькі – вочы тыя, бездапаможным адчаем заслёзненыя.

***

Пазнаёмішся з чалавекам – і падрасцеш нібыта: дасведчаны, разумны, а галоўнае – па-беларуску размаўляе. А ён (яна) праз тыдзень па знаёмстве: «Вось, пішу таксама, ды ці не зірнеце?» Расчараванне.

***

Калега-«ўсходнік» пра ўражанні ад камандзіроўкі на радзіму маю, Мёршчыну, апавядае: «Я ж думаў, там багацеі ў вас паўсюль, а як глянуў… Анічым не лепш, як на маёй «малой» радзіме». Дык на яго «малой» рэзрух хоць на вайну можна спісаць: спалена ўсё было, насельніцтва па колькасці дасюль у асобных раёнах да даваеннага ўзроўню не дацягвае. А маёй паўстагоддзя савецкай улады хапіла, каб у пустэльню ператварыцца.

***

Напрыканцы мінулага стагоддзя ў школах пра міжпрадметныя сувязі модна было дбаць. І карысць нейкая была з таго, хоць як ды маглі ў адно звесці дзеці факты з гісторыі, геаграфіі, літаратуры. Зараз прыйдзеш у аўдыторыю да ўчарашніх выпускнікоў, дасі тэкст з пералікам некалькіх вядомых пісьменнікаў, і добра, калі пяцёра з пяцідзесяці, да прыкладу, Быкава, Барадуліна, Броўку за землякоў вызнаюць ды яшчэ раён, з якога класікі паходзяць, назавуць. І не няздары якія, не абібокі – талковыя маладыя людзі.

***

Дэмакратаў-русафілаў і сённяшні беларускі ўрад адно – галоўнае – родніць: непрыманне нацыянальнае ідэі як фундаментальнае каштоўнасці. Журналісты-незалежнікі рускамоўныя на ціск з боку ўладаў наракаюць. Але ці такія прынцыповыя між аднымі і другімі разыходжанні? Урадовец заўтра першы бізнесам займецца, і будуць цяперашнія «прыгнечаныя» ягоныя ж інтарэсы – у новай іпастасі толькі – абслугоўваць. І супраць ворага аднаго, усё таго ж беларуса-нацыяналіста, увобміг згарбузуюцца.

***

Студэнтка-вяскоўка падышла – з заняткаў адпрасіцца па нейкай патрэбе. Маленькая, ад сілы метра паўтара росту, нясмелая, апранутая не ахці ў што. Адпусціў, пайшла калідорам, з-пад плашча ледзь бачная. На дварэ – дзецюкоў плойма, нахабных, паўцвярозых: зарагаталі, зацмокалі, заіржалі. У яе ж – ні сілы, ні рызыкі, ні Д'Артаньяна плячыстага ўпобачкі, каб бараніць. Другая, гэткая ж нягегліца, траяк на экзамене атрымаўшы, – у слёзы. Бацька вынес усё з кватэры на гарэлку, рабіць даводзіцца на рынку, парашкамі пральнымі гандляваць, ці да вучобы тут.

***

Аднаму – той, чужы, за куміра, другому – гэты, уласнае гадоўлі, трэцяму – гэны, першых двух ці то вораг, ці то таварыш – ад варункаў часовых залежыць. Які б і скуль ні быў – абы хоць каго мець за ідала. Культу асобы пазбавіўшыся нібыта, культ улады на ўсялякі выпадак пры сабе пакінулі. Ад аднаго ж да другога – паўкроку.

***

Чалавек дагары пры ходніку: рукі-ногі ўроскід, вочы заплюшчаныя. На бадзяжку ці п'янага не выдае: адзенне чыстае, ні гузака нідзе, ні кроплі крыві. У далоньцы правай пашпарт, бы знарок, каб не шукалі, як памрэ неспадзеўна, вокладкаю сінее. Мінакі пазіраюць скоса, ратуючыся ад дажджу, што з самае

раніцы церусіць, хаваюцца пад парасоны, шыбуюць безуважнаю чарадою далей па сваіх справах.

***

Пашпарт падняў, кімсьці згублены, – чорны ажно ад бруду, зашмулены. Між старонак – квіток на пятнаццаць тысяч і грошы, толькі не пятнаццаць, як у квітку, а дзесяць з драбязою. Праз даведку нумар тэлефона ўладальніка высветліў, набраў. Жанчына, ці не жонка, слухаўку ўзяла, сказала, што гэтае хвіліны не можа прыйсці па дакумент, а патэлефануе, як толькі вызваліцца, і тады спаткаемся. Спаткаліся праз пару гадзін, аддаў знаходку. А назаўтра зранку – званок. Голас мужчынскі: «Ну, што, гад, пабагацеў, пятак мой прысабечыўшы?» І ўвечары – зноў тое самае. Нарабіў клопату: яму – тэлефанаваць, лухту вярзці, сабе – тую лухту слухаць.

***

Што справа, што злева краявіды апенінскія – воч не адвесці. Сядзіш ля вакна ў аўтобусе і толькі паспяваеш ахаць, бояззю прапусціць нешта, крый Бог, наэлектрызаваны. Моладзь з Амерыкі побач – са смешкамі, валтузнёй – і дзесятае часткі таго ўсяго не бачыць і бачыць не жадае. І не дзіва: у семнаццаць-дваццаць усю Еўропу з поўначы на поўдзень, да Італіі дабіраючыся, скалясілі, а колькі яшчэ скалясяць на зваротным шляху. І ўсё ядуць, ядуць…

***

У аматарскім клубе літаратурным. Адзін болю скалiёзнага, вершы пачаўшы пісаць, нібыта пазбавіўся, другога нястраўнасць перастала даймаць, трэці супакою душэўнага дамогся, спіць зараз, як пшаніцу прадаўшы, а то ж месца не знаходзіў па начах. Класікі тапіліся-засільваліся пры літаратуры, а тут яна – натуральная лякарня, ад хваробаў усіх панацэя. Шчаслівыя людзі.

***

І ўсё-ткі, калі пра мову нашу (у сэнсе – хто вінаваты), гэткая формула павінна быць: я і… Не ён (яна, яны), а так менавіта, з сябе пачынаючы. Усе іншыя – ад жадання ці то высілкаў залішніх, ці то адказнасці, ці то таго і другога адначасна ўнікнуць. З сябе кожнаму трэба пачынаць, іншага не прадугледжана нам, беларусам, нябеснаю канцылярыяй.

***

Літаратар малады тэлефануе: кніжачку выдаў, а – не заўважылі, не ацанілі, не адгукнуліся. Мабыць, не даспеў яшчэ, каб уцяміць: літаратура – з тых сфераў, дзе ніхто нікога не чакае. Як і ў настаўніцтве, дзе не вучань існуе дзеля настаўніка, а настаўнік дзеля вучня. Ці ў журналістыцы, дзе – не чытач дзеля журналіста, а наадварот. Ці ў медыцыне, дзе – не пацыент дзеля лекара, а лекар дзеля пацыента. Ці ў тэатры, дзе – не глядач дзеля актора, а актор дзеля гледача. Прыйшоў няпрошаны – вучыся пачувацца адпаведным чынам і не наракай ні на што.

***

Свякрова з нявесткаю сварыцца, ціск сабе ўздымае, конча перамагчы маладую імкнучыся. Чым скончыцца – вядомая справа. Пустое – супернічаць з маладымі: як ні намагайся, апошняе слова за імі застанецца. Нават калі і часовым пераможнае слова будзе – усцехі мала, бо ты ўжо ўсё адно пра тое ведаць не будзеш.

***

Кланы ў жыцці, кланы ў літаратуры. Паводле інтарэсаў, найпершы з якіх – любых сябе прысутнасць «тутацькі», як мовяць на Талачыншчыне, высілкамі супольна-кагальнымі ў гісторыі засведчыць. Іншую кніжку гартаеш калектыўную – быццам тайнапіс расшыфроўваеш: хто каму што, хто каму чым, хто каму дзе... Здаецца, і ў савецкія часы гэткага менш было. Кланы-шайкі, шайкі-лейкі, повяззю крэўнаю ды іншаю змацаваныя. У бізнесе, ва ўладзе, на кафедрах універсітэцкіх – спрэс тое самае. Краіна затое – самая «некарумпаваная».

***

Дзеці суседзяў – Віта, Тарэса, Болісь, – як і ўсе з наваколля, у суседнюю Латвію, у Краславу па лепшую долю падаліся. Праз месяц бацькоў папрыязджалі адведаць – і не пазнаць ніводнага: Вія, Тая, Барыс. Не прыжыліся, аднак, у вёсцы новыя імёны, дык надта тым засмучаліся.

***

У адным з ліцэяў з Вольгаю Іпатавай. Пра што ні гаворка – на ўсё водгук у маладых гатовы. Айчынная літаратура, японская паэтычная традыцыя – нішто не навіна для іх, усё ведаюць, усім цікавяцца. Настаўніцы, мілыя жанчыны, адно пасміхаюцца задаволена. Колькі працы за тою задаволенасцю – адным ім вядома.

У інстытуце падвышэння кваліфікацыі затое, як ні біўся, так і не здолеў дагрукацца да вучыцельскіх сэрцаў. Абыякавыя твары, апатычныя пагляды. З сарака мова- ды літаратуразнаўцаў добра калі трое-чацвёра больш-менш у курсе сучаснага літпрацэсу.

***

Адна мітрэнга – акуляры. Сто разоў на дні ўсчэпліваеш на нос, гэтулькі ж – шукаеш, счапіўшы ды забыўшыся, дзе паклаў. У падземцы парыжскай хапіўся: няма. Літары ж драбнюсенькія на мапе-даведніку, нізавошта не дасі рады без акуляраў прачытаць. Добра, лініі маршрутаў рознымі колерамі пазначаныя, сяк-так з’арыетаваўся.

***

Пытанне – з заўсёдных, сакрамэнтальных – падчас літсустрэчы: што з моваю будзе?

Як самі зробім, так і будзе. У сярэдзіне 19 стагоддзя Плятарыха з Краславы ці то з Дзвінска да Марксіхі ў Віцебск плёнам вышукаў моўна-этнаграфічных прыязджала, спаміж іншага, дзяліцца. Самахоць, ніхто не змушаў. І на зглум усё тое?

***

Скрозь антаганізмы ў свеце: заможная поўнач – нішчымны поўдзень, дэмакратычны захад – аўтарытарны ўсход. У нас – падзел, што ці не ад 17 стагоддзя, калі іншаземцы, палякі ды габрэі, пазней – расейцы, гарады да рук пачалі прыбіраць, доўжыцца: вёска – горад. І там, і там сёння – паўжабрацтва, адзінае, што раздзяляе – ступень наяўнасці элементарных выгодаў. Ацяпленне, балеі з цёплай вадою, каб памыцца, транспарту. Не парупіліся у свой час, калі нешта яшчэ можна было зрабіць, пра вёску, вось і помсціць зараз, адэптамі мыслення рэтраграднага, што па выгоды тыя мкнуцца, хрушчоўкі ды шматпавярхоўкі гарадскія насяляючы. За ўбогія даброты таксама трэба плаціць.

***

Падчас практыкі ў Шаркаўшчынскім раёне студэнтаў у суседні Глыбоцкі, у славуты Мосар на экскурсію вырашыў звазіць. Прычасціліся рукатворным цудам, падзівіліся, пазахапляліся. Дадому вярталіся, і ў вакно не хацелася глядзець: хаты шэрыя, ніякія, беднасць – быццам з сярэднявечча карцінка на тле таго хараства мосарскага.

***

Іншамарка пад вокнамі ў двары месяцы з два не давала заснуць: ледзь сцямнее – і зачынае сігналіць. Улетку, пасярод дня – званок у дзверы, міліцыянт на парозе. Так і так, аўто паўгадзіны таму скралі, ці не бачылі што-небудзь. «Ці не тое, што сігналіла па начах? – міжволі вырвалася. – Дзякуй жа Богу!

Пазней даведаўся: акурат тое самае.

***

Па культуры нарада. Пра бібліятэкі, гурты самадзейныя, добраўпарадкаванне вуліц гамонка: як палепшыць, удасканаліць, пачысціць. Пра ўсёдазволенасць побытавую – ані слова. Не дзіўна: зачэпіш тэму – выпраўляць трэба становішча, захады непапулярныя рабіць. А гэтак і да страты электарату недалёка. Ужо чаго-чаго, а дысцыпліны элементарнае ды выхавання павагі да сабе падобнага, а не да сябе любага наш люд не сцерпіць.

***

На лаціне vanitus vanitatum – усё марна. На нашай ваніты – тое, што праз апрыкласць выходзіць з вантробаў, непатрэбнае, невыноснае ім. На лаціне тое, што несумысля, – volens nolens, на нашай – міжволі. Суцэльныя сугуччы.

***

Чэхаў і ў творчасці – лекар. Лечыць адлюстраваннем банальнага, ад праекцыі якога на сваё жыццё да высновы, што ўсё марна, – адзін крок. Што б ні здарылася, што б ні збіла з тропу, самы дзейсны лек для мяне – яго аповеды. Адзіны аўтар, які ніколі не надакучвае. Не павучае, не вучыць нават – проста супакойвае ды ставіць усё на належнае месца.

***

І адзін спіўся, і другі, і трэці, а ў маладосці гэткія, здаецца, былі ўсе трое цвярэзнікі, ворагі змея. Тут жа, наадварот, – хоць бы каліва цёнгу да алкаголю. Іншы раз і ведаеш: вось бы і някепска было – зняць стрэс, проста падлагодзіць сябе самога, настрой узняць, Ажно не – не ідзе, хоць ты прасі каго, каб уліў сіллю. Во каб у маладосці гэтак. Не: усяму свой час.

***

Так чалавек шчыраваў, калегу ягамоснага сустракаючы, што нават шапку новую, хоць той і мужчына, купіў дзеля гэткае нагоды. А раптам і ацэніць госць шчыраванне, раздобрыцца, пару вершыкаў цісне, і можа без чаргі нават, у сваім часопісе. Недарэмна мітусіўся: праўда, ціснуў-такі.

***

У фільме расейскага тэлеканала пра бандэраўцаў неўзабаве пасля «аранжавых» падзей на Украіне сярод злавесных кадраў распраў падчас другой сусветнай – раптам здымак мінскіх вісельнікаў. Здымкі з пярэдадня вайны і ваенныя – абы-як, уперамешку ды яшчэ і адны і тыя дзе-нідзе. У паўзах – адстаўнік-энкавэдэшнік з засланцаў дурнымі показкамі частуе. Чужое не баліць.

***

У маладосці і разумнейшым, чым ёсць насамрэч, і прыгажэйшым, і лепшым карціць выглядаць. У сталасці – і блізка не казыча гэткая хэнць, наадварот, хочацца, каб людзі бачылі такім, як пачуваешся, – натуральным. Досведу з каптуром, дык і без прыўкрасаў, каб дурнем не выдавацць, за кошт яго можна абысціся.

## ГОРАД-ПРЫВІД

## З КАМЕНЮ І ПОПЕЛУ

Трапіць у Італію і не ўбачыць Пампеяў – тое самае, што не спаткацца ў вечным горадзе з папам Рымскім. Ні першае, ні другое нашай прытомленай лекцыямі групе, на шчасце, не пагражала. Больш за тое, так сталася, што з ласкі нашых апекуноў абедзве падзеі мелі адбыцца ў адзін дзень, з невялікім перапынкам. Ажно занадта, ды хто зазірае ў зубы доранаму каню?

Гэтая досвітная хвіліна пачатку вандроўкі да нязведанага! Яшчэ драбнаваты вясковы спадкаемца насельнікаў колішняй імперыі ледзь даў рады раскласці свой адмысловы сялянскі тавар у намёце збоч уваходу на тэрыторыю нашага часовага жытла, і магнолія пры вокнах страўні не паспела як след атрэсці кроплі ранішняе імжы, як мы, абцяжараныя пакункамі «сухога» харчу ды тэчкамі з «горшым» (пампейская лава занадта ўедлівая, папярэдзіў гід) абуткам, паспяхова ўнікнуўшы агромністых шышак паўднёвае хвоі, што раз-пораз падаюць з дрэваў на пляц, вырушаем аўтобусам у няблізкі шлях.

Італьянская дарога – момант спраўджвання ісцінаў з падручніка даўняе гісторыі.

Белавата-шэрым прывідам эпохі брутальнае распусты вымкнецца з хмызу пры шашы і схаваецца зноў у яго чэпкіх абдоймах выкінуты наўздагон нядобрай памяці ўзлаванымі месцічамі за межы горада саркафаг Нерона.

Пляцоўка з шыхтамі элеганцкіх падробак – скульптурных выяваў рымлянаў часоў росквіту антыкі – мільгне прад вачмі і асядзе глыбока ў глуздах пацвярджэннем растыражаванага з лёгкае рукі спадара Раселіні міфу аб адкрытасці вечнага горада.

Апіеў бальшак, па якім увайшоў у Рым апостал Пётр, – узрушыць і пакіне ў разгубленасці ад здагадкі, што усё гэтак блізка, амаль побач, у суседстве.

Утульныя, больш падобныя да казачных гарадкі ды мястэчкі выплывуць насустрач аўтобусу з просіні надгор'я і растаюць па-за часам, ускалыхнуўшы душу вярэдліва-пакутлівым пачуццём (даруй, Божа!) зайздрасці.

Чысцюткія штучныя ставы ды басейны, падманлівае ўвасабленне экалагічнага раю, пацешаць вока хвіліну-другую і, нібыта не жадаючы браць удзел у бессаромным ашуканстве, саступяць месца за вакном брудна-жоўтым стужкам рэчак і раўчукоў.

Адметная рыса ранішняга апенінскага відарысу – бязлюддзе на тле ўпарадкаваных, неверагодна акуратных (і калі паспяваюць людзі ўрабляць?) палеткаў.

Чародка козаў пасярод неапалітанскага краявіду – яскравы напамін, адкуль яно ўсё.

Завеса марыва над затокаю, такога густога, што, колькі ні ўзірайся, так і не ўгледзіш услаўленага безліччу пёраў ды пэндзляў зваблівага аквамарыну.

Бясконцы, як размовы беларусаў пра лёс роднае мовы, Геркуланум з выглядам на Везувій – сімвал заўсёднае рызыкі і наканаванасці.

Урэшце яны, Пампеі, горад-прывід з каменю, лавы і сонца, горад-напамін, што ўсё на свеце – апошні раз.

Шлях ад Марское брамы да ўскраіннай забудовы Пампеяў – прагулянка ў вечнасць працягласцю ў тры-чатыры гадзіны. Вадаправодчык-вынаходнік, архітэктар, пекар ці проста аматар карцінак фрывольнага зместу – кожны знойдзе сярод руінаў сваё, тое, што абраў за прыярытэт на шляху ў вечнасць.

У Пампеях вечнасць, між іншым, – рэч цалкам датыкальная. Мазаікі і фрэскі, узрост якіх сягае пад амаль два дзесяткі стагоддзяў, мармуровыя балеі, што помняць цяпло сцегнікоў і спінаў старажытных аматараў камфортнага купання, белыя каменьчыкі ў бруку, што свяцілі па начах не аднаму пакаленню палкіх мясцовых донжуанаў падчас шпацыру да ложка каханкі, малюнкі з выявамі сабак перад уваходам у жытло, ахайна абчасаныя плескачы пасярод вулкі – праезд забаронены! – усё можна пакратаць, памацаць, агледзець з усіх бакоў.

І – лава, лава, лава… Яе так шмат усюды, што яна яшчэ доўга па вандроўцы будзе нагадваць пра сябе шараватым налётам на чаравіках. Попел, пасланы Богам (існуе і такая версія) жыхарам дваццацітысячнага горада дзеля пакарання за легкадумнасць і парушэнне Яго запаветаў.

Трынаццаць злепкаў целаў патрыцыяў і іх рабоў, атрыманых у выніку маніпуляцый рэстаўратараў з гіпсам і пустотамі, што ўтварыліся з цягам часу ў лаве на месцы тых целаў праз стагоддзі пасля таго, як яна накрыла Пампеі, – дакладная ілюстрацыя катастрофы лета 79 г. н. э. і адначасна – напамін аб хуткаплыннасці жыцця і нікчэмнасці таго, што мянуецца грамадскім ці якім іншым статусам чалавека.

Пампеі – мудры дарадца, што дапамагае кожнаму, хто меў шчасце дакрануцца да яго жудаснай мінуўшчыны, хоць на нейкае імгненне пазбыцца ўсяго таго дробязнага і неістотнага, што перашкаджае жыць.

Пампеі – узрушаюць і – узвышаюць. Гнятуць і разам з тым – ачышчаюць, высвечваючы сапраўдны, а не ўяўны кошт слова, рэчы, учынка.

Пампеі – узор паважлівага стаўлення люду паспалітага і яго правадыроў да ўласнае этна-культурнае спадчыны. Схаваны ад вока чалавечага цягам больш як паўтары тысячы гадоў пад покрывам смерці тоўшчаю пяць-шэсць метраў, рэстаўраваны, наколькі гэта было магчыма, горад стаўся не толькі ілюстрацыяй прыроднага катаклізму (каго сёння ім здзівіш?), але і сведчаннем памкнення народа да захавання сваёй гістарычнай памяці.

Зрэшты, Пампеі – гэта не толькі руіны старажытных муроў. Ледзь пакінуўшы царства смерці, акурат трапіш у горад сучасны, што раскінуўся побач, – ажыўлены, шматлюдны, заняты сваімі штодзённымі клопатамі, адзін з адметных цэнтраў рэлігійнага жыцця Італіі.

Як Рым – горад вечны, так Пампеі – горад вольны. Вольны перадусім праз наяўнасць невымернае трагедыі – чынніка самадастатковасці, праз адсутнасць неабходнасці дбання аб дні заўтрашнім – складніка волі найвышэйшай, даступнай адно жабракам ды бадзяжным паэтам.

Горад-абярэг, што, вандруючы ў аднойчы прыручаным часе, засмучаны тваім духоўным занядбаннем і празмернаю прыхільнасцю да зямных спакусаў, не-не ды і сыпне ў вочы дзеля напаміну пра існае жменю ўедлівага везувійскага попелу.

# КУДЫ ВЯДУЦЬ УСЕ ДАРОГІ

Дзень у Рыме – спрынтэрская дыстанцыя даўжынёю ў музейную ходку, духоўны стыпль-чэз з навязліваю асцярогаю кудысьці не паспець, штосьці не ўгледзець, да нечага не датыкнуцца. Вандроўка з відарысам паўз паранджу стэрэатыпаў, што, як ні намагайся, – не жадаюць саступіць яве ў растузаных усё новымі і новымі ўражаннямі глуздах. Каларытны нацюрморт з дэкорам з ватыканскіх стансаў, копій скульптурных выяваў, золата базілік, – усяго, што, безумоўна, ускалыхне душу, але сярэдначы, стомленаму гарачынёй і мільгаценнем увачччу, – наўрад ці сасніцца.

Нават з-пад купала сабора святога Пятра, з больш як статрыццаціметровае вышыні, – Рым так сабе, без дай прычыны не адкрыецца. Грудаю ружаватых муроў Форуму ды няяснымі абрысамі тэрмаў Каракалы ці Калізея пацешыць вока хвіліну-другую і замкнецца зноў у сабе, унурыўшыся ў покрыва са смугі і старых, як свет, як наросты цвілі на могутных калонах-дазорцах, што абкружаюць плошчу пры саборы, міфаў. Міфаў, сюжэты якіх дарэмна ты будзеш імкнуцца ажывіць у памяці з дапамогаю выпадковага суразмоўцы: міфы ў праніцаным імі дарэшты месцы – не самая ўдзячная тэма для размовы.

Рым, вечны горад, калыска вечнасці.

Горад-міф, дзе ўсё, што ні сталася вартым увагі наступнікаў, – даніна павагі хрысціянскай традыцыі і толькі потым ужо – жыццяпіс эпохі і шляху асобнага, хай сабе і найвыбітнага, чалавека. Дзе і магіла знакамітага творцы пад нагамі – частка яго, міфу, а для некага тым часам – і нагода датыкнуцца да вечнага, а то і, глядзіш, – чаго не здараецца на свеце! – здабыць шчаслівы квіток да ўдзелу ў ім.

Горад-прынада – для прагных да славы, што не ведаюць супакою ў вярэдлівым памкненні пакінуць хоць што па сабе, хоць якою зарубкаю, хоць шнарам на носе П'еты адзначыцца на скрыжалях кароткай людской памяці.

Горад-мроя – для тых, хто з усіх ведамых чалавечай істоце фобій ды страхаў найперш падуладны двум – фобіі небыцця, страху смерці.

Горад-старэча, чый узрост нястомна падкрэсліваюць старажытныя надпісы на не менш старажытных арках – сведчанні веліччы ды славалюбства служкаў люду і веры, узор эгаістычнай дальнабачнасці для валадароў усіх часоў і народаў.

Горад-музей тысячы і адной патрэбных і не надта, выкшталцоных і не вельмі рэчаў.

Эльдарада для кішэннае справы адмыслоўцаў, злодзеяў дробнага і рознага іншага фармату.

Сімбіёз годнасці паставы месцічаў з жулікаватасцю жэстаў, пампезнасць Алтара Радзімы з красамоўнай сціпласцю Мамерцінскай вязніцы.

Увасабленне дыхтоўнасці апраткі сучаснікаў у адвечным жаданні калі не ўзняцца вышэй за продкаў, дык хоць – стаць тоеснымі, адпавядаць узроўню зрэбнага куцюру апошніх.

Фірмовы знак плебейскай сутнасці неарэалізму, выпхнутага эстэтамі ў купку люду ля дармовага латка пры краме гандляра-філантропа.

Злагодны перазоў дзённага пурытанства, узмоцненага блізкасцю дома Бога, і бессаромнасці прыцемку паблізу знакамітага на ўвесь свет фантана-суцеҥёра.

Прастора Рыма – квадратура над- і падзямелля, перапляценне вуліц і катакомбаў, двуадзінства аджылага і жывога. Дрэва-аўтахтон з каранём-рэліктам, сімвал адвечнае перавагі зместу над формай.

Рух на вуліцах Рыма – барометр тэмпераменту, не сапсаванага празмерным дбаннем нашчадкаў імперыі пра імідж сённяшні.

Голас Рыма – нізкі шэпт пажылой (не без слядоў колішняй прыгажосці, вядома!!!) гараджанкі, крыху сіпаты, крыху грубы – водгулле велічы прамінулай, цяжар клопату заўтрашняга.

Такі ён, дзень у горадзе, куды вядуць усе дарогі і толькі адна, незалежна ад размяшчэння зорак на небе, – заўсёды з.

## АСІЗІ, СІМВАЛ ДУХУ

З рэчаў, што засталіся ў спусцелай дзедавай хаце па ягоным зыходзе з жыцця, – а было там нямала і цікавых, і нават нечаканых – чамусьці найбольш заманулася ўзяць адну – асобнік выдадзенага ў 1934 годзе варшаўскімі капуцынамі Катахізму трэцяга закону святога Францішка з Асізі. Ці то любы майму воку балацяны калёр вокладкі рарытэту паланіў, ці то інтуіцыя што падказала, але кніжачка тая пры ўсёй маёй непрыхільнасьці да рознага кшталту старызны назаўжды прапісалася ў асабістым архіве. Шляхі ж Боскія нявызнаныя: крыху больш за дзесяць гадоў прамінула з таго часу, і вось я на радзіме святога, у месце, дзе, паводле Рэпіна, далячынь «з тэрасы… падасца морам». Неспадзянка тым больш прыемная, што яшчэ і ў дзень ад’езду на Апеніны пра вандроўку ў Асізі анічога не было вядома.

Што праўда, вандровак з Рыма ў італьянскую правінцыю у той не надта каб спякотлівы для тамтэйшых шыротаў чэрвень не бракавала. Але асізкая, насуперак неадэкватным для такое значнае, прынамсі для мяне, падзеі паводзінам у аўтобусе спешчанай дарункамі лёсу амерыканскае моладзі, з якою собіла патрапіць у адну групу, сталася ці не самаю запамінальнаю.

Цяпер, калі б ізноў выпала такая мажлівасць, я б, пэўна, нават метры таго эскалатара, што падняў ад падножжа гары да перашае асізкае пляцоўкі, палічыў, тады ж… Тады, на тле ледзь не штотыднёвых наведзінаў то Арвіета, то Пампеяў, то Монтэ-Касіна ўсё падалося наўздзіў будзённым, шараговым. Да гэткае ступені шараговым, што я нават, маючы ў кішэні на дробныя выдаткі сякія-такія грошы, не палічыў патрэбным набыць дзеля памяткі копію ўкрыжавання, з якога Хрыстос прамовіў да святога Францішка ў Сан-Даміяне. Пра што дасюль шкадую, уяўляючы зрэдзьчасу, як файна выглядала б яно на дыванку над ложкам пры запаленых свечках у які-небудзь святочны, прыкладам Калядны ці Велікодны, вечар.

З тэрасы пры Ніжнім касцёле асізкія ваколіцы, сапраўды, нагадваюць мора. Два моры: упобачкі, за спінаю – людское, вірлівае і гаманкое, што час ад часу радзее коштам аматараў паласавацца марозівам у ціхім утульным бары збоч вулкі; унізе, дакуль сягае вока, – прыроднае сіняе, спярэшчанае плямамі ізумруднага, сатканае з сакавітых красак Умбрыі. Гэткае ж амаль, без канца і краю, толькі зусім бязлюднае, пашчасціла пабачыць пасля яшчэ аднойчы – улетку з гары пад назовам Маяк на Браслаўшчыне, куды неспадзявана трапілі разам з Сяргеем Панізнікам і Вольгаю Іпатавай пасля літаратурнае імпрэзы.

Дзе б ні ступіў у Асізі, усюды наткнешся на напамін, што тут – калыска слыннага святога. Местачковага бэйбуса ды забаўніка, затым – ваяра падчас вайны з Перуджаю, яшчэ пазней – заснавальніка манаскага ордэна, асобы, якой лёсам было наканавана стаць апекуном усяе каталіцкае Італіі. Улюбёнага персанажа Джота, што падоўгу жыў у Асізі і пакінуў пасля сябе ў Верхнім касцёле, менаваным у гонар Францішка, адмысловую галерэю сюжэтаў з ягонага жыцця. Зараз, мабыць, ужо адноўленых пасля згубы падчас не так даўняга землятрусу: італьянцы, у адрозненне ад нас, беларусаў, кошт помнікаў сваёй мінуўшчыны ведаюць добра.

Базіліка святога Францішка, збудаваная, між іншым, у гістарычна найсмутнейшым кутку горада – на ўзгорку, дзе ў даўніну выконваліся

смяротныя прысуды і дзе завяшчаў пахаваць сябе Францішак, – з тых месцаў, што неяк вокамгненна поўняць цябе святлом. Святлом, што не пакідае і праз гады, успыхваючы няўзнак у памяці, вяртае да таго існага, чым ёсць вера і яе пастулаты ў шырокім, агульначалавечым сэнсе. Святлом, што і само, па вышэйшым рахунку, ёсць тое існае.

Другая выбітная асоба, якая ў немалой ступені прычынілася да пратварэння правінцыйнага Асізі ў цэнтр хрысціянства сусветнае вартасці і праз тое назаўжды засталася ў аналах яго гісторыі, – паплечніца святога Францішка Клара. Паслядоўніц яе, сёстраў-кларысак, можна пабачыць у касцёле па-за кратамі падчас збору ахвяраванняў. Пабачыць – умоўна: кларыскі не адкрыюць твару, нават і рук староннняму чалавеку ні пры якой нагодзе. Таемнасць побыту звычайных учора яшчэ жанчын, ад усведамлення трагедыйнасці якога да высновы, што і горай табе, чалавеча, магло стацца, а ці мо' і станецца яшчэ, як у гэтую во сённяшнюю скрушлівую хвіліну, – адзін крок.

Асізі – аазіс для душы.

Асізі – філасофія, для таго, вядома, для каго пошук адвечных ісцінаў не пусты гук. Яшчэ ж – дарунак лёсу, што пасылаецца Богам-айцом ці то дзеля ўзнагароды за дабрадзейства, ці то дзеля скіравання да выкуплення граху.

Асізі – з тых мясцінаў, якія хутчэй узновіш у памяці агулам, чым узгадаеш драбніцамі. І ўжо аніяк не горад, з якога – «усё злое».

Каляды. На падстаўцы пры пустым дыванку палае свечка, жагнае
зырклівым агнём вольнае месца,
што чакае запаветнае выявы Збаўцы, замоўленай сябру,
які выпраўляецца днямі – шацунчык! – у вандроўку да тае самае тэрасы,
адкуль далячынь нагадвае мора.